Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 24 ліпеня 1987 г. № 30 (3388) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

ЛЮДЗІ РОДНАГА КРАЮ

Не так даўно ў тэлевізійнай праграме «Час» быў паказаны сюжэт аб уручэнні ў Крамлі групе таварышаў высокіх урадавых узнагарод. Сярод узнагароджаных быў і славуты старшыня славутага на ўсю краіну калгаса «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна Уладзімір Лявонцьевіч Бядуля. Андрэй Андрэевіч Грамыка ўручыў яму ордэн Леніна і другую Залатую Зорку Героя Сацыялістычнай Працы.

У. Л. Бядуля з тых людзей, якія сваёй працай, сваёй грамадзянскай і чалавечай пазіцыяй рыхтавалі, набліжалі перабудову. Яны не ішлі на здзелку з сумленнем, не гнуліся пакорліва перад чыноўніцкімі аўтарытэтамі, не дапускалі разладу паміж словам і справай, а шчыра і сумленна, набіваючы гузакі і зведваючы балючыя душэўныя траўмы, рабілі даручаную ім справу, з сялянскай, хлебаробскай цягавітасцю, а то і зацятасцю працавалі, дбалі аб тым, каб з году ў год добра радзіла зямля, каб багацела і мацнела гаспадарка, а разам з ёй і краіна, каб заможна, шчаслива і духоўна, змястоўна жылі людзі. Гэта ж яны робяць і цяпер, толькі робяць, трэба думаць, куды з большым імпэтам і заўзятасцю, з большай радасцю і задавальненнем, бо адчулі сапраўдны давер, бо раскрыліся перад імі шырокія магчымасці для разгарнення сваіх гаспадарчых, кіраўнічых, выхаваўчых здольнасцей.

Сёння партрэт Уладзіміра Лявонцьевіча — на першай старонцы нашага штотыднёвіка. Робім мы гэта з задавальненнем яшчэ і з тае прычыны, што ведаем, як рупліва дбае ён пра духоўны патэнцыял сваіх калгаснікаў, пра стварэнне ў гаспадарцы ўмоў і магчымасцей для развіцця і росквіту мастацкіх здольнасцей малых і старых. Для пацвярджэння сказанага згадаем хіба толькі такі факт: у «Савецкай Беларусі» пабудаваны першы ў рэспубліцы і другі ці трэці ў краіне Музей хлеба. Ініцыятарам яго стварэння быў таксама старшыня калгаса Уладзімір Лявонцьевіч Бядуля.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

НАВІНЫ ТЫДНЯ

«ПШЫЯЗНЬ» — СЛОВА БЛІЗКАЕ

У чарговы раз польскі народ адзначыў сваё нацыянальнае свята — Дзень адраджэння Польшчы. Сорак тры гады назад, 22 ліпеня 1944 года, пачалося вызваленне польскай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, наступіў новы этап у польска-савецкай дружбе — у адзіным страі з воінамі Войска Польскага змагаліся часці Савецкай Арміі. Невыпадкова, што гэты дзень шырока адзначаецца і ў нашай краіне, а слова «пшыязнь» гэтаксама блізка і знаёма кожнаму, як і слова «дружба» ў Польшчы.

Па традыцыі ў гэтыя дні ў Савецкім Саюзе праходзіць Дэкада польскай кнігі. Сёлета месцамі правядзення яе сталі 17 гарадоў, у тым ліку Мінск і Гродна. Урачыстае адкрыццё Дэкады ў Мінску адбылося ў аўторак, у выставачнай зале кнігарні «Светач». Да прысутных звярнуўся першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю Р. А. Ткачук. Ён адзначыў, што польская кніга карыстаецца вялікай папулярнасцю ў савецкага чытача. Толькі за апошнія 40 гадоў у нашай краіне выдадзена больш за 2770 назваў кніг польскіх аўтараў агульным тыражом больш за 130 мільёнаў экземпляраў.

Даўнія сувязі паміж выдаўцамі Беларусі і Польшчы. За гады Савецкай улады польская кніга была прадстаўлена ў выдавецкіх планах рэспублікі 86 разоў. Тыраж жа выпушчаных кніг склаў амаль 2 мільёны экземпляраў.

Пра далейшае пашырэнне культурнага супрацоўніцтва паміж двума народамі, выдавецкіх кантактаў гаварылі на адкрыцці Дэкады лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Б. Сачанка і консул Генеральнага консульства ПНР у Мінску К. Паскудзкі.

На адкрыцці Дэкады польскай кнігі выступае Барыс Сачанка.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Прысутныя змаглі пазнаёміцца з экспазіцыяй польскай кнігі, у якой былі прадстаўлены выпушчаныя ў Польшчы творы класікаў марксізму-ленінізму, іншая грамадска-палітычная літаратура, выданні па мастацтву, краязнаўству. Асабліва багаты выбар мастацкай літаратуры. На асобным стэндзе — кнігі беларускіх аўтараў, выпушчаныя ў ПНР. Сярод іх — творы А. Адамовіча, В. Адамчыка, Я. Брыля, В. Быкава, І. Пташнікава, І. Шамякіна і іншых аўтараў. Увагу наведвальнікаў прыцягнуў і стэнд з кнігамі польскіх пісьменнікаў, якія выйшлі ў перакладзе на беларускую мову, — «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча, «Польскія кветкі» Ю. Тувіма, «Апавяданні» А. Каспровіча і іншыя.

У адкрыцці Дэкады прымаў удзел Генеральны консул ПНР у Мінску М. Абядзіньскі.

Больш за 700 назваў кніг, брашур, альбомаў, даведачнай літаратуры, выпушчанай выдавецтвамі Польшчы, прапануецца ў мінскай кнігарні «Дружба», а тым, хто не ведае польскай мовы, адрасуюцца буквар і падручнікі.

У Мінск прыехалі ўдзельнікі XII Сумеснай творчай сустрэчы савецкіх і польскіх пісьменнікаў. Прадстаўнічую дэлегацыю з польскага боку ўзначальвае Марыян Рэняк-Струшыньскі, з савецкага — Юрый Тарскі.

Госці ўсклалі кветкі да манумента на плошчы Перамогі, наведалі Дом-музей I з'езда РСДРП, пабывалі ў Хатыні і на Кургане Славы. У Саюзе пісьменнікаў БССР адбылася гутарка беларускіх літаратараў і ўдзельнікаў XII сустрэчы на тэму «Братэрства па духу, братэрства па зброі», Наперадзе ў гасцей — паездкі ў Барысаў, Леніна, адкуль пачало свой шлях Войска Польскае і дзе знаходзіцца мемарыял савецка-польскай дружбы (аб гутарцы ў СП і паездках гасцей «ЛіМ» раскажа падрабязней).

НАШ КАР.

ГОСЦЬ ЦІКАВІЎСЯ ПЕРАБУДОВАЙ...

Па запрашэнні Саюза пісьменнікаў рэспублікі з двухдзённым рабочым візітам Мінск наведаў кіраўнік бялградскага кааператыўнага выдавецтва «Ново дэло» Момчыла Джэркавіч. Ён меў гутарку са старшынёй праўлення Максімам Танкам, першым сакратаром Н. Гілевічам, сакратарамі праўлення А. Жукам, В. Зуёнкам, В. Казько, пісьменнікамі Я. Міклашэўскім, А. Разанавым, І. Чаротам і інш.

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» госця прымалі дырэктар выдавецтва В. Грышановіч, галоўны рэдактар С. Андраюк, намеснік галоўнага рэдактара М. Кусянкоў і рэдактар В. Сёмуха, у «Юнацтве» галоўны рэдактар Я. Каршукоў і загадчык рэдакцыі літаратуры на замежных мовах Г. Чарнушчанка.

Размова ішла аб стане падрыхтоўкі да выдання анталогіі беларускай паэзіі XX стагоддзя на сербскахарвацкай мове (мае выйсці ў 1987 годзе) і анталогіі сербскай паэзіі на беларускай мове (мае выйсці ў 1988 годзе). Абмяркоўвалася пытанне аб далейшым двухбаковым творчым супрацоўніцтве, у прыватнасці, госць прапанаваў у Бялградзе і Мінску выпусціць сумеснае выданне — анталогію партызанскай паэзіі, у якую ўключыць творы аўтараў з абодвух бакоў.

— Спадзяюся, што тыя размовы, якія я вёў у Мінску, — сказаў на развітанне М. Джэркавіч, — дадуць падставу заключыць нам на Маскоўскім міжнародным кніжным кірмашы, што адбудзецца сёлета ў верасні, новыя кантракты.

Госць цікавіўся таксама пытаннямі перабудовы. У сваю чаргу ён адказаў на пытанні, якія тычацца дзейнасці выдавецтва «Ново дэло»:

— У выдавецтве пяць штатных адзінак. За год выпускаем шэсцьдзесят кніг, рукапісы здаём у тры друкарні, з якімі ў нас заключаны ўмовы. Кніга ў вытворчасці, з дня атрымання рукапісу выдавецтвам у канчатковым выглядзе да выпуску ў свет, знаходзіцца тры месяцы. Як выключэнне — каля шасці месяцаў. Нядаўна мы выдалі пераклад аповесці «Знак бяды» Васіля Быкава. Чытаў рукапіс я адзін — так сказаць, і за дырэктара, і за галоўнага рэдактара, і за загадчыка рэдакцыі, і за адказнага рэдактара — і падпісваў у друк адзін. А навошта яшчэ адказныя? У выдавецтве «Багдала», што ў горадзе Крушэвац, працуе адзінаццаць чалавек, але яны выпускаюць сто назваў кніг і яшчэ два часопісы.

— А які самы вялікі тыраж кнігі ў вашым выдавецтве?

— Пяць тысяч. Мы выпускаем літаратуру на сербскай мове.

— Пры такім тыражы ў нас кніга нерэнтабельная.

— У нас дае дваццаць працэнтаў прыбытку. Мы працуем так, каб прыбытак давала кожная кніга, — завяршыў размову госць.

А. ГАРДЗІЦКІ.

ЛАЎРЭАТ — БЕЛАРУСКІ ПАЭТ

У Грузіі ў чарговы раз прайшоў Усесаюзны фестываль маладой грамадзянскай паэзіі, па традыцыі прымеркаваны да дня нараджэння Уладзіміра Маякоўскага. Названы лаўрэат фестывалю. Сёлета ім стаў беларускі паэт Віктар Шніп.

«ТРАВІЯТА» Ў ДВУХСОТЫ РАЗ

Спектакль «Травіята», пастаўлены ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР народным артыстам Савецкага Саюза Дзмітрыем Смолічам, прайшоў на мінскай сцэне ў двухсоты раз. Галоўныя партыі выконвалі народны артыст СССР Аркадзь Саўчанка (Жорж Жэрмон), народны артыст РСФСР Эдуард Пелагейчанка (Альфрэд), салістка Наталля Кастэнка (Віялета). Опера Д. Вердзі прайшла пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі дырыжора У. Машэнскага.

П. ПЯТРОУСКІ.

ФОТАРЭПАРТАЖ У НУМАР

ЛІТАВЕЦ — БОЛЬ НАШ

17 тысяч 606 жыхароў Дзяржынскага раёна загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, многія населеныя пункты былі спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Лёс пяці з іх — лёс Хатыні. Дзве вёскі — Літавец і Любажанка — знаходзяцца на тэрыторыі Дабрынёўскага сельскага Савета, непадалёку ад Станькава, дзе здзейсніў свой неўміручы подзвіг Герой Савецкага Саюза Марат Казей. Правільней сказаць, знаходзіліся. Фашысты не маглі дараваць жыхарам сувязі з партызанамі — спалілі хаты разам з людзьмі.

Як мы паведамлялі ўжо («ЛіМ» за 19 чэрвеня 1987 года), на месцы вёскі Літавец у верасні 1986 года, у Міжнародны год міру, на грамадскіх пачатках пабудаваны мемарыяльны комплекс «Літавец», аўтарамі якога з'яўляюцца члены творчай групы ў складзе скульптара С. Гарбуновай, архітэктараў В. Яўсеева і В. Здасюка, паэта Р. Барадуліна, мастацтвазнаўцы У. Пракапцова.

Нядаўна ж адбылося ўрачыстае адкрыццё гэтага мемарыяльнага комплексу.

11 гадзін... Пад гукі жалобнага марша працэсія, у складзе якой прадстаўнікі партыйных, савецкіх органаў Дзяржынскага раёна і Мінскай вобласці, удзельнікі партызанскага руху на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, павольна накіроўваецца ў цэнтр былой вёскі, дзе ўзведзены манументальны рэльеф.

Гучаць Дзяржаўныя гімны СССР і Беларускай ССР. Права адкрыць помнік прадастаўляецца першаму сакратару Дзяржынскага райкома камсамола М. Новіку, дырэктару саўгаса імя Марата Казея Л. Рамановічу, былым жыхарам Літаўца А. Караневічу, К. Рускевіч, А. Трыч. Паволі сплывае пакрывала, і перад позіркамі соцень людзей, што сабраліся тут, паўстае адзін з мірных эпізодаў жыцця Літаўца. Стары, седзячы на печы, моўчкі пляце кош. Маці гуляе з дзіцем. У цэнтральнай частцы рэльефу дзеці, якія грэюцца на чарэні печы. Побач, злева, разбітыя каваным нямецкім ботам вароты. Крыху справа, на вялікай сцяне словы: «Ні жудасць не астудзіць, ні мароз зямлю, дзе крык жывы травой прарос. Агонь у напаміне, ва ўспаміне. Прыйдзі адчуць, як прысак тут не стыне».

Камсамольцы раёна запальваюць вечны агонь — сімвал нязгаснай чалавечай памяці аб загінуўшых. Да мемарыяла ўскладаецца гірлянда славы.

Выступае Мікола Мятліцкі.

Літаратурная кампазіцыя, прысвечаная памяці загінуўшых.

Фота Ул. КРУКА.

Мінута маўчання... Яе прарываюць аўтаматныя стрэлы — салют у гонар тых, хто загінуў, але не скарыўся ворагу.

Мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнага комплексу «Літавец», пачынае першы сакратар Дзяржынскага гаркома партыі У. Г. Гаркун. Гаворачы аб мужнасці савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ён адзначае той уклад, які ўнёс у разгром ворага беларускі народ, падкрэслівае, што памяці аб загінуўшых, у тым ліку мірных жыхарах, закатаваных фашысцкімі варварамі, вечна жыць на зямлі.

Болем працінаюць сэрца кожнага, хто сабраўся тут, выступленні літаўчан, якія цудам засталіся жывымі ў той страшны дзень 14 студзеня 1943 года, калі ў агні загінула 196 жыхароў, старых, жанчын, у тым ліку 58 дзяцей. Даўкія камякі падступаюць да горла А. Караневіча — у агні засталіся яго бацька, маці, тры сястры і брат; не хавае слёз В. Лысакова, якая таксама страціла ўсіх блізкіх. Пра трагедыю літаўчан расказвае былая жыхарка вёскі К. Рускевіч, якая на трэці дзень вайны выехала з Літаўца... Плачуць старыя і маладыя: у многіх жа ў вёсцы жылі сваякі, блізкія.

Мітынг працягваецца... Народны мастак БССР А. Анікейчык адзначае значнасць мастакоўскай задумы С. Гарбуновай па ўвекавечанню памяці мірных жыхароў. М. Мятліцкі чытае новы верш, напісаны пад уражаннем першага знаёмства з мемарыяльным комплексам «Літавец», калі прыязджаў сюды ў складзе творчай групы...

У мітынгу прыняў удзел першы сакратар Мінскага абласнога камітэта Кампартыі Беларусі А. А. Малафееў.

НАШ КАР.

ГАСТРОЛІ

МУЗЫ З НОВАСІБІРСКА

Ужо амаль месяц у Мінску з поспехам праходзяць гастролі Новасібірскага дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі. На дзвюх сцэнічных пляцоўках — у тэатры музычнай камедыі і ў Палацы культуры чыгуначнікаў — паказваюць госці свае спектаклі.

Разнастайная афіша тэатра: класічныя аперэты І. Кальмана, Ф. Легара, творы вядомых сучасных савецкіх аўтараў Г. Канчэлі, А. Колкера, пастаноўкі па творах не знаёмых мінскаму гледачу М. Самойлава, В. Кало, В. Зіміна і А. Дзерыева, спектаклі для дзяцей. Захопленыя водгукі атрымалі вялікія канцэртныя праграмы, падрыхтаваныя новасібірскімі артыстамі.

Фотакарэспандэнт А. Каляда пабываў на спектаклях гасцей і зрабіў вось гэтыя здымкі.

Сцэна са спектакля «Баядэра».

Артысты Н. Калініна (Ганна Главары) і М. Міхайлаў (граф Даніла) у спектаклі «Вясёлая ўдава».

«Неадхільны Сапрыкін». Сцэна са спектакля.

«УЯВІЦЕ САБЕ СТАДЫЁН...»

«Рэвалюцыі вечны агонь». Пад такім дэвізам у сталіцы рэспублікі горадзе-герої Мінску, у абласных гарадах прайшлі мастацка-спартыўныя прадстаўленні, прысвечаныя 70-годдзю Кастрычніка. Наш карэспандэнт папрасіў расказаць пра іх заслужаную артыстку рэспублікі, актыўную ўдзельніцу гэтых святаў Ганну Паўлаўну Рыжкову.

— Пра тое, як прайшло мастацка-спартыўнае свята ў Мінску, «ЛіМ» пісаў. Я хачу дадаць, што з такім жа поспехам яно праходзіла і ў абласных цэнтрах. Усяго было дадзена дваццаць прадстаўленняў, у якіх прынялі ўдзел 350 прафесійных і 800 самадзейных артыстаў, дзесяткі духавых аркестраў, самадзейных танцавальных калектываў, народныя хоры ветэранаў вайны і працы, больш як паўтары тысячы спартсменаў і фізкультурнікаў, навучэнцы прафтэхвучылішчаў і г.д.

Так, гэта было сапраўднае свята. Уявіце сабе стадыён (а яны ёсць ва ўсіх абласных гарадах), запоўнены да краёў, святочную публіку, што адгукаецца на кожнае выступленне гарачымі апладысментамі. З цікавасцю і хваляваннем гледачы ўспрымалі многія «старонкі» нашых выступленняў і асабліва тыя, што ўваскрашалі векапомныя гады рэвалюцыі, гераічны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пасляваенныя гады аднаўлення.

— Якія выступленні вы лічыце найбольш яркімі, цікавымі?

— Ведаеце, такіх было вельмі многа. Я б назвала і вядомую «Кахоўку» І. Дунаеўскага, якую з уздымам праспявала Святлана Кульпа, і пантаміму «А досвіткі тут ціхія...» у выкананні артыстаў тэатра «Рух», і славутую «Лявоніху» — каронны нумар Дзяржаўнага ансамбля танца; высокі прафесійны ўзровень паказалі ансамблі «Песняры» і «Сябры». Выдатна вяла прадстаўленне Зінаіда Бандарэнка.

Я нагадала прафесійных артыстаў. Але ж не трэба забывацца, што свята называлася мастацка-спартыўным, называлася так невыпадкова. Гарачымі воплескамі сустракалі гледачы і маляўнічы парад спартсменаў, іх разнастайныя выступленні на полі стадыёна.

Каб сплавіць прадстаўленне ў адно мастацкае цэлае, патрэбны быў дакладны сцэнарый, добрая прафесійная рэжысура. На маю думку, і сцэнарый — аўтар яго Пятрусь Макаль, і пастаноўка Рыгора Майзельса заслугоўваюць самай высокай адзнакі. Дарэчы, Р. Майзельс, на маю думку, выдатны пастаноўшчык масавых відовішчаў, што ўражваюць цудоўным сплавам мастацтва і спорту.

— Свята, пра якое вы расказваеце, Ганна Паўлаўна, можа стаць пачаткам выдатнай традыцыі...

— Так. Я думаю, што яно павінна выйсці і на сцэнічныя пляцоўкі раённых цэнтраў, а можа, нават і буйных гаспадарак, дзе нямала выдатных палацаў культуры. Сельскі працаўнік, ён у нас часта пазбаўлены радасці далучэння да мастацтва.

І яшчэ такая заўвага. На маю думку, некаторым нашым мастацкім калектывам, якія прымалі ўдзел у гэтых прадстаўленнях, бракуе густу. І ў манеры выканання, і ў чыста афарміцельскім плане. Напрыклад, некаторыя артысты былі апранутыя ў надзвычай экстравагантныя касцюмы, якія не адпавядалі ні духу самога свята, ні творам, якія яны выконвалі. Далікатнасць, сціпласць, густ — чамусьці на гэтыя якасці ў артыстычным асяроддзі апошнім часам усё менш пачалі звяртаць увагу.

Сяброўская сустрэча М. С. Гарбачова з Габрыэлем Гарсія Маркесам

15 ліпеня М. С. Гарбачоў сустрэўся з выдатным лаціна-амерыканскім пісьменнікам Габрыэлем Гарсія Маркесам, які знаходзіцца цяпер у Савецкім Саюзе. Адбылася ажыўленая, зацікаўленая гутарка аб перабудове ў Савецкім Саюзе, аб яе міжнародным значэнні, аб ролі дзеячаў культуры, аб значэнні агульначалавечых каштоўнасцей у сучасным свеце.

М. С. Гарбачоў, цёпла вітаючы Гарсія Маркеса, сказаў, што яму заўсёды рады ў Савецкім Саюзе, таму што добра ведаюць яго мастацкія творы і прагрэсіўную грамадскую дзейнасць.

Вы прыехалі да нас у цікавы час — час крутых перамен, абнаўлення ўсёй сістэмы сацыялістычных адносін, пачынаючы з эканомікі і канчаючы духоўнай сферай. Паўсюдна ідзе напружаная работа, але яна да спадобы нашаму народу: ёсць дзе прыкласці сілы, праявіць ініцыятыву, творчасць. Усё гэта мы, ды і не толькі мы, але і ва ўсім свеце, абазначаем словамі «перабудова», «публічнасць».

Гарсія Маркес. Перабудова і публічнасць — гэтыя цяпер самыя вядомыя ў свеце словы. Вельмі ўдачныя словы. Яны не перакладаюцца ні на іспанскую, ні на французскую, ні на англійскую мовы. «Публічнасць» і «перабудова» гавораць па-руску ва ўсім свеце.

М. С. Гарбачоў. Больш шырокі сэнс слова «перабудова» заключаецца ў тым, што яно адлюстроўвае не толькі наспеўшыя ў нашай краіне праблемы. Можна сказаць, што ўвесь свет мае патрэбу ў перабудове, гэта значыць якасным змяненні, прагрэсіўным развіцці. Людзі маюць патрэбу ў тым, каб вызначыцца, дзе яны знаходзяцца, у разуменні тых праблем, якія ўсіх хвалююць, ва ўсведамленні таго, як жыць далей.

Здаецца, у вучоных няма даных аб тым, што недзе ёсць іншая такая ж разумная цывілізацыя, як наша, зямная. І няўжо нам не хопіць мудрасці знайсці ўзаемаразуменне, не ўзарваць свет з-за таго, што мы розныя?

Гарсія Маркес. Калі перабудова, калі тое, што вы робіце, будзе даведзена да канца, гэта акажацца самай важнай падзеяй у сучаснай гісторыі. У мяне многа сяброў у Лацінскай Амерыцы, якія горача ўспрымаюць тое, што вы робіце. Ёсць і людзі, якія сумняваюцца ў поспеху перабудовы. Вам, мабыць, цяжка сачыць за шматвобразнай рэакцыяй у свеце на тыя працэсы, якія адбываюцца ў вас у краіне.

М. С. Гарбачоў. Мы, вядома, сочым за рэакцыяй у свеце, адчуваем рэзананс на тое, што мы робім, што прапануем свайму народу. Мы імкнёмся ўзняць наша грамадства на больш высокую ступень, надаць яму новую якасць на аснове каштоўнасцей сацыялізму, агульначалавечых каштоўнасцей. Шлях да гэтага — у развіцці дэмакратыі, шырокім уключэнні чалавека, працоўных у грамадскае жыццё, у праходзячыя працэсы. Гэта адзін бок справы.

Другі бок заключаецца ў тым, што наша знешняя палітыка — прадаўжэнне ўнутранай. У знешняй палітыцы мы імкнёмся кіравацца новымі падыходамі, праводзіць жывую сувязь з працэсамі, якія адбываюцца ў нас у краіне. Гэта значыць, што і тут мы прыярытэтнымі робім інтарэсы чалавека, гуманістычныя каштоўнасці. І нам, зразумела, неабыякава, як успрымае свет тое, што мы робім. Мы хочам сумленна сказаць свету аб нашых планах, аб нашых мэтах. І мы кіруемся не нейкімі фанабэрыстымі амбіцыямі, робім гэта не для таго, каб некаму спадабацца, зрабіць добрае ўражанне. Мы бачым, што наша грамадства паспела для перамен. І калі б гэта зрабілі не мы, не цяперашняе кіраўніцтва, дык гэта зрабілі б іншыя. Перабудова — гэта цяжкі і складаны, але аб'ектыўна неабходны, сацыяльна абумоўлены працэс.

Новыя падыходы ва ўнутраных справах мы трансфармуем у ініцыятывы ў знешняй палітыцы. Гэта — не лозунгі, а рэальныя практычныя прапановы. За два гады мы зрабілі многа такіх прапаноў, вынеслі іх на суд міжнароднага супольніцтва. Не прэтэндуем на абсалютную ісціну, прыслухоўваемся да думкі іншых. Гэта і ёсць тое, што мы называем — новае мысленне. Трэба вучыцца слухаць адзін аднаго і вучыцца адзін у аднаго, улічваць інтарэсы кожнай дзяржавы і паважаць інтарэсы кожнага народа. Няхай кожны даказвае свае перавагі пры ўсёй разнастайнасці сучаснага свету, але робіць гэта мірнымі сродкамі, супрацоўнічаючы адзін з адным.

Пры гэтым мы не скрываем сваю перакананасць у тым, што іменна сацыялізм адкрывае велізарныя магчымасці і перспектывы для чалавека. Мы — за сацыялізм. Але свае перэкананні нікому не навязваем. Няхай кожны выбірае, а гісторыя ўсё паставіць на свае месцы.

Мы, вядома, не імправізуем, хоць творчае ўяўленне нам цяпер вельмі неабходна. Вядзём справу на аснове навуковага аналізу, выверанай унутрыпалітычнай і знешнепалітычнай канцэпцыі. Перакананы, што чалавецтва падышло да такога этапа, калі ўсе залежаць адзін ад аднаго. Нельга адрываць адну краіну ад другой, адзін народ ад другога, а тым больш — процiпастаўляць іх.

На нашым камуністычным лексіконе гэта называецца інтэрнацыяналізмам. Але гэта супадае з усталяваннем агульначалавечых каштоўнасцей. У процілегласць капіталізму, які грабіць народы, адмаўляецца паважаць выбар імі свайго шляху, глядзіць на цэлыя кантыненты, як на сваю вотчыну.

Для імперыялізму перабудова міжнародных адносін — гэта быццам костка ў горле. Але перабудова неабходна свету, насычанаму ядзернай зброяй, свету, дзе ёсць сур'ёзныя эканамічныя, экалагічныя праблемы, дзе ёсць беднасць, адсталасць, хваробы. Свету, у якім створана гіганцкая інфармацыйная індустрыя. А вы ведаеце, якое ўздзеянне аказвае яна на розумы людзей.

Мы лічым, што патрэбна вучыцца спалучаць нацыянальныя інтарэсы з агульначалавечымі задачамі. У нашай палітыцы няма двайнога дна. Наша сумленне чыстае. Наша філасофія міжнародных адносін не супярэчыць разважнаму сэнсу. Яна заснавана на глыбокім навуковым аналізе працэсаў і на строгім уліку інтарэсаў працоўнага народа. Яе мы і прапануем усяму свету. Яшчэ раз падкрэслю: прапануем, але ні ў якім разе не навязваем. Мы бачым, што наша палітыка выклікае не проста цікаўнасць, а глыбокі інтарэс. Свет стаміўся ад напружанасці, усе імкнуцца да лепшага.

Але ёсць, вядома, тыя, каго не задавальняюць прапануемыя намі перспектывы. Наша філасофскае бачанне свету яны аб'яўляюць утапічным, спрабуюць дыскрэдытаваць нашу палітыку, цяперашняе кіраўніцтва. Аб гэтым мы ведаем.

І ўсё ж свет мяняецца. Расце цяга да ўзаемаразумення, узаемных сувязей. Гэта нас натхняе.

Гарсія Маркес. Сардэчна дзякую Вам за тое, што Вы мне сказалі. Вы не ўяўляеце, як гэта мяне хвалюе. Вашы выказванні супадаюць з тым, што я думаю сам, што я чуў ад сваіх сяброў у Лацінскай Амерыцы. Гэта пацвярджае ўсё тое, што я думаю аб працэсах у вашай краіне, аб вашай палітыцы. Для мяне вельмі важна тое, што ўсё, што Вы гаворыце і робіце, — гэта шчыра. А паколькі вашы праціўнікі бачаць гэту шчырасць, яна ў іх выклікае страх. І іх дзеянні могуць быць у будучым яшчэ больш небяспечнымі.

На гэты раз я так хацеў прыехаць у СССР. Упершыню пабываў у вашай краіне на маладзёжным фестывалі ў 1957 годзе. Тады таксама я перажываў з маімі савецкімі сябрамі праходзіўшыя перамены. Людзі святкавалі пачатак перамен. Ім здавалася, што яны адбудуцца, і адбудуцца хутка.

Цяпер жа, праз 30 гадоў, я бачу вялікую розніцу ў адносінах людзей да перамен. Яны гэтак жа горача іх успрымаюць. Але гэта — не проста свята, а напружаная работа розуму. Гэта глыбокія і няпростыя роздумы. Няма таго сляпога аптымізму, які быў у 1957 годзе. Цяпер я адзначаю ўпэўнены і ў вышэйшай ступені напружаны аптымізм. Людзі разумеюць, што трэба дзейнічаць, уносіць свой уклад у перабудову. Але ёсць і апасенні: а раптам не атрымаецца? І ўсё гэта — шчыра. Ніхто не ставіць пад сумненне і шчырасць палітыкі перабудовы. Няма сумненняў у тым, што гэта сур'ёзна. Асабліва ў свеце творчай інтэлігенцыі, сярод пісьменнікаў, дзе ў мяне многа сяброў. Усе жадаюць: ні кроку назад!

М. С. Гарбачоў. Добрыя словы.

Гарсія Маркес. Можаце быць упэўнены, што і інтэлігенцыя Лацінскай Амерыкі на вашым баку. Там з велізарнай цікавасцю ўспрымаюць тое, што адбываецца ў Савецкім Саюзе, вашу перабудову.

Я пісьменнік, выказваю думкі, якія перапаўняюць мяне. Хачу сказаць, што зведваю любоў і глыбокую павагу да савецкіх людзей.

М. С. Гарбачоў. Дзякуй. Цэнім, што ў Вашай асобе мы маем гарачага прыхільніка перабудовы і нашага друга.

Гарсія Маркес. Самая важная падзея за апошнія гады для мяне — гэта сённяшняя сустрэча. Я шчаслівы, што яна адбылася.

М. С. Гарбачоў. У нашай краіне ў Вас велізарны аўтарытэт. Вашы творы выдаюцца, можа, большымі тыражамі ў Савецкім Саюзе, чым у іншых краінах. У Вас тут вельмі многа чытачоў.

Гарсія Маркес. Так, я ведаю, што больш за ўсё маіх кніг выдаецца на іспанскай мове, а потым — на рускай.

М. С. Гарбачоў. Гэтымі днямі я сустракаўся з кіраўнікамі нашых сродкаў масавай інфармацыі і творчых саюзаў. Гэта была цікавая сустрэча. Я гаварыў на ёй, што мы надаём велізарнае значэнне публічнасці, развіццю дэмакратыі. Гэта дае магчымасць савецкаму чалавеку поўнасцю раскрыцца. Людзі загаварылі. Ім ёсць што сказаць адзін аднаму і што выказаць ураду. Як многа мы прайгралі ад таго, што на нейкім этапе замарудзіўся працэс развіцця дэмакратыі! Хоць, зразумела, і ў гэтай сферы мы дасягнулі высокага ўзроўню. Мы—самы адукаваны народ, мы любім сваю Радзіму. Таму вельмі важна ўключыць народ у працэсы перабудовы, развіваць дэмакратыю ўшырыню і ўглыбіню. Гэта збавіць нас ад многіх памылак і з'явіцца гарантыяй таго, што перабудова будзе набываць рэальную сілу, ва ўсё большай меры станавіцца незваротнай. За невялікім выключэннем людзі вельмі адказна адносяцца да таго, што адбываецца, і гэта надае нам сілы.

Самае цяжкае — гэта перабудова ў ідэалагічнай, духоўнай сферах. Як пойдзе справа ў сферы дэмакратыі, у духоўнай сферы, так пойдзе і перабудова. Мы гэта добра разумеем, і ў гэтым адрозненне ад таго, што было пасля XX з'езда партыі. Без развіцця працэсаў у духоўнай сферы, у сферы дэмакратыі, без усталявання сацыялістычных і агульначалавечых каштоўнасцей перабудова не пойдзе.

На сустрэчы з журналістамі я сказаў: тое, што мы робім, — правільна і неабходна. Магчыма, у нечым мы і памыляемся, але ісціну трэба шукаць разам. Нельга забываць, што партыя і творчая інтэлігенцыя служаць інтарэсам народа. Такая пастаноўка пытання не павінна бянтэжыць усіх сапраўдных мастакоў. Вялікі мастак — гэта той, хто неабыякавы да лёсу народа, да болю народа. Калі чытаў вашы творы — «Сто гадоў адзіноцтва» і іншыя,— то адчуваў, што ў іх няма схем, што яны прасякнуты любоўю да людзей, да чалавецтва.

Думаю, мы павінны дарожыць кожным пражытым днём пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. І самыя цяжкія дні не былі пражыты дарэмна. Усё гэта — наша гісторыя. Хіба можна дапусціць непавагу да тых пакаленняў, якія стваралі фундамент сацыялізму, якія далі нам магчымасць сёння ісці наперад? Былі, вядома, і памылкі, нават трагедыі. Але калі паглядзець на тое, чаго мы дасягнулі дзякуючы намаганням партыі і народа, то вынікі каласальныя. Без гістарычных каранёў няма народа. Дрэва без каранёў сохне, гіне.

Гарсія Маркес. Настальгія — небяспечная пастка, але толькі тады разумееш, што галоўнае — пражыць не дарэмна і зрабіць жыццё для людзей лепшым. Усё, што Вы гаворыце, глыбока кранае мяне, прымушае думаць аб лёсе маёй краіны, аб Лацінскай Амерыцы. Там велізарная цікавасць да вашай палітыкі. Спадзяюцца, што Вы наведаеце Лацінскую Амерыку.

М. С. Гарбачоў. У мяне вельмі вялікая цікавасць да гэтага кантынента, да яго лёсу. Гэта — кантынент велізарных патэнцыяльных магчымасцей, традыцый. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, у народаў гэтага кантынента моцная цяга да лепшай будучыні. Але перашкоды тут вялікія, і вам яны вядомыя. Шлях да свабоды —гэта цяжкі шлях. Але я ўсё ж упэўнены, што рух Лацінскай Амерыкі па шляху прагрэсу будзе нарастаць. Спадзяюся бліжэй пазнаёміцца з ёй.

Гарсія Маркес. Ваш прыезд у Лацінскую Амерыку вельмі важны для ўсіх прагрэсіўных сіл кантынента.

Я ўдзячны Вам за гутарку. Пакідаю Маскву акрыленым больш, чым калі збіраўся сюды ехаць.

М. С. Гарбачоў. Вельмі рад сустрэчы з Вамі. У сучасных умовах, калі свет як бы знаходзіцца на гістарычным раздарожжы, слова аўтарытэтных дзеячаў сусветнай культуры мае велізарнае значэнне. Яно мацнейшае за зброю. Яно дапамагае зразумець, куды пойдзе свет, як яго будаваць, як захаваць цывілізацыю і жыццё на Зямлі. Людзі прыслухоўваюцца да Вашага слова, да таго, што Вы пішаце. Жадаю Вам поспехаў, спадзяюся на новыя сустрэчы з Вамі.

ТАСС.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

КЛОПАТЫ ФОНДУ — КЛОПАТЫ НАРОДА

Наш карэспандэнт гутарыць са старшынёй праўлення Беларускага аддзялення Савецкага фонду культуры, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР Іванам ЧЫГРЫНАВЫМ

— Шырокая дэмакратызацыя нашага жыцця, асабліва пасля XXVII з'езда КПСС, выклікала нараджэнне шэрагу новых грамадскіх арганізацый. Савецкі фонд культуры — арганізацыя сярод іх асаблівая. Сёння, як ніколі, бадай, раней, у жыцці грамадства ўзрастае роля пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, дзеячаў музыкі, тэатра, кіно, усіх, хто стварае духоўныя багацці, бо культура — гэта сапраўдны духоўны патэнцыял і самога грамадства, і, на дадзеным этапе, перабудовы. Толькі па-сапраўднаму высокаідэйнымі і высокамастацкімі творамі мы можам супрацьстаяць пранікненню так званай буржуазнай масавай культуры, а таксама шэрасці, прымітыву, з якімі мы сёння змагаемся. Важна яшчэ і захаваць усё лепшае, што створана папярэднікамі, што стала ўжо гісторыяй, гісторыяй культуры...

— Прадчуваю ваша першае пытанне... Калі гаварыць наогул пра мэты і задачы Савецкага фонду культуры, дык, відаць, усё ж давядзецца звярнуцца да самога статута Фонду, дзе, як кажуць, усё распісана. Аднак ці ёсць у тым неабходнасць? Праект статута Савецкага фонду культуры друкаваўся, шырока абмяркоўваўся; думкі і прапановы, выказаныя грамадскасцю, былі ўлічаны. Таму спынюся толькі на асноўных момантах. Савецкі фонд культуры (і, зразумела, яго Беларускае аддзяленне) закліканы садзейнічаць найбольш поўнаму і глыбокаму засваенню багацяў нацыянальнай, айчыннай і сусветнай культуры, эстэтычнаму, патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню ўсіх слаёў насельніцтва...

— І ў першую чаргу, відавочна, моладзі?

— Фарміраванне пачуцця грамадзянскай адказнасці за стан і памнажэнне культурных каштоўнасцей, за далейшае развіццё савецкага мастацтва тычыцца, вядома, усіх. У адносінах жа да моладзі гэтая работа павінна мець куды большую практычную скіраванасць — арганізацыя шматлікіх выставак, выступленняў, канцэртаў, на якіх будуць прапагандавацца лепшыя ўзоры савецкага шматнацыянальнага мастацтва.

— Аднак, Іван Гаўрылавіч, умовы неаднолькавыя, скажам, для тых, хто жыве ў буйным сучасным горадзе, і тых, хто жыве на перыферыі.

— Выйсце ў тым, каб паскоранымі тэмпамі развіваць і ўмацоўваць матэрыяльную базу ранейшых установаў культуры і ствараць новыя, садзейнічаць развіццю прафесійнага і самадзейнага мастацтва. А возьмем шматлікія аматарскія аб'яднанні, калекцыяніраванне. Аказанне дапамогі таленавітай моладзі ў яе творчым росце, выяўленне з далейшай сістэматызацыяй, стварэннем каталогаў культурна-гістарычных каштоўнасцей і нацыянальных рэліквій, якія знаходзяцца сёння ў прыватных калекцыях, каб уключыць іх у грамадскае карыстанне — усё гэта поле дзейнасці Фонду культуры. Будзем весці работу па адшукванні і вяртанні на Радзіму твораў мастацтва, архіўных матэрыялаў, розных помнікаў культуры і гісторыі, якія па розных прычынах трапілі за мяжу, каб перадаць іх архівам, музеям.

— Для ўсяго гэтага неабходны сродкі. Фонд жа культуры — арганізацыя грамадская, павінна абыходзіцца сваімі сродкамі. А на членскіх узносах, як кажуць, далёка не паедзеш...

— Членскіх узносаў, як у іншых грамадскіх арганізацыях, не будзе. У гэтым сэнсе Фонд культуры можна, бадай, параўнаць з Савецкім фондам міру, у які добраахвотна ўносяць пэўныя сумы як асобныя грамадзяне, так і арганізацыі, а таксама выдавецтвы, рэдакцыі газет і часопісаў за спецыяльна выдадзеныя кнігі, падрыхтаваныя нумары. Фонд міру даўно называюць, здаецца, з лёгкай рукі Барыса Пагранта Андрэя Кіжаватава. У многіх часцях Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі ўстаноўлены сёння бюсты герояў Вялікай Айчыннай вайны, выкананыя А. Курачкіным на грамадскіх пачатках.

Больш за 70 жывапісных і графічных работ падарылі музею саўгаса «Гарадзец» Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці В. Цвірка, А. Пасляковіч, Л. Шчамялёў, А. Марачкін, У. Савіч, А. Кашкурэвіч і іншыя нашы мастакі, якія сталі ініцыятарамі стварэння гэтага асяроддзя культуры.

лявога, фондам нашых сэрцаў. Дык Савецкі фонд культуры — фонд нашай душы, нашага сумлення. Не сумняваемся, што многія савецкія людзі палічаць за гонар, сваім душэўным абавязкам унесці на яго рахунак — рахунак Беларускага аддзялення значыцца пад № 700 — грошы. І, вядома ж, будуць прымацца творы мастацтва, гістарычныя рэліквіі, помнікі культуры, навукі, тэхнікі, усё, што мае гістарычную і культурную каштоўнасць. Маральным заахвочваннем тых, хто прыме ўдзел у рабоце фонду, стане шырокая галоснасць аб атрыманых у дар творах культуры. Будуць абнародаваца звесткі аб асобах і арганізацыях, якія перадалі культурныя каштоўнасці ці ўнеслі грашовыя ўклады,— вядома ж, са згоды асоб і арганізацый. Прадугледжана заахвочванне іх спецыяльнымі прэміямі, знакамі, граматамі, а найбольш заслужаныя стануць ганаровымі членамі Савецкага фонду культуры.

Не магу не сказаць яшчэ вось аб чым... Дэмакратызацыя ўсіх форм нашага жыцця самым непасрэдным чынам тычыцца і дзейнасці Фонду культуры. Гарантуецца, што сродкі, якія будуць сабраны, пойдуць непасрэдна толькі на тыя мэты, на якія яны прызначаліся.

— Іван Гаўрылавіч, устаноўчая канферэнцыя Беларускага рэспубліканскага аддзялення Савецкага фонду культуры адбылася зусім нядаўна, у канцы красавіка, а самому фонду няма яшчэ і года... Можна гаварыць пра першыя яго крокі, напрыклад, пра першыя ўзносы?

— У нашай рэспубліцы многія дзеячы мастацтва і культуры даўно падтрымліваюць цесныя сувязі з асобнымі працоўнымі калектывамі, прапануючы ім свае творы. Ці, скажам, даўно сябруе з пагранічнікамі скульптар А. Курачкін. Яшчэ ў 1967 годзе ён перадаў у дар ім скульптурны партрэт Героя Савецкага Саюза лейтэнанта Андрэя Кіжаватава. У многіх часцях Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі ўстаноўлены сёння бюсты герояў Вялікай Айчыннай вайны, выкананыя А. Курачкіным на грамадскіх пачатках.

Больш за 70 жывапісных і графічных работ падарылі музею саўгаса «Гарадзец» Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці В. Цвірка, А. Пасляковіч, Л. Шчамялёў, А. Марачкін, У. Савіч, А. Кашкурэвіч і іншыя нашы мастакі, якія сталі ініцыятарамі стварэння гэтага асяроддзя культуры.

Карцінную галерэю мяркуецца стварыць у Капылі. Аснову яе экспазіцыі складуць работы ленінградскага мастака Розіна, які нарадзіўся ў вёсцы Вошкаты Капыльскага раёна, вучыўся ў капыльскай школе, часта бываў у сваіх землякоў. Перад смерцю ён завяшчаў перадаць свае творы ў аддзел культуры Капыльскага райвыканкома. Мастацкія каштоўнасці не хацелася б ацэньваць у грашовым выражэнні, тым не менш не магу не сказаць, што кошт гэтай калекцыі 70 тысяч рублёў.

Ствараецца карцінная галерэя і ў калгасе «Чырвоны сцяг» Валожынскага раёна, аб чым «Літаратура і мастацтва» паведамляла. Скульптурныя і графічныя работы свае перадаў для яе мастак А. Кандрацьеў.

Сярод тых, хто пералічыў аднымі з першых грашовыя сродкі на рахунак Савецкага фонду культуры, — Алена Шахала са Смалявіч, работнік рэспубліканскай філармоніі Г. Абібак. Атрыманую ім прэмію Ленінскага камсамола Беларусі перадаў у Фонд культуры калектыў ансамбля песні і танца «Сузор'е» будаўнічага трэста № 8 горада Брэста.

— Паступілі і першыя ўзносы ад пісьменнікаў?

— Грошы пералічылі Святлана Алексіевіч і Эдуард Скобелеў. Апошні перадаў ганарар за кнігу паэзіі «Земные долги», якая выйшла сёлета ў выдавецтве «Юнацтва».

— Вядома, што Савецкі фонд культуры распрацаваў шэраг праграм, разлічаных на бліжэйшыя гады, якія мяркуе ажыццяўляць з шырокім прыцягненнем грамадскасці, а таксама іншых зацікаўленых установаў і арганізацый...

— Такіх праграм распрацавана чатыры. Першая, галоўная, называецца «Памяць». Задача яе — выяўленне каштоўнасцей, якія ў гады вайны трапілі за мяжу, і вяртанне іх, а таксама садзейнічанне збераганню, рэстаўрацыі помнікаў культуры і гісторыі на тэрыторыі рэспублікі. Скажу аб гэтай праграме крыху падрабязней. Як вядома, у час акупацыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі многія помнікі гісторыі і культуры, вывезлі ў Германію найбольш каштоўныя кнігі з буйнейшых бібліятэк, найперш — старадрукі і рэдкія выданні, разрабавалі Дзяржаўны музей БССР. За мяжой апынуўся багаты архіў Акадэміі навук рэспублікі, калекцыі Баранавіцкага музея. Многія з гістарычных і культурных каштоўнасцей дагэтуль не вернуты на радзіму.

Вялікую ўвагу звернем і на захаванне даўніны на тэрыторыі рэспублікі. Сёння ў рэспубліцы 15210 помнікаў гісторыі і культуры, з якіх 10815 узяты пад ахову дзяржавы. Ансамблі старадаўніх цэнтраў і комплексы вістарычнай забудовы захаваліся ў 34 гарадах. Пачата работа па захаванні іх, да яе актыўна далучаецца Фонд культуры. У першую чаргу будуць рэстаўрыраваны, рэканструяваны такія цэнтры ў Нясвіжы, Мсціславе, Слоніме, Полацку, Гродне.

— Прыкладна гэтымі ж пытаннямі займаецца і Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры...

— Адрозненне Фонду культуры ад таварыства ў тым, што мы імкнёмся не толькі зберагаць усё з мінулага, што варта ўвагі і памяці нашай і нашых нашчадкаў, але і садзейнічаць стварэнню новых каштоўнасцей нацыянальнай культуры. Гэта — калі гаварыць аб галоўным адрозненні. У цэлым жа ўся работа фондам будзе праводзіцца на больш дэмакратычнай аснове, з шырокім прыцягненнем прадстаўнікоў грамадскасці. Дарэчы, мы маем намер самым цесным чынам працаваць і з актывістамі таварыства. Асноўны накірунак нашых кантактаў — падтрымка тых, хто ўзнімае свой голас у абарону архітэктурных, гістарычных і культурных рэліквій, якія па нейкіх прычынах сёння знаходзяцца ў небяспецы. А іх, на жаль, нямала, каля 8 тысяч помнікаў.

Чытачам «ЛіМа» будзе цікава даведацца, што Савецкі фонд культуры ўнёс прапанову аб зацвярджэнні адзінай для Савецкага Саюза сістэмы ўліку помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных дошак, памятных знакаў, а таксама будынкаў і збудаванняў, якія маюць гістарычную і культурную каштоўнасць. Мяркуецца стварыць спецыяльны агульнадзяржаўны банк помнікаў культуры, іх стану і выкарыстання. Уносіцца прапанова і аб тым, каб апошнюю суботу красавіка кожнага года лічыць днём Памяці.

— Колькі слоў, калі ласка, пра іншыя доўгатэрміновыя праграмы Фонду культуры.

— Шмат увагі ўдзелім рабоце па адраджэнні, папулярызацыі і ўвекавечанні гісторыка-літаратурных мясцін рэспублікі, звязаных з імёнамі вядомых пісьменнікаў, мастакоў, асветнікаў, вучоных. Прозвішчы называць не буду, бо гэта вялікі спіс. Мяркуецца, што сродкі ад асоб і арганізацый будуць пераводзіцца на канкрэтны помнік. Не застанемся ўбаку і ад стварэння экспазіцыі музея гісторыі кнігадрукавання — ён павінен адчыніць свае дзверы ў Полацку да 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны.

Назвы яшчэ дзвюх праграм гавораць самі за сябе — «Моладзь і культура» і «Комплексная праграма эстэтычнага выхавання насельніцтва рэспублікі».

— Відаць, у аддзяленне паступіла ўжо нямала канкрэтных прапаноў аб тым, як працаваць фонду далей, на што звярнуць увагу ў бліжэйшы час?

— Адно з пажаданняў такое: улічваючы выключную самабытнасць, багацце і старадаўнасць беларускага фальклору, увайсці ў Вярхоўны Савет БССР з хадайніцтвам аб ахове яго адпаведным заканадаўствам. Заслугоўвае падтрымкі прапанова акадэміка Д. Ліхачова аб утварэнні ў кожнай рэспубліцы дзяржаўных камітэтаў аховы нацыянальных моў. Цікавая і такая прапанова — па прыкладзе Латвіі штогод праводзіць рэспубліканскае свята мовы. Выказваецца пажаданне, каб увесці ў курс навучання ўсіх студэнтаў і навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў рэспублікі, якія рыхтуюць спецыялістаў асветы, культуры, меліярацыі сельскай гаспадаркі і будаўніцтва, курс па гісторыі культуры Беларусі і яе ахове.

— Застаецца пажадаць, Іван Гаўрылавіч, плёну ў вашай рабоце.

— Дзякуй. Карыстаючыся выпадкам, хачу звярнуцца да ўсіх, каго цікавіць работа Фонду культуры, з заклікам падтрымаць Беларускае аддзяленне ў пачатку яго дзейнасці. Гэта можа быць асабісты грашовы ўклад, адлічэнні ад канцэртаў, тэатральных пастановак і іншых мерапрыемстваў, ганарары ад спецыяльных нумароў газет і часопісаў, кніг, правядзенне суботніка з пералічэннем зароблених грошай на рахунак № 700. Хацелася б, каб падтрымку фонду аказалі таксама і кіраўнікі творчых саюзаў рэспублікі — як супрацоўніцтвам пры правядзенні калектыўных мерапрыемстваў, так і матэрыяльна. Актыўнымі памочнікамі ў ажыццяўленні праграм фонду могуць і павінны стаць саветы, атрады, ініцыятыўныя групы, якія неўзабаве будуць створаны паўсюдна на грамадскіх пачатках. Клопаты фонду павінны стаць клопатамі ўсяго народа. Толькі такім чынам можна паспяхова ажыццявіць пастаўленыя задачы.

«ЛіМ» ПАВЕДАМЛЯЕ

ПЕРАДАДЗЕНА АЛЕСЕМ АДАМОВІЧАМ

У Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва БССР паступілі на дзяржаўнае захаванне матэрыялы Алеся Адамовіча. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі сфарміравана 414 адзінак захоўвання, што ахопліваюць 1942—1986 гады і склалі трэці вопіс фонду вядомага пісьменніка.

Матэрыялы трэцяга паступлення прадстаўлены адзінаццаццю рукапісамі літаратуразнаўчых прац і літаратурна-крытычных артыкулаў, а таксама рэдакцыямі аповесці «Карнікі» (1971—1979), лістамі В. Аскоцкага, В. Распуціна і іншымі. Выяўленчыя дакументы фонду —здымкі А. Адамовіча з К. Сімонавым, А. Бачаровым, У. Калеснікам у час пісьменніцкіх з'ездаў, творчых паездак і сустрэч.

А. ПІСЬМЯНКОВА,
супрацоўнік ЦДАМЛМ БССР.

НА САМАДЗЕЙНАЙ СЦЭНЕ

70-годдзю Вялікага Кастрычніка прысвяціў сваю новую работу — спектакль па п'есе М. Шатрова «Дыктатура сумлення» — народны тэатр юнага гледача Мінскага камвольнага камбіната. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля Я. Быткоўскі, мастак-пастаноўшчык Г. Лапшын. У ролях заняты вадзіцель М. Лазоўскі, рабочы В. Валавік, інжынер У. Армікін і іншыя.

П. ГАРДЗІЕНКА.

СУСТРЭЧЫ НА СТАЎБЦОЎШЧЫНЕ

Гасцямі працоўных раёна былі празаік А. Масарэнка, паэты Я. Крупенька і Г. Тумаш. На сустрэчах, якія адбыліся ў калектывах калгаса «Нёман», Стаўбцоўскай райаграпрамтэхнікі, Навасвержанскага лесазавода, МПМК-233, чыгуначнай станцыі «Стоўбцы» і іншых, ішла гаворка аб надзённых праблемах нашага жыцця і літаратуры.

Сустрэліся пісьменнікі і з членамі літаратурнага гуртка раённай газеты «Прамень» і клуба аматараў паэзіі «Факел», які дзейнічае пры раённай бібліятэцы.

С. ГАЛОЎКА.

АПОРНЫ ПУНКТ «ЮНАЦТВА»

Магазін «Кніжны свет» горада Ліды з'яўляецца апорным пунктам выдавецтва «Юнацтва». Адміністрацыя, актывісты гарадскога клуба «Субяседнік», што дзейнічае пры гэтай кнігарні, падтрымліваюць пастаянныя і цесныя сувязі з беларускімі пісьменнікамі.

Не так даўно гасцямі магазіна былі В. Адамчык, Р. Барадулін, В. Казько, М. Стральцоў. Прайшоў тут і дзень выдавецтва «Юнацтва». У гэты дзень В. Коўтун, С. Панізнік і Х. Лялько пазнаёмілі прадаўцоў магазіна, бібліятэчных работнікаў, кнігалюбаў, старшынь пярвічных арганізацый таварыства аматараў кнігі, грамадскіх распаўсюджвальнікаў літаратуры з тэматычным планам выдавецтва на 1988 год, уласнымі творчымі планамі.

П. МАКАРЭВІЧ.

КНІГАПІС



З. БЯДУЛЯ. Сярэбраная табакерка. Мініяцюры. Абразкі. Апавяданні. Аповесць. Казка. Пераклад з беларускай. М., «Художественная литература», 1986.

У аднатомнік выбранага Змітрака Бядулі, складзены Віктарам Каваленкам, увайшлі найбольш вядомыя яго творы «малога жанру», а таксама аповесць «У дрымучых лясах» і казка «Сярэбраная табакерка», перакладзеныя на рускую мову Б. Якаўлевым і Г. Паповым. Прадмову «З плеяды першых» напісаў Міхась Стральцоў.

ЦЕТКА. Выбранае. Пераклад з беларускай. Мінск, «Юнацтва», 1987.

Цётка (Алаіза Пашкевіч) знаходзілася ў самай гушчыні падзей 1905 года. Яна была актыўным удзельнікам рэвалюцыйных маніфестацый, мітынгаў, агітатарам у горадзе і вёсцы. Яе творы выходзілі з друку як лістоўкі і пракламацыі, а вядомы верш «Мора» меў падзагаловак «Рэвалюцыя народная».

Пачынала ж сваю творчасць Алаіза Пашкевіч сапраўды добрай Цёткай для дзетак-беларусаў — расказвала ім казкі, складала вершы, вучэбныя тэксты пра родную зямлю, загадкі, прымаўкі.

Яе паэтычным крэда было стаць «песняй у народзе». Так яно і сталася.

Зборнік выпушчаны да 110-годдзя з дня нараджэння слаўнай паэтэсы. Уступны артыкул «Першая з першых» напісаў А. Лойка. Пераклад з беларускай П. Кошаля.

У. НЯКЛЯЕЎ. Галубіная пошта. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1987.

У кнігу Уладзіміра Някляева «Галубіная пошта», што папоўніла серыю «Бібліятэка беларускай паэзіі», увайшлі лепшыя творы з яго папярэдніх зборнікаў «Адкрыццё», «Вынаходцы вятроў», «Знак аховы», «Наскрозь».

К. ЦВІРКА. Зялёная Дуброва. Кніга паэзіі. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1987.

Аднатомнік паэзіі Кастуся Цвіркі «Зялёная Дуброва» склалі яго лепшыя творы, прасякнутыя любоўю да Радзімы. Не апошняе месца ў іх тэматыцы займаюць гісторыя беларускага народа, пашана да продкаў, што працавалі на зямлі, любілі і шанавалі яе і перадалі нам гэту любоў у песнях, звычаях, народных традыцыях. Пра гэта — і паэма «Хат вячысты дар».

КРЫТЫКА БІБЛІЯГРАФІЯ

КРЫЛО ПЯШЧОТЫ

Л. АРАБЕЙ. Пошукі кахання. Аповесці, апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1987.

НОВАЯ КНІГА Лідзіі Арабей «Пошукі кахання», як бачна з назвы, закранае тэму старую і вечную, як само жыццё. Героі пісьменніцы настойліва імкнуцца да свайго чалавечага шчасця, задумваючыся над пытаннямі, якія хвалявалі многіх і неаднойчы. Але паколькі падобных між сабой людзей не бывае, кожны па-свойму змагаецца за тое адзінае каханне, што можа прынесці і радасць, і душэўны спакой ці, наадварот, аднойчы апаліць сэрца пякельным агнём неразумення ці крыўды.

Аўтар, заглыбляючыся ў лёсы персанажаў, стварае калярытныя характары тых, хто, нягледзячы на няўдалы лёс жыве з годнасцю, асветлены даўнім каханнем. Сярод іх — літаратурны супрацоўнік адной з рэспубліканскіх газет Таццяна Каштанава, галоўная гераіня аповесці «Дзень мінулы, дзень наступны». Твор — кардыяграма душы маладой жанчыны, якая адна выхоўвае сына.

Так званая «жаночая проза» даволі часта абыгрывае падобныя ці блізкія да іх сітуацыі, даючы часам ім вытлумачэнне, на жаль, толькі з пункту гледжання «жаночай логікі», а значыць, асуджаючы мужчын-спакуснікаў. У адносінах да аповесці Л. Арабей сам тэрмін — «жаночая проза» — не хацелася б ужываць. Перад намі — тая сапраўдная літаратура, напісаная без скідак на жаноцкасць, што калі нечым і адрозніваецца ад аналагічных твораў аўтараў-мужчын, дык хіба толькі больш абвострана пачуццёва-лірычным успрыманнем рэчаіснасці, паэтычнай падсветкай пачуццяў і перажыванняў гераінь.

Таццяна Каштанава — дзіця свайго часу. Той, хто мог стаць яе мужам, загінуў у барацьбе з ворагам. Закончыўшы універсітэт, знайшоўшы любімую работу, гераіня Л. Арабей доўгі час ніяк не магла ўладкаваць асабістае жыццё. Як прызнаецца Таццяна, «калі была студэнткаю, быў адзін... Ваня звалі... Сціплы, харошы хлопец. Мы сустракаліся з ім гады два... А потым я зразумела, што не люблю яго... Прызнаецца жанатаму ўрачу Сяргею Кірылавічу, якога нечакана пакахала і ад яго неўзабаве нарадзіла сына. Прызнаецца шчыра, нічога не ўтойваючы. Гэтая адкрытасць — яшчэ адно пацвярджэнне ўнутранай чысціні гераіні. Па-чалавечы разумееш Таццяну, калі яна давяраецца любімаму чалавеку. Разумееш і тое, што не толькі каханне рухае гэтым учынкам, а і нейкае, магчыма, падсвядомае спадзяванне, што і ў яе ў далейшым усё будзе, як у людзей. Дзіця, муж... Таццяна хапаецца за свайго роду выратавальную саломінку, бо ў неабсяжным акіяне жыцця яна, па сутнасці, безабаронная.

Хіба можна пасля гэтага станавіцца ў позу маралізатара? Як ні дзіўна, можна. Гэта і робіць у артыкуле «Які ён, сучасны homo amans?» Уладзімір Навумовіч («Полымя», 1987, № 5). У цэлым артыкул атрымаўся цікавым. Ці не ўпершыню ў нашай крытыцы так падрабязна аналізуецца адлюстраванне ў сучаснай беларускай літаратуры ўзаемаадносін жанчыны і мужчыны. У. Навумовіч слушна крытыкуе тых, хто пачынае спекуляваць — іншым словам і не скажаш — на чытацкай цікаўнасці да інтымнага жыцця герояў.

Адно не зразумела: навошта У. Навумовічу падганяць пад ім жа створаную схему творы, якія ніяк у яе ўпісацца не могуць? Я маю на ўвазе аповесць Л. Арабей «Дзень мінулы, дзень наступны». Робяцца закіды і ў адрас іншых аўтараў: «На гэтым прынцыпе «прыйшла і пайшла» часта і будуюцца ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі двух полаў». Хацелася б запытацца, а з якога гэта часу крытыка ўзяла сабе за этычную норму без канкрэтнага доказу і канкрэтнага аналізу канкрэтных твораў выносіць «прысуды»?

У. Навумовіч не прымае адносін Таццяны і Сяргея Кірылавіча. Аднак, Сяргей Кірылавіч не такі просты, як падаецца на першы погляд. Л. Арабей паступова «рассакрэчвае» душу добранькага «закаханага». Не адразу зразумее Таццяна, што за чалавек перад ёй. Яшчэ б, пра жонку, дзяцей, якія адпачываюць на поўдні, увесь час думае. Ды не збіраецца, як быццам, пераступаць мяжу «дазволенага»: «Не падумайце пра мяне блага... Я не Дон Жуан, не валацуга, а прыстойны сем'янін... Цяпер я здраджваю не жонцы, а сабе...». Сапраўдны твар Сяргея Кірылавіча адкрываецца тады, калі ён даведаецца, што Таццяна зацяжарыла. І нават праз шмат гадоў так і не захоча пабачыць сына.

Не ўлічваючы падобныя акалічнасці, нельга зразумець як саму значнасць аўтарскай задумы, так і псіхалагічную напоўненасць аповесці. Вобраз Таццяны Каштанавай, пры ўсёй яго складанасці і нават пэўнай супярэчлівасці — ці не адзін, як мне здаецца, з найбольш цікавых жаночых вобразаў у прозе апошніх гадоў. Праблема адзіноцтва — асабліва жаночага — стаіць сёння вельмі востра. Літаратура, калі яна не замыкаецца ў надуманых канфліктах, сітуацыях, проста не мае права абыходзіць яе сваёй увагай. Л. Арабей, як паказвае яшчэ яе адна аповесць, «Фімка», пастаянна трымае гэтую жыццёвую з'яву ў полі зроку.

«Фімка» — гісторыя яшчэ аднаго жаночага лёсу, праўда, куды больш пакручастага. Гераіня аповесці — гэта ўвасабленне душэўнай чысціні і шчодрасці. І ў свае пяцьдзесят санітарка Серафіма Гаўрылаўна Мархель для большасці засталася проста Фімкай. Такое імя ёй, невысокай, рухавай, якая пастаянна рупіцца аб хворых, найбольш і падыходзіць. Фімкай была, Фімкай засталася. Жыве ў матчынай хаце, у сям'і сваёй сястры, якую ў пасляваенны час, можна сказаць, на ногі паставіла. Нават не паклапацілася, каб атрымаць пасведчанне ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

А ў яе ж таксама была свая вайна, няхай і без гераічных учынкаў. Пакутлівай ноччу, калі сястра папракнула яе ў непрыстасаванасці да жыцця, Фімка задумваецца над сваім ранейшым, партызанскім жыццём: «Не выгада, не карысць з таго, што дакумент аформіць... Нешта іншае. Жыла ж яна, усё-такі, у зямлянцы... Мыла бінты, варыла параненым паесці...» Не спалохалася семнаццацігадовая Фімка, не аб уласнай бяспецы дбала, калі ў час блакады ратавала параненых. «Для душы, для сэрца, для тых жа людзей жыла», на Перамогу, можна сказаць, працавала. У атрадзе прыйшло да яе першае і, як пазней высветлілася, апошняе каханне. На непрыкметную Фімку звярнуў увагу Ромка-падрыўнік: «У чорнай касаваротцы наросхрыст, штаны ў боты запраўленыя, дручок у руцэ, светлая, даўно не стрыжаная грыва над ілбом кучаравіцца...»

Расказваючы аб каханні Фімкі, Л. Арабей праўдзіва паказвае, як душа дзяўчыны раптоўна быццам пасля доўгага сну страпянулася, а сама яна напоўнілася спагадай да людзей. Адышлі, пачалі забывацца ранейшыя крыўды. А жыццё ж яе нялёгкае. У пачатку вайны маці выправіла Фімку да багатай цёткі ў Заходнюю Беларусь, каб неяк пракарміцца. Аднойчы немцы забралі цётчыну карову, а саму Фімку ледзь не застрэлілі. Пасля гэтага дзяўчынка і апынулася ў партызанскім атрадзе.

Была радасць, калі, здавалася, увесь свет належыць табе, і гэты ж свет нечакана стаў змрочным, калі Ромка пачаў прагульвацца з прыгожай Зінай Патапавай. Аповесць гэтая, гэтаксама, як і папярэдняя «Дзень мінулы, дзень наступны», не толькі пра адзінокіх жанчын, якія шукаюць сваё асабістае шчасце і далёка не заўсёды знаходзяць яго. Творы гэтыя і пра вайну, якая паранейшаму ўрываецца ў чалавечыя лёсы, уносячы ў іх свае жорсткія карэктывы.

Невыпадкова Таццяна Каштанава задумваецца: «Шмат пішуць пра вайну, але шмат яшчэ не сказалі... Забітыя, спаленыя, знішчаныя... Хіба толькі гэта? А скалечаныя душы, што пакіраваліся з вайны ў свет, а дзеці... Ці не скалечыць такая душа другую, толькі дакрануўшыся да яе... І колькі пакаленняў будзе несці на сабе, як пракляцце, крыж вайны?»

Аповесці «Дзень мінулы, дзень наступны» і «Фімка», паядноўваючы падзеі ўчарашнія і сённяшнія, не абмінаючы балявых момантаў у асабістым жыцці чалавека, — усё ж творы аптымістычнага гучання. І Таццяна Каштанава, і Фімка — не ахвяры лёсу. У многім ім, канечне, можна паспачуваць, але шкадаваць іх не выпадае і не трэба, бо гэта людзі моцнага, валявога характару, выразна акрэсленай жыццёвай пазіцыі. Сцвярджаючы трываласць таго маральнага пачатку, якім мацуецца спрадвечнае імкненне чалавека да шчасця, пісьменніца дасягае сінтэзу праўды жыццёвай і праўды мастацкай.

З падзеямі мінулай вайны звязана зместам і адно з лепшых апавяданняў Л. Арабей — не толькі ў новай кнізе, а і ва ўсёй творчасці пісьменніцы — «Танцуй танго...» Журналістка Вера Максімаўна прыехала ў чарговую камандзіроўку: «Гарадок быў нібыта незнаёмы чалавек, пра якога думаеш — вельмі ён на некага падобны, толькі не ўспомніш — на каго, а потым пачынаеш разумець, што гэта проста такое аблічча, блізкае табе аблічча, можа, нават земляка, чалавека з тваёй вёскі». Выканаўшы рэдакцыйнае заданне, яна вырашыла прагуляцца — балазе, заставалася не адна гадзіна вольнага часу. Неўзабаве Вера Максімаўна «ўбачыла невялікую агароджу з вузкіх штакецінак, а за ёй белую пірамідку». Словы, якія прачытала на пірамідцы, уразілі, бо прозвішча «Даніловіч Уладзімір Максімавіч» падалося знаёмым.

Заключныя старонкі апавядання напісаны ў журботна-спавядальнай танальнасці, са смуткам па загінуўшых юнаках, «хлопцах самай вялікай вайны», як сказаў пра іх Іван Навуменка. «Валодзя, Валодзя... Колькі іх, Валодзяў, было да вайны... Можа, ён... А можа, і не ён... А калі і не ён, то хіба не ўсё роўна?..

Ох, нашы хлопчыкі...

Вера Максімаўна трымалася рукамі за штакеціну — пажылая жанчына, бабка дваіх унукаў. Трымалася за штакеціну і быццам глядзела ў сваю маладосць.

І халаднела пад сэрцам.

І падступала туга».

Не часта нараджаюцца падобныя апавяданні, а калі і з'яўляюцца, дык толькі з-пад пяра аўтара вопытнага і дасведчанага, што дасканала валодае ўсімі творчымі «сакрэтамі», якія дазваляюць у, здавалася б, звычайным, нават будзённым знайсці тое, што можа стаць фактам літаратурным.

У такім плане пабудавана і апавяданне «Гульня», у якім аўтар спрабуе зазірнуць у душу гераіні, паказаць рысы яе ўнутранага свету.

У дакументальным апавяданні «Камандзіроўка за мяжу» Л. Арабей раскрывае нам некаторыя сакрэты сваёй творчай лабараторыі, расказвае пра далейшы збор матэрыялаў, якія тычацца жыцця Цёткі. Да месца нагадаць, што пісьменніца больш трыццаці гадоў настойліва ідзе шляхамі-дарогамі палымянай паэтэсы-рэвалюцыянеркі, адшукваючы пра яе ўсё новыя і новыя звесткі.

Складаныя сітуацыі маральна-этычнага плана вырашаюцца ў апавяданнях «Тося» і «Дзе канчаецца жыццё». У першым Л. Арабей даследуе псіхалогію жанчыны, сын якой раптоўна, без згоды яе падаў заяву ў загс. Увесь твор — расказ аб тым, як Тося паступова прывыкае да новай для яе ролі спачатку — свекрыві, а потым і бабулі. Тэма заслугоўвае пісьменніцкай увагі. Але, як мне здаецца, апавяданне ўсё ж не атрымалася. Аўтару не ўдалося пазбавіцца апісальніцтва, ледзьве не фатаграфавання рэчаіснасці. І ў апавяданні «Дзе канчаецца жыццё» хацелася б бачыць большае псіхалагічнае вытлумачэнне ўчынкаў персанажаў.

...Загортваючы апошнюю старонку кнігі, міжволі прыгадваеш тыя старонкі аповесці «Фімка», дзе Л. Арабей ўзнёсла-лірычна расказвае пра пачуццё, якое перажыла яе гераіня, пакахаўшы Ромку-падрыўніка. Быццам галубіным крылом кранулася дзяўчыны пяшчота. Прайшло шмат гадоў, але гэтае імгненне назаўсёды засталося ў яе памяці.

Галубінае крыло пяшчоты... Нялёгкае жыццё ў гераінь Л. Арабей, ды большасць з іх здольныя знаходзіць у ім такія прасветлена-шчымлівыя моманты, калі, не зважаючы на ўзрост і душэўныя пакуты, хочацца бачыць наўкола толькі светлае і прыгожае. Гэтая чалавечая прага паэтычнага і ўзнёслага робіць іх па-сапраўднаму прыгожымі, духоўна багатымі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК ПРЫКАЗАК

І. Шкраба, Р. Шкраба. Крынічнае слова. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987.

У гісторыі збірання і асэнсавання беларускіх прыказак самай значнай з'явай дарэвалюцыйнага часу з'яўляецца праца І. Насовіча «Зборнік беласкіх прыказак» (СПб., 1874). У адрозненне ад іншых фальклярыстаў (Я. Ляцкага, А. Сержпутоўскага, М. Федароўскага і інш.) І. Насовіч не проста падае ў алфавітнай паслядоўнасці сабраныя ім згусткі народнай мудрасці, але і раскрывае сэнс амаль кожнай прыказкі. Таму яго працу слушна лічаць першым у гісторыі ўсходнеславянскай філалогіі тлумачальным слоўнікам прыказак. У ім 3715 прыказак і прымавак.

У савецкі перыяд працягвалася збіранне і публікацыя прыказак (зборнікі Ф. Янкоўскага, П. Ахрыменкі, М. Буцько і інш.), іх тэарэтычнае асэнсаванне (працы К. Крапівы, М. Янкоўскага і інш.). У 1976 г. быў выдадзены двухтомны акадэмічны звод беларускіх прыказак і прымавак. Тут іх звыш 12 тысяч. Яны размешчаны на аснове прадметна-тэматычнага прынцыпу, іх індывідуальны сэнс не раскрываецца. Зразумела, выхад гэтага фундаментальнага зводу не ставіць кропку на далейшым збіранні і даследаванні прыказак. Па-за гэтым зводам, відаць, яшчэ засталася прыказкавая неруш, і яе трэба збіраць, адкрываць, вывучаць. Але менавіта неруш, а не тое, што ўжо адкрыта, зафіксавана. А між тым і сёння ўключаюць у новыя дыялектныя слоўнікі даўно вядомыя прыказкі, занатаваныя ў акадэмічным зводзе і ў многіх зборніках. Амаль не працуюць на папаўненне ўсенароднай прыказкавай скарбонкі і выдадзеныя два гады назад новыя зборнікі «Слова міма не ляціць» В. Ліцвінкі і Л. Царанкова, «Паслухай, што людзі кажуць» В. Рабкевіча. Нерушы тут вельмі мала. Па сутнасці, гэта «паўтарэнне пройдзенага».

Думаецца, што далейшы шлях навукі аб прыказках звязаны з яе развіццём не столькі ўшыр, колькі ўглыб. І першай ластаўкай на гэтым шляху з'яўляецца кніга І. Шкрабы і Р. Шкрабы «Крынічнае слова». Яна, як слушна сказана ў анатацыі, ні структурай, ні матэрыялам не паўтарае выданняў гэтага тыпу. Гэта першы тлумачальны слоўнік прыказак, выкарыстаных у творах мастацкай літаратуры.

Правільна выявіць, што абазначае прыказка, часцей за ўсё можна толькі ў больш шырокім кантэксце. Такімі кантэкстамі сталі для аўтараў слоўніка выбаркі з мастацкіх твораў. Гэтыя выбаркі-цытаты, прыведзеныя ў слоўніку, пераконваюць чытача ў сапраўдным існаванні пэўнага значэння, уласцівага данай прыказцы. Адначасова яны паказваюць, у якіх маўленчых абставінах выкарыстоўваецца прыказка, як і калі яе можна ўжыць. Інакш кажучы, ілюстрацыйны матэрыял у слоўніку такога тыпу мае выключна важнае значэнне, бо дае поўнае ўяўленне аб змесце і ўжыванні прыказкі. Дарэчы, у раней названым слоўніку-зборніку І. Насовіча, складзеным на аснове запісаў з жывой народнай мовы, ілюстрацыі адсутнічаюць, і гэта збядняе паказ сэнсавага зместу прыказак.

Прыказка да пары збан ваду носіць атрымала ў «Крынічным слове» такую сэнсавую і сітуацыйную характарыстыку: «Усё мае свой канец. Часам гаворыцца ў якасці асуджэння: як бы чалавек ні ўтойваў свае намеры або свае ўчынкі, усё ўрэшце выйдзе наверх». Далей у слоўнікавым артыкуле ідуць дзве ілюстрацыі-пацвярджэнні з твораў Я. Купалы і А. Жука.

Прыказкі, калі іх разглядаць з семантычнага боку, далёка не аднародныя моўныя адзінкі. І гэта паслядоўна ўлічваецца аўтарамі слоўніка. Калі прыказка мае алегарычны сэнс, г. зн. у ёй гаворыцца пра адно, а маецца на ўвазе зусім іншае, яна абавязкова тлумачыцца ў слоўніку. Дарэчы, такіх прыказак пераважная большасць. Адзін прыклад: **яблык ад яблыні далёка не падае**— «кажуць, калі станоўчыя рысы або недахопы дзяцей пераняты ад бацькоў». У другой групе прыказак няма поўнага пераасэнсавання ўсіх кампанентаў, частка слоў захоўвае сваё літаральнае значэнне, таму іх змест перадаецца з выкарыстаннем непераасэнсаваных слоў: **п'янаму мора па калена**—«п'янаму нічога не страшна». Ёсць і трэцяя група прыказак, якія ўжываюцца толькі ў прамым значэнні і таму не патрабуюць тлумачэння: **старасць—не радасць; стары друг лепш за новых двух.**

У слоўніку знаходзім нямала прыказак, якія ў сэнсавых адносінах вельмі блізкія паміж сабой ці тоесныя. На сінанімічнасць такіх прыказак паказваюць паметы «тое самае, што:» або «параўн.»; напрыклад: **з ваўкамі жыць—па-воўчы выць**—тое самае, што: **сярод варон жыўшы—варонай і каркай; не кажы гоп, пакуль не пераскочыш**—параўн. **не хваліся, ідучы на раць.**

Адлюстравана ў слоўніку і варыянтнасць прыказак. У адных выпадках, калі гэтым не парушаецца алфавітны парадак, варыянтнасць пададзена ў загалоўку слоўнікавага артыкула: **ліслівае цяля (цялятка) дзве маткі (дзвюх матак) ссе.** У другіх—праз памету «гл.»: **прыйдзе і на крапіву мароз.** Гл. **будзе і на крапіву мароз.**

Аўтары слоўніка імкнуліся пераадолець даўнюю традыцыю, практыку, характэрную для ўсіх папярэдніх парэміялагічных зборнікаў, куды побач з прыказкамі ў якасці нібыта прымавак ўключаліся тыповыя фразеалагізмы. Апошнія, як вядома, адрозніваюцца ад прыказак па ўсіх параметрах: называюць не суджэнне, а паняцце, не валодаюць ні сэнсавай, ні інтанацыйнай закончанасцю, уступаюць у сувязь са словамі свабоднага ўжывання і з'яўляюцца будаўнічым матэрыялам для сказаў. Пералічаныя асаблівасці не ўласцівы прыказкам. На жаль, і ў «Крынічнае слова» трапіла каля 30 фразеалагізмаў (давай бог ногі, з гразі ды ў князі, з плеч ды ў печ, не верыць сваім вачам, не першы год замужам, пасаліўшы можна есці, смех і грэх, чым чорт не жартуе; хто ў лес, хто па дровы і інш.).

Хочацца спадзявацца, што аўтары гэтай карыснай кнігі, у якой апісана толькі нязначная частка прыказак, што бытуюць у нашай літаратурнай мове, працягнуць збіранне фактычнага матэрыялу, каб праз нейкі час выдаць больш поўны даведнік пра моўныя самацветы.

Іван ЛЕПЕШАЎ,
прафесар Гродзенскага універсітэта.

ЁН ЗВАЎСЯ ФРАНЦЫСКАМ

Мне думаецца, што даследчыкі аказалі б самому Скарыне значна большую павагу, калі б лічыліся з сапраўдным яго гістарычным іменем, не ўпрыгожваючы гэта імя ўласнымі домысламі.

А. В. ФЛАРОЎСКІ.

Дзейнасць і асоба Францыска Скарыны заўсёды прыцягвалі пільную ўвагу даследчыкаў. Аднак і сёння, калі набліжаецца паўтысячагадовы юбілей з часу нараджэння славутага першадрукара, далёка не ўсе спрэчныя пытанні скарыназнаўства высветлены.

13 лютага гэтага года «ЛіМ» надрукаваў артыкул У. Казберука, у якім даследчык выказаў меркаванне, што сапраўднае імя Скарыны было — Францішак. Але не ўсе навукоўцы пагаджаюцца з версіяй У. Казберука. І сёння рэдакцыя штотыднёвіка прапануе чытачам пазнаёміцца з нататкамі бібліёграфа В. Дышыневіч і з артыкулам вядомага мовазнаўцы А. Жураўскага, які падагульняе размову на гэтую тэму.

У РЭСПУБЛІЦЫ вядзецца актыўная падрыхтоўка да нацыянальнага свята —500-годдзя з часу нараджэння Францыска Скарыны. У Акадэміі навук БССР распрацоўваецца рэспубліканская комплексная праграма «Францыск Скарына — вялікі беларускі асветнік-гуманіст, выдатны дзеяч славянскай культуры».

Праграма мае мэтай пашырэнне і паглыбленне фронту навуковых даследаванняў культурна-гістарычнай спадчыны Скарыны, беларускай культуры эпохі Адраджэння.

Усё гэта накладвае на даследчыкаў абавязак з пачуццём высокай грамадзянскай адказнасці аднесціся да вывучэння жыцця і дзейнасці беларускага першадрукара, старанна і аб'ектыўна даследаваць, разабрацца і асвятліць перш за ўсё факты біяграфіі славутага палачаніна. Многае ў гэтых адносінах ужо зроблена. Таму дзіўным і нечаканым выглядае імкненне некаторых даследчыкаў яшчэ раз закранаць і па-свойму тлумачыць пытанні, якія ўжо былі вырашаны раней.

Нядаўна спробу ўнесці свой уклад у скарыназнаўства зрабіў Уладзімір Казбярук, апублікаваўшы артыкул «Як усё ж звалі беларускага першадрукара?» («Літаратура і мастацтва», 13.II.1987). У артыкуле аўтар ставіць адно толькі пытанне аб «сапраўдным» імені Скарыны. Сутнасць яго разважанняў зводзіцца да таго, што ўжывальнае ў сучасных беларускіх і рускіх публікацыях пра Скарыну імя **Францыск** — памылковае і няправільнае, перавагу належыць аддаваць форме **Францішак.**

Сваё перакананне У. Казбярук імкнецца абгрунтаваць перш за ўсё моўнымі фактамі, якія ў сучасным мовазнаўстве з яго мудрагелістай тэрміналогіяй прынята адносіць або да інтралінгвістычных (унутрымоўных), або экстралінгвістычных (пазамоўных).

Аднак, на жаль, **ніводзін** з моўных фактаў, якія выкарыстовае для сваіх доказаў У. Казбярук, **не падыходзіць** для падмацавання яго думак, літаральна кожны з такіх фактаў аказаўся ў артыкуле не на сваім месцы. Артыкул паказвае, што аўтар мае даволі цьмянае ўяўленне аб такіх з'явах беларускай мовы, як цеканне, чаргаванне зычных, беглыя галосныя, і адвольна маніпулюе імі для доказу сваёй канцэпцыі.

У. Казберука яўна не задавальняе факт, што (цытуем): «У адпаведнасці з нормамі рускай арфаэпіі вучоныя вымаўлялі ўскосныя склоны скарынінскага імені «Францыска», «Францыском» як «Францыска», «Францыскам», забываючы або не ведаючы (ці проста не жадаючы прымаць пад увагу), што ў беларускай мове, у адрозненне ад рускай, «ц» перад «і» (тады яно пісалася як «и») змякчаецца. Імя «Францишек», «Франциска», «Франциском» (тыя формы, якія сустракаюцца ў самога Скарыны) сваім паходжаннем звязана з польскай мовай, а там «ц» перад «і» таксама змякчаецца».

Тут аўтар заблытаўся сам і свядома ці несвядома навязаў памылковую думку чытачам. Кожны сучасны студэнт-філолаг ведае, што беларускай мове ўласціва так званае цеканне — вымаўленне мяккага «ц» перад галоснымі пярэдняга рада «е» і «і» на месцы ранейшага «т»: **цела, цень, ціха** (у рускай мове цекання няма, таму там пішацца і вымаўляецца **тело, тень, тихо**). Таму ж студэнту вядома, што этымалагічны (спрадвечны) гук «ц» (які не паходзіць з «т») і ў беларускай, і ў рускай мовах зацвярдзеў і ў абедзвюх мовах вымаўляецца аднолькава цвёрда. У беларускай мове, дзе асноўным з'яўляецца фанетычны прынцып правапісу, цвёрдае вымаўленне «ц» перадаецца на пісьме, тады як у рускай мове з яе традыцыйным гісторыка-этымалагічным прынцыпам правапісу цвёрдае вымаўленне такога «ц» на пісьме не абазначаецца. У рускіх словах **целить, целый, цеп** і беларускіх **цэліць, цэлы, цэп** аднолькава вымаўляецца цвёрды гук «ц». Гэта адносіцца асабліва да запазычаных слоў. Рускія **ценз, центр, цех, цинк, цирк** і беларускія **цэнз, цэнтр, цэх, цынк, цырк** таксама не маюць ніякіх адрозненняў у вымаўленні. Імя «Францыск» як запазычанае не толькі ў беларускай, але і ў рускай мове вымаўляецца як **Францыск**, і падазраваць тут якую-небудзь «лукавую тенденцыю» з боку рускіх аўтараў няма падстаў.

У адпаведнасці з гэтай агульнай для беларускай і рускай моў заканамернасцю ненатуральным было б вымаўленне ў беларускай мове скарынінскіх форм **Францишек, Франциска, Франциском** як **Францішак, Францыска, Францыскам.** Скарынінскую форму **Францишек** няма падстаў атаясамліваць з сучаснай польскай формай Franciszek. Вымаўлялася гэта форма ўжо ў часы Скарыны несумненна з цвёрдым «ц», таму на сучаснае беларускае пісьмо яе можна транскрыбіраваць як **Францышак.** У карысць такога меркавання сведчаць запісы імя Скарыны ў тагачасных актавых дакументах, дзе фанетычны прынцып правапісу прабіў сабе дарогу раней, чым у рэлігійнай пісьменнасці, да якой і адносяцца ўсе выданні Скарыны. Буйнейшы даследчык жыцця і дзейнасці Скарыны П. У. Уладзіміраў у сваёй манаграфіі «Доктор Франциск Скорина, его переводы, печатные издания и язык» (СПб, 1888) прыводзіць актавыя матэрыялы з Літоўскай метрыкі 1529 г., дзе запісана судовая справа Скарыны (У. Казбярук аб гэтых запісах нічога не гаворыць, бо яны не пацвярджаюць яго меркаванні). Тут імя Скарыны зафіксавана 8 разоў: у форме назоўнага склону **Францышко** — 1 раз, у форме роднага склону **Францышка** — 5 разоў і ў форме давальнага склону **Францышку** — 2 разы. У судовых запісах 1535 г. імя Скарыны таксама зафіксавана ў форме **Францышко.** Усё гэта сведчыць, што ўжо ў часы Скарыны яго імя вымаўлялася з цвёрдым «ц». Калі б

Пытанне зусім не простае...

Якім было імя Скарыны? — гэта адно са складаных пытанняў скарыназнаўства, і яго нельга звесці толькі да лінгвістычных пошукаў у адносінах да імя Францыск. Вядома, што Скарына нарадзіўся ў праваслаўным Полацку, што продкі яго мелі праваслаўныя імёны. З гэтага вынікае, што і ў яго першапачаткова было іншае імя, бо праваслаўнага імя Францыск няма.

Пытанне аб праваслаўным імені не фармальнае, бо ў імені чалавека, асабліва мінулых стагоддзяў, яго нацыянальныя культурныя карані. Беларускі вучоны быў цесна звязаны з традыцыямі роднага народа, які шмат стагоддзяў трымаўся праваслаўя і змагаўся за яго захаванне ва ўмовах прыцяснення з боку рымска-каталіцкай царквы. Выданні Скарыны задуманы і надрукаваны менавіта ў адпаведнасці з вострымі патрэбамі часу дзеля духоўнага і маральнага ўмацавання «люду простага паспалітага» праваслаўнай Беларусі.

На праваслаўныя характар і арыентацыю выданняў Скарыны звярнулі ўвагу ў XIX ст. В. Віктараў, вядомы даследчык П. Уладзіміраў, пазней акадэмік Я. Карскі. Гэта пацвярджае і зроблены намі тэксталагічны аналіз прадмоў Скарыны («Весці АН БССР». Серыя грамадскіх навук. 1985, № 3), і сам склад выдадзеных ім кніг: у скарынінскіх прадмовах да Бібліі выкарыстаны творы ўсходняй патрыстыкі, даводзяцца хрысціянскія догматы без пазнейшых каталіцкіх дапаўненняў, «Малая падарожная кніжка» ўяўляе сабою зборнік адпаведных богаслужэбных тэкстаў, у ёй змешчаны праваслаўны «Сімвал веры», ёсць малітва «за праваслаўных хрысціян» без абавязковага для каталікаў і уніятаў упамінання імя папы рымскага, дадзены «Месяцаслоў» з імёнамі праваслаўных святых. Змест яе сведчыць аб добрым веданні самой традыцыі складання праваслаўных царкоўных кніг (па сутнасці гэта традыцыйны Псалтыр з наследаваннем). У перакладзе Бібліі адчуваецца глыбокае веданне і выкарыстанне славянскіх спісаў ад часоў Мяфодзія і Кірылы.

Сувязь Скарыны са славянскай кніжнай традыцыяй — менавіта ў ягоным паходжанні з Полацка, які быў апорай праваслаўя на Захадзе і ў гэтым сэнсе меў нават прывілеі ў Вялікім княстве Літоўскім. Тут знаходзіліся і славутыя бібліятэкі Полацкага праваслаўнага Сафійскага сабора і Прадцечанскага манастыра. Каталіцкая місія бернардзінцаў толькі з'явілася ў Полацку і вяла сябе талерантна: ад пераходзячых у каталіцтва праваслаўных яшчэ не патрабавалася перахрышчвацца, захоўвалася права на праваслаўнае прычашчэнне і абрады. Гэта адпавядала патрэбам тых нямногіх палачан, што ў мэтах кантактаў з Захадам прымалі каталіцтва. Таму верагоднай здаецца версія польскага даследчыка Кантака, што сям'я полацкага купца Скарыны прыняла каталіцтва. Гісторыя захавала праваслаўныя імёны бацькі і брата першадрукара — Лука і Іван. Якое імя на-

Да 500-годдзя з дня нараджэння Францыска СКАРЫНЫ

у формах **Францишек, Франциска, Франциском** спалучэнне «ци» вымаўлялася як «ці», дык Скарына згодна з правіламі тагачаснага правапісу пісаў бы **Франтишек, Франтиска, Франтиском**, як паслядоўна пісаў ён у сваіх выданнях словы тыпу **тина, тиновый, тиснути, тихий, тихо, тихость, тише**, дзе сапраўды вымаўлялася «ці» (гл. Слоўнік мовы Скарыны, т. 2, Мн., 1984, с. 280).

У варыянце **Франциско**, ужытым у тэксце прадмовы да «Першай кнігі Царстваў», У. Казбярук схільны бачыць уплыў італьянскай мовы, у якой ёсць імя **Франчэско**. Можна сцвярджаць, аднак, што мова Дантэ тут ні пры чым: **Франциско** — гэта той жа **Франциск**, дзе фанетычна з'явілася «о» з-за імкнення пазбавіцца ад збегу зычных у канцы асновы. У старабеларускай мове гэта з'ява закранула і іншыя імёны аднатыпнай структуры (гл. М. А. Жыдовіч. Назоўнік у беларускай мове. Мн., 1969, с. 46, 47). У тагачасных пісьмовых помніках зафіксаваны напісанні **Александр** і **Александро, Карп** і **Карпо, Марк** і **Марко, Петр** і **Петро** і інш.

Адносна варыянта **Франциско** У. Казбярук заўважае, што «гэтая форма не пярэчыць і нормам беларускай гутарковай мовы, у якой і сёння можна сустрэць імёны **Адамко, Ігнатко, Янко, Яначко, Янка**». Зноў-такі гэтыя прыклады няўдалыя для параўнання, бо пералічаныя формы па паходжанню адносяцца да памяншальна-ласкальных, утвораных пры дапамозе суфікса «-к-» (ад **Адам, Ігнат, Ян**), тады як у форме **Франциско** такога суфікса няма, яно складаецца з асновы **Франциск** (лац. Franciscus) і канчатка «-о-» фанетычнага паходжання.

Маніпулюе У. Казбярук і моўнымі фактамі, якія можна было б аднесці да адкрыццяў у мовазнаўстве, калі б такія факты існавалі ў сапраўднасці. Аўтар артыкула лічыць, што формы **Францишек, Франциска** і **Франциском** — гэта проста розныя склонавыя формы аднаго і таго ж імя **Францишек**, яны адрозніваюцца толькі чаргаваннем зычных і характарам беглых галосных. У сувязі з гэтым прыходзіцца заўважыць, што з форм **Франциска** і **Франциском** ніякія беглыя галосныя нікуды збегчы не маглі па той простай прычыне, што іх тут ніколі не было (зыходная тут лацінская форма Franciscus, дзе ў спалучэнні «sc» галоснага няма). Адрозненне паміж формай **Францишек**, з аднаго боку, і формамі **Франциска** і **Франциском** — з другога, У. Казбярук бачыць у чаргаванні зычнага «ш» з зычным «с». Па перакананню аўтара, тут быццам бы такое ж чаргаванне, як у формах **страха — стрэшка — на страсе, скошаны — касіць — касьба**. Ніводная з прыведзеных тут шасці форм не можа служыць доказам у карысць меркавання У. Казберука.

Не з'яўляецца пераканаўчай у карысць формы **Францішак** і спасылка У. Казберука на тое, што польскія аўтары ў розныя часы, пачынаючы ад Шымана Старавольскага ў XVII ст., ужываюць форму Franciszek. Але кніга Старавольскага, дзе ёсць упамінанне аб Скарыне, упершыню была выдадзена ў 1625 г. на лацінскай мове, палацінску яна была перавыдадзена ў 1627 і 1734 гг., і толькі ў 1970 г. праца Старавольскага з'явілася ў перакладзе на польскую мову. Напэўна, гэта апошняе выданне і бачыў У. Казбярук, дзе імя Скарыны, натуральна, пададзена ў польскай форме Franciszek. У ранейшых жа выданнях на лацінскай мове яно, несумненна, было напісана па-лацінску ў выглядзе Franciscus.

Адстойваючы польскі варыянт імя Скарыны, У. Казбярук не ўлічвае, што ў скарынаназнаўстве склалася практыка, згодна з якой замежныя аўтары імя Скарыны звычайна прыводзяць у форме, уласцівай іх мове. Так, англічане для імя Скарыны ўжываюць форму Francis, італьянцы—Francesko, немцы — Franz , французы — François, чэхі — František. Нашы літоўскія калегі пішуць пасвойму Franciškus або Pranciškus. У святле гэтых фактаў ніколі не павінна здзіўляць, што і польскія аўтары імя Скарыны падаюць у сваёй нацыянальнай форме Franciszek.

Неапраўданасць ужывання формы **Францыск** У. Казбярук бачыць і ў тым, што «форма «Францыск» ні ў адной з тых моў, якімі карыстаўся Скарына, не ўжывалася». Аўтар артыкула не ўлічвае пры гэтым, што ў дакументах на лацінскай мове Скарына неаднаразова быў запісаны як Franciscus, старабеларускім адпаведнікам гэтай лацінскай формы якраз і з'яўляецца форма **Францыск**. Ужо ў часы Скарыны і пазней у беларускую мову пачалі пранікаць лацінізмы на -us тыпу apparatus, articulus, versus, defectus, legatus, якія на беларускай глебе адаптаваліся ў выглядзе **апаратъ, артыкулъ, вершъ, дефектъ, легатъ**. У дакументах рознага часу на лацінскай мове імя Скарыны Franciscus зафіксавана больш як 30 разоў, і гэта дае падставу заключыць, што лацінская форма гэтага імя была асноўнай для самога Скарыны. Цікава адзначыць, што ў грамаце на лацінскай мове польскага караля Сігізмунда I ад 21 лістапада 1532 г. упамінаецца пляменнік Скарыны Romanus Skorina, які цяпер у беларускім напісанні вядомы як **Раман** Скарына. Падобным жа чынам трансфармуецца на беларускі лад і імя Скарыны Franciscus— **Францыск**.

У карысць варыянта **Францішак** У. Казбярук спасылаецца і на такі факт, што аўтара «Песні пра зубра» мы называем па-сучаснаму **Мікола** Гусоўскі, хаця сам ён падпісваўся Nicolaus Hussoviensis. Пры такой «аргументацыі» для Гусоўскага можна было б ужываць і больш інтымную форму **Коля**, паколькі такі гукавы комплекс прысутнічае ў складзе лацінізаванай формы Nicolaus. Але ці правамерна сучасныя формы імён прыпісваць старажытным аўтарам, літаратурным, дзяржаўным і рэлігійным дзеячам, якія пакінулі пэўны след у гісторыі Беларусі? Цяпер цяжка вызначыць, хто ў беларускім літаратуразнаўстве першым пачаў пісаць **Мікола** Гусоўскі, але з упэўненасцю можна сцвярджаць, што так пачаў пісаць чалавек, мала дасведчаны ў старабеларускім анамастыконе. Старабеларуская пісьменнасць зусім не ведае формы **Мікола**. Даследчык беларускіх імён М. В. Бірыла ў вывучаным ім старажытным актавым матэрыяле выявіў 293 напісанні **Миколай**, 8—**Микула**, 7—**Миклаш**, 3—**Николай** і ніводнага **Миколы**.

Для ўстанаўлення сапраўднага імя Гусоўскага трэба прыняць пад увагу, што сваё свядомае творчае жыццё ён правёў у польскім культурным акружэнні, дзе ў той час у афіцыяльным ужытку форма **Мікола** таксама не ўжывалася.

Абураецца У. Казбярук і спробай іншых даследчыкаў выводзіць зыходную форму імя Скарыны з форм ускосных склонаў. «З якіх пор, — ускліквае ён, — пры вызначэнні асноўнай, зыходнай, «изначальной» формы слова назоўны склон не ўлічваецца, адкідаецца, а бяруцца за аснову ўскосныя?». Адказаць на гэта пытанне можна вельмі проста: з тых пор, калі ўзнікла мовазнаўства як навука. Каб пераканаць У. Казберука, што вызначэнне зыходнай формы па формах ускосных склонаў цалкам правамерна, спашлёмся на самы свежы факт. Даследчыкам Скарыны, у тым ліку і У. Казберуку, вядома, што ў скарынаназнаўстве доўгі час адно з выданняў нашага першадрукара мела назву «Малая падарожная кніжыца». Такая назва, упершыню ўведзеная, здаецца, П. У. Уладзіміравым, захоўвалася да самага апошняга часу. І толькі зусім нядаўна, калі даследчыкі пачалі самастойна знаёміцца з гэтым выданнем Скарыны непасрэдна па арыгіналу, знайшлі там фразу, якая дазволіла больш дакладна вызначыць назву кнігі: «Писаныи речи в сей малой подорожной книжце по ряду кратце положены суть». Форма меснага склону **книжце** гэтай фразы дае падставу выводзіць форму назоўнага склону **книжка, а не книжица**, як лічылася раней.

Артыкул У. Казберука не пазбаўлены і некаторых недакладнасцей фактычнага парадку. Зусім недаравальна ў наш час прытрымлівацца погляду, што «Псалтыр» (у складзе «Малой падарожнай кніжкі») быў выдадзены ў 1525 г., як гэта двойчы адзначаецца ў артыкуле. Сучасныя даследчыкі ведаюць, што «Малая падарожная кніжка» была выдадзена не пазней 1522 г. У навуковай літаратуры з пачатку 70-х гадоў была прыведзена пераканаўчая аргументацыя ў карысць такога датавання, паўтараць тут яе няма неабходнасці.

У. Казбярук у сваім артыкуле спыняецца і на гісторыі ўжывання розных форм імя Скарыны, якога калісьці звалі па-рознаму: і **Францішкам**, і **Францыскам**, і **Георгіем**, і нават **Юрыем** (дарэчы, сам У. Казбярук у артыкуле «Беларускі першадрукар», апублікаваным у 1960 г., таксама называў Скарыну **Георгіем**). Але і тут аўтар недакладны ў фактах і храналогіі. Па-першае, імя **Георгій** у беларускім друку распаўсюдзілася не ў паслякастрычніцкі перыяд, як сцвярджае У. Казбярук, а толькі пасля другой сусветнай вайны (дакладней — з 1944 года). Падругое, беспадстаўнасць ужывання імя **Георгій** была паказана не ў другой палавіне 60-х гадоў, як лічыць аўтар, а яшчэ ў 1925 г. польскім гісторыкам Г. Лаўмянскім.

У. Казбярук ставіць пад сумненне правамернасць пастановы бюро Аддзялення грамадскіх навук АН БССР 1967 года, калі было прынята рашэнне ўжываць для Скарыны імя Францыск. Гэта пастанова сапраўды заслугоўвае папроку, але не за ўзаконенне імя Францыск, а толькі за тое, што тады пастанавілі пры поўным найменні Скарыны пісаць «Францыск (Георгій) Скарына». Імя Георгій у дужках яшчэ і цяпер красуецца на шыльдзе друкарні акадэмічнага выдавецтва «Навука і тэхніка»; захоўваецца яно і ў выхадных даных кожнай кнігі, якая выходзіць з гэтага выдавецтва. Такое імя ўставілі тады ў дужкі па дамаганні акадэміка АН БССР В. А. Сярбенты, які ў час дыскусіі па гэтым пытанні запэўніваў членаў бюро, быццам у дакументах Кракаўскага універсітэта, дзе калісьці вучыўся Скарына, ён запісаны з імем Георгій. Цяпер у гэту версію ніхто ўсур'ёз не верыць.

Нельга не пагадзіцца з У. Казберуком, калі ён піша, што канчаткова вырашыць пытанне аб імені Скарыны можна толькі з улікам публікацый першадрукара. Заўвага зусім слушная, і тут мы паспрабуем разабрацца ў гэтым.

Імя Скарыны, як і кожнага іншага чалавека, старажытнага і сучаснага, несумненна, на практыцы мела некалькі фанетыка-словаўтваральных форм, кожная з якіх ужывалася ў адпаведных жыццёвых абставінах. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць факт, што зафіксаваная ў судовых запісах форма Францышко не супадае з тымі формамі, якія прадстаўлены ў скарынінскіх друкаваных кнігах. Напэўна, гэта была сямейна-бытавая форма, якую для Скарыны ўжывалі яго сваякі і блізкія. Як відаць з кнігі М. В. Бірылы «Беларуская антрапанімія», у старабеларускай актавай пісьменнасці зафіксаваны вялікія гнёзды афіцыяльных, размоўных і эмацыянальнаацэначных форм імён: Григорий, Григор, Григорко, Гридя, Гридко, Гриша, Гришко, Гришук, Гринь, Гринько, Гринец, Гринаш, Гринашко, Грись, Гриц, Грицко. Грицук; Михаил, Михайло, Михал, Михалко, Мишко, Мисько, Михно, Мишура, Мись. З гэтага можна заключыць, што і імя Скарыны мела больш варыянтаў, чым гэта знайшло адлюстраванне ў пісьменнасці.

Мы ж павінны перш за ўсё прыняць пад увагу форму імя Скарыны ў яго выданнях, бо іменна тут выражана аўтарская воля выдаўца.

З зафіксаваных 63 форм роднага склону **Франциска** і 48 форм творнага склону **Франциском** лягчэй за ўсё выводзіцца зыходная форма назоўнага склону **Франциск**, якая да таго ж з'яўляецца дакладным беларускім адпаведнікам лацінскага Franciscus. Гэта лацінская форма ў дакументах суправаджала ўсю творчую біяграфію Скарыны.

Разгледжаны вышэй матэрыял паказвае, што гістарычным іменем Скарыны з'яўляецца менавіта гэтая форма — Францыск. Як нам адносіцца да імя Скарыны — добра сказаў іншы аўтар словамі, якія мы змясцілі эпіграфам да гэтага артыкула.

Аркадзь ЖУРАЎСКІ,
член-карэспандэнт
АН БССР.

быў ён сам у праваслаўным хрышчэнні ў маленстве, дакладна невядома. Сваё другое імя — Францыск — падлетак мог атрымаць ад бернардзінцаў, што і дапамагло яму набыць веды ў латыні і вучыцца пазней у заходніх каталіцкіх універсітэтах.

Але адкуль з'явілася ў творах мастацкай літаратуры, у навуковых працах, у кінафільме і нават на помніку ў Полацку імя Георгій? П. Уладзіміраў у сваёй вядомай манаграфіі 1888 года піша: «Скарына па акту XVI ст. называецца другім імем Георгій». Звесткі ўзяты даследчыкам са зборніка М. Круповіча «Собрание государственных и частных актов Виленской археологической комиссии» (1868, ч. 1), дзе змешчаны граматы караля Жыгімонта (Сігізмунда I). У адносінах да Скарыны ў адным месцы напісана «Georgij Franciscij Scorina» — Георгій Францыск Скарына. Гэта дало падставу лічыць першым імем вучонага Георгій. У 1925 г. польскі гісторык Г. Лаўмянскі выказаў думку, што перапісчык граматы зрабіў памылку, напісаўшы замест «egregium» (выдатны, вельмі шаноўны) «Georgij», бо нідзе болей гэта імя не сустракаецца. Такі «колькасны» падыход быў прыняты далёка не ўсімі даследчыкамі і шмат гадоў пісалі два імені. Гэта было замацавана ў 1967 г. пастановай бюро аддзялення грамадскіх навук АН БССР — пісаць пры поўным найменні Францыск (Георгій) Скарына, пры скарочаным — Францыск. Апошнія дзесяць гадоў вучоныя ў сваіх працах пішуць адно імя — Францыск. Аргумент — «няхай будзе так, як у кнігах Скарыны»...

Версію аб імені Георгій у 1978 г. зноў праверыў М. М. Уляхін (рукапіс у архіве МДА). Ён звярнуў увагу на тое, што прыметнік «egregium» стаіць у грамаце не адразу перад імем «Franciscum», а разам з другім прыметнікам «famatum» (слаўны) — egregium et famatum Franciscum Scorina» і напісаны, як і «famatum», з малой літары, у той час, як у другой грамаце «Georgij» стаіць адразу перад «Franciscij» і напісаны з вялікай літары, як і другія імёны (прычым адназначна) — «Georgij», а не «georgii», як чамусьці піша Казбярук). Аўтар лічыць, што былі два імені Георгій і Францыск, і яны змешчаны ў грамаце ў сувязі з яе асаблівай важнасцю, бо яна рабіла Скарыну падуладным толькі каралю і незалежным ад другіх улад і сцвярджала ягоныя правы як для Полацка, дзе яго ведалі з маленства як Георгія і дзе была маёмасць яго родных, так і для Вялікага княства Літоўскага і замежных краін — як доктара Францыска Скарыны. Сваю версію аб імені Георгій ён падмацоўвае вядомай гіпотэзай М. Шчакаціхіна: Скарына нарадзіўся ў дзень сонечнага зацьмення і таму на яго асабістым знаку («гербе») выява спалучанага сонца і месяца. Ён зверыў дату зацьмення 6(21) сакавіка 1486 г. з праваслаўным календаром («святцамі») і знайшоў, што ў гэты дзень адзначаецца памяць святога Георгія Амастрыцкага, а значыцца, Скарыне маглі даць менавіта імя Георгій, бо праваслаўныя ў тыя часы давалі імёны па «святцах», па дню, у які нарадзілася дзіця або яго хрысцілі.

Імя Георгій застаецца ў навуцы як гіпотэза, якая дакументальна ў друку не адкінута. Можа, было і іншае імя. Патрэбен пошук, таму, мусіць, А. Мальдзіс на пытанне: «якім жа ўсё ж такі было першае праваслаўнае імя Скарыны?» адказаў у час Скарынінскіх чытанняў: «Гэта мы будзем ведаць, калі знойдзем метрычны запіс».

За апошні час пачала чамусьці распаўсюджвацца думка, што імя Францішак больш беларускае, чым Георгій. Спасылаюцца на імя Багушэвіча, які жыў у XIX ст., калі ў Беларусі было ўжо шмат каталікоў і адпаведных імёнаў, што не мае ніякага дачынення да жыхароў Полацка часоў Скарыны. Паэт Генадзь Бураўкін нават так гаворыць ад імя першадрукара ў паэме «Ленін думае пра Беларусь»: «Ты мне, мой горад, даруй, што ціхае імя Францішак я памяняў на нянаскае, гучнае імя Георгій» (!). Між тым вядома, што па сваім паходжанні абодва імёны не славянскія, не беларускія. Георгій — імя хрысціянскага пакутніка IV ст. Георгія Пераможцы, якое атрымала на славянскай глебе свой варыянт «Юрый». Імя каталіцкага святога XII ст. Францыска Асізскага з'явілася на Беларусі значна пазней. Назваць імя Георгій — Юрый (Юрась, Юрачка) «нянаскім» няма ніякай падставы.

Паўстае пытанне, чаму Скарына ў сваіх выданнях так падкрэслівае шляхам настойлівага паўтору імя Францыск і годнасць «доктар»? Тут, мусіць, варта падумаць над версіяй Уляхіна, што першадрукар робіць гэта ў мэтах абароны сваіх кніг і выдавецкай справы ва ўмовах вострай канфесійнай барацьбы: ён свядома падкрэслівае сваю незалежнасць ад праваслаўнай царквы — я вучоны, самастойны выдаўца! Да таго ж Скарына ведаў лёс кракаўскага першадрукара Ш. Фіёля, які выдаў у 1491 г. славянскія кнігі для праваслаўных і трапіў у рукі інквізіцыі. Версія верагодная, бо і сам Скарына не закончыў сваю справу і мусіў эмігрываць з Вільні ў Прагу.

Гіпотэзы розныя, але наша мэта — напомніць аб існаванні ў Скарыны першага імені, каб у захапленні лінгвістычнымі пошукамі наконт напісання Францыск ці Францішак не адбылося часам скажэння біяграфіі першадрукара.

Што датычыцца націску ў слове Скарына, то яго змена адбылася ў 1977 г. на прысвечаных Скарыне «Фёдараўскіх чытаннях» ў Маскве. Вядомы знаўца старажытнай гравюры і кнігі рускі акадэмік А. Сідараў у сваім апошнім выступленні палымяна ўшанаваў памяць Францыска Скарыны, падкрэсліў яго еўрапейскае значэнне і папрасіў дакладчыкаў з Беларусі гаварыць не «па-хатняму» Скарынá, а Скарына ў адпаведнасці з лацінскім гучаннем прозвішча. Тады і згадзіліся на гэты лацінізаваны варыянт. Думаецца, варта і далей ужываць адзін, а не падвойны націск, як гэта прапануе Казбярук. А вось што трэба змяніць, дык гэта надпіс на помніку Францыску Скарыне ў Полацку: трэба даць яго на беларускай мове, на той мове, якую так любіў, шанаваў і лічыў роднай наш слаўны першадрукар, гуманіст і патрыёт.

В. ДЫШЫНЕВІЧ,
бібліёграф.

ПАЭЗІЯ

Валянцін ТАРАС



Звычайна ў газеце даты пад вершамі не ставяцца. У гэтай жа падборцы без дат не абысціся, бо некаторыя з вершаў былі напісаны яшчэ ў сямідзесятыя гады. Перачытаў іх цяпер. Падалося, што яны маюць права на жыццё. Нічога ў іх не папраўляў, толькі пераклаў на беларускую мову, — пісаліся яны па-руску. Прапаную іх увазе чытача разам з новымі, нядаўнімі.

Аўтар.

●

Цячэ рака ў абдымках дамбы.
Бруіцца плынь між берагоў,
нібы засмучаныя ямбы
паўнюткіх роздуму радкоў.

Навошта ж дамба? Недарэчна.
Пагрозы не відаць ані.
Такая сцішаная рэчка
ў такой лагоднай цішыні!

Шэпт хваляў цешыць і лагодзіць,
як лад лірычнага радка...

Ды ты забыўся пра разводдзе,
калі мяняецца рака

і, адпусціўшы цуглі хвалям—
сваім грывастым скакунам,—
віруе і заслоны валіць,
лоб разбівае валунам.

Стаў шэпт лагоды гулам грозным,
падобным водгуллю гармат,
нібыта шэпт,
чый горкі роздум
ператвараецца ў набат.

Салодкагучнасць знікла з ямба—
бунтуюць вольныя радкі!
Дык вось чаму над рэчкай—дамба,
над вершамі—вартаўнікі...
1972

Адплата

Быў повен бескарыслівых намераў,
імкнуўся жыць, як кодэксы вучылі,—
я верыў ім!
Ды мне ніхто не верыў.
Праўдзівым быў—манюкаю лічылі.

Прыйшлося мне іначай жыць вучыцца.
Пераканаўся ўрэшце я, што людзі
не любяць праўды, верацъ небылічам,
адмовіцца не хочуць ад ілюзій.

Што толькі раздражняюць іх пытанні—
ім падавай гатовыя адказы,
што ісціна пры ўсім маім стараанні
ў вачах людзей—
бяздоказныя фразы.

І стаў я прыстасоўвацца патроху,
стаў выдумляць я суцяшэнні людзям,
і стала грошай, што таго гароху,
і пірагі з'явіліся на блюдзе.

Няма чаго мне наракаць на бога:
як той казаў, і сыты, і абуты.
Але чаму гняце мяне трывога?
Чаму прыйшлі бяссонніцы пакуты?

І ў горла пірагі даўно не лезуць,
не цешыць тое, што ў ашчаднай скрыні,
і, нібы па пякельнаму жалезу,
па пратаптанай я іду сцяжыне...
1979

ДЭБЮТ

Юрый КІСЯЛЕЎСКІ

Шукаючы для сэрца асалоды

Юрый Кісялеўскі нарадзіўся і вырас у Гродне. Яму тут добра, яму не хочацца ўцякаць ад стомы ў лес, ды ён яшчэ не стаміўся. Ён гарадскі па натуры, і мова яго вершаў гарадская, мова інтэлігента, мова прачытаных кніг.

«А я блакіт малюю неба ў прасторы ўласнае душы» — гэта не скарга на гарадскую цеснату, а захапленне горадам.

Неяк сказала яму, што ў горадзе, дзе яго ведаюць усе гарадскія звяркі, у ягоным узросце вершы можна складаць у хадзе па завулках, а ён запярэчыў, што ў ягоным выпадку гэты спосаб, відаць, не прыдатны, таму што імкнецца як мага дакладней выказаць скупым словам думку без лішняга эстэцтва. А гэта патрабуе засяроджанасці... І прыгадаўся Максім Багдановіч, яго споведзь у лісце ў альманах «Маладая Беларусь» ад 27 лістапада 1911 года: «Апрыч таго, фактам з'яўлення іх хацеў я давесці здатнасць нашай мовы да самых строгіх вымог вяршоўнай формы, бо я ім задавальняў нават у драбніцах, іншы раз вельмі цяжкіх....» Усе пошукі ў Юрыя Кісялеўскага наперадзе, але выбраў ён харошы кірунак — птушыную дарогу Максіма Багдановіча. У перакладчыцкіх спробах — таксама. Нават любімыя паэты ў іх адны. Юрый таксама першым назаве П. Верлена, якога так дасканала пераклаў Максім Багдановіч. Але Юрый спрабуе перакладаць і Кіплінга, Гейнэ, Катула, Тувіма... Імкнецца наблізіцца да арыгінала, шукае магчымасці нічога не згубіць, яшчэ і высветліць дэталі.

Любімыя вершы Юрый чытае па памяці з апрайданнем: «Гэта і мая філасофія...» У ім увасоблена тая шчаслівая ява, калі чытаецца ўсё, вартае густу інтэлігента. А размаўляць з ім добра яшчэ і таму, што па натуры мяккі, уважлівы. Ствараецца ўражанне, што ён няздольны крыўдзіць, але сябра яго жартаваў, што Кісялеўскі ставіць «неуды» нават прыгожым студэнткам. Ён выкладае біяхімію ў Гродзенскім медінстытуце, які сам скончыў два гады таму назад, займаецца навуковымі даследаваннямі. Наведвае беларускі клуб «Паходня», дзе ўдасканальвае веданне роднай гісторыі і дзе мы і спаткаліся.

Пакуль што 26-гадовы малады паэт вядомы толькі чытачам «Гродненской правды» і наваполацкага «Химика».

З ахвотаю благаслаўляю Юрыя Кісялеўскага на адчайны крок у штотыднёвік «Літаратура і мастацтва».

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА.

Родная Беларусі

Цябе малююць з прагнай асалодай
Такой прыгожай, лялечнай падчас...
Табе ж не трэба штучнай пазалоты
І грому не патрэбна гучных фраз.

Ты не дзівосны кут, ты край звычайны,
Твой сціплы від не вабіць знатакоў.
Твая гісторыя не рве і не злучае
Прастор зямель і бурны ход вякоў.

Была не раз на ратным бездарожжы.
І процьма бед лунала над табой —
Ты заставалася заўжды непераможнай,
Маўклівай, працавітай і жывой.

Такой цябе згадаю я скрозь слёзы
Праз безліч год, з любой далечыні.
О, Беларусь! Палеткі ды бярозы,
Ды сінь вачэй, ды сонца ў вышыні.

Зоркі лёсу

Калі зорка знікае з нябёс,
Што так доўга і ярка гарэла,—
Пэўна, недзе скалечаны лёс,
Або смерці крыло прашумела.

Пэўна, дзесьці на краі зямлі,
На акрайцы бязмежнага свету
Кветкі выбухаў зноў расцвілі
І ляцяць каршунамі ракеты.

З аксаміту начной чысціні
Ні адна з гэтых зорак-бурштынаў
Не пакіне сваёй вышыні,
Не пагасне яна без прычыны.

●

Даруйце, людзі, слабасці маёй —
Што з вашаю пакорай не спрачаўся,
Не біўся з дагаджаннем і маной,
Што сам хлусіў, хістаўся і вагаўся.

Бездапаможнай сціпласці маёй,
Маёй нядужасці, нясмеласці — даруйце!
Даруйце, што не здолеў я сцяной
Стаць на шляху атрутнай каламуці.

Павінен быў ні ў чым не патураць,
Не патакаць ліслівасці і згодзе,
Павінен быў пярэчыць і крычаць,
Што хам ёсць хам, што злодзей —
гэта злодзей.

За свой бяскрылы, стрыманы парыў
Цяпер нясу належную расплату.
Недасканалы свет і я расціў.
Балюча мне, што ў гэтым вінаваты.

Кастрычнік

Кастрычнік радасна малюе краявіды:
Палеткі бурныя і рыжыя сады,
І дымам вогнішчаў далёкіх перавіты
Грабеньчык на гары — сасонік малады.

Абмаквае, мастак, старанна і руплива
Ён дрэвы цэлыя ў блакітныя стаўкі,
Выводзіць пэндзлямі адценні, пералівы
І воблак залаціць бялюткі, трапяткі.

Паклоннік чыстых фарбаў, класік
прававерны,
З палітраю карпіць нястомна
з году ў год.
Не зменіць нізашто ён творчае манеры,
Не спыніць нізашто стваральны светлы
ўзлёт.

Такая цішыня на гэтым вернісажы!
І аж да той пары, пакуль яшчэ відно.
Спыняюць бег свой людзі і глядзяць
уважна
На бессмяротны твор, жывое палатно.

Да закаханых

Належыць сёння свет вам, чарадзейны
свет,
Клянуся месяцам і небам неаднойчы!
Стракочуць конікі, і тае неўпрыкмет
Дыханне вашае ў павевах зорнай ночы.

Таемна ззяе над ракою Млечны Шлях;
У лазняку схаваўся ліпень дзіўным
гномам.
Лунае над зямлёй цягучы п'яны пах
Перастаялых траў і кветак невядомых.

Арган прыроды піянісіма гучыць.
Мелодыя пяшчоты ў цемры праплывае.
Дык кіньце кветку ёй, той ночы,
хай звініць!
Для вас адных яна так хораша спявае.

●

Да цябе іду я ў госці, бо гарыць
твой пацалунак
На шчацэ маёй збялелай, пацалунак
летніх дзён.
У партфелі — кніжкі, сшыткі і цукеркі
ў пачастунак,
Снег рыпіць, блішчыць, іскрыцца,
быццам радуецца ён.

У тваёй кватэры пуста, у тваёй кватэры
гулка.
Чырванею, быццам школьнік, штосьці
мямлю наўздагад;
Голас твой такі халодны, як мяцеліца
ў завулку,
Ем ды ем твае цукеркі і смяюся
неўпапад.

Ты глядзіш крадком на шафу,
на гадзіннік прыхаваны;
Падымаюся, хоць горка, адзінока
стала мне.
Сэрца б'ецца ашалела, сэрца б'ецца
несціхана,
Ды зусім яго нячутна ў развітальнай
гамане.

Зноў іду начной дарогай, а ліхтар сумуе
ў сцюжы,
І гарыць твой пацалунак — падарунак
летніх дзён.
Над зямлёю пабялелай вецер вее,
вецер кружыць,
Снег рыпіць, як шкла асколкі, ноч бярэ
мяне ў палон.

ПРОЗА

1

«НУ ШТО Ж,—пачухаў патыліцу ляснік Мялешка,—маглі б пажыць і ў мяне, але, не пакрыўдуйце, адвяду я вас да Максімаўны: ва ўсіх Дзедзічах ніхто вас лепей, чым яна, не дагледзіць...»

Ішлі мы нядоўга, мінулі хат дзесяць, і вось ён, гэты двор, гэта агароджа: слупкі падгнілі, штакетнік вер-

Мікола КУСЯНКОЎ

ЧАТА

АПАВЯДАННЕ

хам падаўся ўдоўж, у правы бок, — тонкія жэрдкі і аднолькава нахіленыя калкі нагадалі мне сшытак у касую лінейку. Увайшлі ў двор, і ўжо на ганку мне спатрэбіўся ці не цыркавы спрыт — так зазыбаўся дашчаны ганак пад нагамі, але я ўсё-такі ўстояў і ўслед за Мялешкам пераступіў парог.

Куды мы трапілі? У сенцы, дык не, бо вялікія ж, як у хаце, вокны, але ж і не ў хату, бо для хаты гэта занадта: мяшкі з бульбаю; кошыкі, кашолкі— з грушамі, слівамі, памідорамі; кашолка на мяшку і кошык на другой кашолцы,—усё гэта і на лаве, і пад лаваю, пад ёй нават запэцканыя ў зеленаваты гной гумавыя боты. І тут жа самаробны, на дзвюх крыжавінах стол, а на ім гладыш і збольшага прыкрыты палатняным ручніком пачаты бохан хлеба. Гаспадыня ж, старая жанчына, як быццам пакланілася нам — нізка нахіліўшыся, мыла ў бляшаным тазе бульбу; але вось яна выпрасталася і звяла ўнізе кашчавыя, шэрыя ад бруднай вады, рукі.

«Прывет, Максімаўна,—пад столь узвіўся высокі Мялешкаў тэнар,—нізашто не ўгадаеш, каго я табе прывёў! Усе перабылі ў цябе, і сувязісты, і каморнікі, а гэта ўжо таксатар—чула пра такога? Не чула! Ну дык хай пажыве, а то адной табе ўжо сумна, хіба не так? Ён-то цэлы дзень у лесе, але ж вернецца, дык вечарам адвядзеш душу, пагамоніш. Ці ўгаварыў я цябе, Максімаўна?.. У-га-ва-рыў!.. Ну, тады глядзі, каб сышліся характарамі...»

Прывычка

Як даць няпраўдзе рады?
Хацеў бы,
ды дармо:
адвыклае ад праўды,
пяро
ілжэ
само.

І, згоднае з пірожным,
ў нязгодзе—з сухаром,
грыміць вядром парожнім,
нібыта гэта гром...
1985

Наконт старой прымаўкі

Хажуць, мае кароткія ногі мана.
Дык чаму яна побач заўсёды?
Ні на крок не адстала ад праўды яна...
Мабыць, боты ў яе—скараходы!

Ды, відаць, не адкрыю я вам навіну,
як скажу, што не хтось вінаваты,
як скажу, што мы самі прынеслі ману
на падэшвах у нашыя хаты.

Ўсю падлогу заплямілі брудам маны.
Не пачысцілі боты з дарогі,
а хутчэй пачалі пасцілаць дываны,
каб не бачыць нямытай падлогі.

Ці не гэтак хваліўся нямыты шляхцюк
беласнежнай сваёю манішкай?
Паказуха—традыцыя, пыха манюк,—
мы старою хварэем адрыжкай...

Ды хіба нам да твару падман і мана?
Дываны паказухі да твару?
Хіба шчырасці нас не вучыла вайна
з гістарычнаю праўдай на пару?

Дык чаго мы баімся?
Няўжо і цяпер
трыццаць сёмага мрояцца краты?
Як кароста, уеўся ў душу недавер:
«Ці не сталінскі цень каля хаты?»

А над хатай вясновая ззяе святлынь,
Перамога запальвае зорку,
і хоць рукі адвыклі даўно ад мятлы,
трэба брацца на весну за ўборку.

Што памёрла—дарэмна ірвецца з труны.
Абнаўляецца час, як прырода.
Ўсё-ткі праўда: кароткія ногі ў маны,
што і сцвердзіла мудрасць народа.
1985

З афарызмаў Станіслава Ежы Леца

(Вольны пераклад)

1
«Ікс» скуру памяняў—явіў сваю натуру,
а так крычыць, нібыта здзёрлі скуру!

2
Гляджу на мяшчанства, і думаю зноў:
страшная лічба—сума нулёў!

3
Старых злачынстваў след і цень
у сённяшні прыводзяць дзень.

4
Навейшага часу з'явіўся герой,
ён нават сумленным здаецца:
горда носіць на шыі бірку з цаной,
за якую ён не прадаецца!

5
— Пра што дэбаты, гарбуны?
— Ды ўсё наконт прамой спіны!

6
Як прыходзяць да пакоры?
Ёсць адна прычына тут:
хто надзець згадзіўся шоры,
той надзене і хамут.

7
— Ідэя ваша мёртвая,—сказаў і ўзяў
за горла
ідэю тую бюракрат.—Ўздыхнула—
і памёрла...

8
Дужа храбры: не баіцца
з рук дыктатара карміцца.

9
Куды прагрэс завёў зямлян?
Кірункаў процьма, левых, правых...
Ўсё менш на карце белых плям,
ўсё больш крывавых...

10
Без свабоды мыслі што свабода слова?
Кашалёк без грошай, без каня падкова.

Старая ўсміхнулася—не так сухімі ўчарнелымі вуснамі, як пабляклымі, пад колер яе сівізны, вачамі. У думках, мабыць, усміхнуўся і я, бо цікава была яна адзетая: гарадская, модная, як на маладой, кофта і — бабская, доўгая, ледзь не да пят, спадніца.

«Колькі ні жыла, з усімі ладзіла, дык і з ім не будзем сварыцца,— Максімаўна не надта пільна зірнула на мяне, але я адчуў, што гэтага ёй было даволі, каб яна ўжо ўведала пра мяне штосьці істотнае, — пад такім позіркам міжволі ніякавееш.—А як жа цябе завуць? Мікалаем? Мікалай, бач. Харошае імя, майго чалавека, царства яму нябеснае, гэтаксама звалі. Дзесяць год, як няма ўжо. Хадзем, Мікалай, пакажу тваю святліцу...»

2

Назаўтра з Мялешкам мы толькі да абеду і пахадзілі па яго лесе—прагнаў дадому дождж. Нібы дзеля таго, каб я агледзеўся як след у сваёй «святліцы». У ёй ля лабавога прасценка стаяў засланы чыстай, пасвяточнаму квяцістай цыратаю стол; падсунутыя пад яго тры гнутыя крэслы, яшчэ, мабыць, даваенныя, абуджалі ў памяці штосьці чутае мною пра стыль рэтра; і быў такі ж даўні, ля глухой сцяны, інтэлігентны з выгляду, але ўжо дробна пабіты дзе-нідзе ржою, нікеляваны ложак. На ім я і прылёг адпачыць ці, можа, проста падумаць.

Думаў я пра Максімаўну, бо яна ж мяне толькі што частавала—за тым, крыжаногім сталом. Хаця—не частавала. Я ж помніў: недзе ў маёй роднай вёсцы гасцей не частуюць, а шануюць, так і можна было, напрыклад, пачуць — «едзе зяць, а шанаваць няма чым», і з таго часу, на мой слых, «шанаваць»—гэта болей, чым толькі частаваць, бо, як мне здаецца, частаваць можна і без душы, а шанаваць без душы нельга. Максімаўна мяне шанавала. І што абедаў я—гэта само сабой; яшчэ трэба было бачыць, як цэлае войска гародніны і садавіны—агуркоў, груш, сліў на чале з вялікім чырвоным памідорам з падаконніка ўварвалася на тэрыторыю прысунутага к яму стала і тупым клінам развівала наступленне ў мой бок, а на гародзе ж і ў садзе ў гэтага войска заставаліся яшчэ незлічоныя рэзервы. Сама ж Максімаўна і расказвала мне, прысеўшы на мех з бульбаю. Сёлета яна не думала і не гадала, што ўсё так уродзіць. Бо смаліла ж з вясны! Да Пятра дажджынкі не ўпала, жыта згарэла, касцы ў балота, у Чортаву прорву палезлі—каб летась, дык са дна і кассём знаку не падаў бы. Ды паслаў-такі бог дажджу, і спорнага, акрыяла, пайшла ў рост бульба; агуркі не раслі не паўзлі, а то вунь націна і цяпер яшчэ падымаецца, як на дражджах, а ўжо ж, лічы, восень. І на грушах голле трашчыць, падпёртае, а слівы буйныя, што бульба. І цяпер усяго ў яе поўна, дык яна і розуму не дабярэ, куды гэта ўсё падзець. Хутчэй бы студэнтаў на бульбу прыгналі, тыя б далі рады, а пакуль не чуваць, дык хоць ты ўжо, Мікалай, не грэбуй — што ўбачыш, тое і еш...

3

Не магло такога быць, каб я заснуў. Звычайна таксатар па свежай памяці «замацоўвае», абводзіць тушшу тое, што на сваім абрысе намаляваў у лесе алоўкам. Таму і я не збіраўся разлежвацца—устаў з ложка, сеў за стол, акуратна памачыў у туш чарцёжнае пёрка—усё рабіў наяву, я ў гэтым ніколькі не сумняваўся. Але тое раптоўнае, неспадзяванае, што адбылося далей, здалося мне ўжо не такім рэальным. Да двара ні з таго ні з сяго падляцеў нячутны, як ветрам прыгнаны, «газік». Я толькі зірнуў на яго ў акно, а ўжо адчыніліся дзверцы, і невысокі мужчына, без шапкі, з вялікім партфелем, сказаў штосьці шафёру і рашуча накіраваўся ў двор. Потым я пачуў, як на хаду, скупа, ён павітаўся з Максімаўнай, пастукаўся ў мае дзверы—для прыліку, бо адразу ж і штурхнуў іх. І не падумаўшы назваць сябе, напралом рушыў да майго стала, выхапіў з-пад абвіслай цыраты крэсла, сеў—нешта бесцырымонна-ўладарнае было ў паводзінах незнаёмага. Партфель ужо ў яго на каленях, рука штосьці шукае ў ім, шукае і не знаходзіць, на момант ён выхапіў з партфеля кнігу—у вочы мне кінулася назва—«Замежны дэтэктыў», рука ўжо нешта намацала на дне... тое, што трэба—запісную кніжку... Я ніяк не мог перахапіць яго позірк, каб сваім позіркам даць яму зразумець, што мяне дужа цікавіць, хто ён такі і чым я магу быць яму карысны. Але ён нічога не збіраўся тлумачыць, ён рыхтаваўся мяне дапытваць. «Значыць, малады чалавек,—здалося, ён ужо запісвае мой адказ,—вы, наколькі я разумею, маеце непасрэднае дачыненне да лесу?» Мне хацелася пратэставаць, але я быў нібыта загіпнатызаваны яго бесцырымоннасцю. «Як вам сказаць, я не ляснік, я таксатар, і мой лес больш абстрактны, ён у мяне на паперы». — «Гэтага можаце не тлумачыць, не паспелі вы тут аб'явіцца, як мой агент выйшаў на сувязь, і ўсё гэта я пра вас ведаю. Мяне цікавіць іншае...». Голас яго паплыў у маіх вушах, я ўжо не разбіраў яго слоў, толькі падумаў: «Адно з двух: або ён наяву паўтарае тое, што вычытаў у сваім замежным дэтэктыве, або я, прылёгшы на ложку, усё-такі заснуў і штосьці недарэчна-дэтэктыўнае мне сніцца...»

Я ўспомніў, як аднойчы ў Юравічах мяне, новага ў мястэчку чалавека, затрымаў тамашні ўчастковы і прывёў ці не ў той самы пакой, у якім задоўга да мяне пабываў мясцовы «рыштант» Васіль Дзяцел. Потым у гэты ж пакой міліцыянер паклікаў заплаканую кабету, і яна стала ўважліва да мяне прыглядацца—набліжалася і адступала назад, і я зразумеў, што яна апазнае ва мне злодзея, бо і ўчастковы надзвычай прафесійна, як бы між іншым, азіраў раз-пораз мой рукзак. Давялося перажыць непрыемныя хвіліны, але ўрэшце ўсё для мяне скончылася добра, бо міліцыянер, калі ты ні ў чым не вінаваты, заўсёды цябе адпусціць і нават папросіць прабачэння. Але то ж міліцыянер, а хто быў гэты чалавек, я не меў ніякага ўяўлення. Адно было ясна: ён мяне дапытвае, а раз так, дык у якую дэтэктыўную гісторыю я трапіў?..

Праўда, у дэтэктыве такі тып абавязкова бывае супермэнам; напрыклад, у кіно яго пазнаеш калі не па каменных скіўіцах, дык па яго ўнутранай звышчалавечай сутнасці, бо як бы ні прыкідваўся ён звычайным смяротным, нешта па-д'ябальску валявое не-не ды і выгляне з глыбіні вачэй—аж мароз па скуры. Тут жа было тое і ўсё ж не зусім. Безумоўна, у гэтым чалавеку пераважала воля, але было прыкметна, што ён і нерваваў, бо да суровай рашучасці ў выразе стомленага, шараватага твару прымешваліся заклапочанасць і трывога, а ў голасе, што мог здацца цвёрдым і пераканаўчым, чулася ў той жа час нешта крохкае, ломкае.

«Мой агент паведаміў мне, хто вы і што. Вы лесаўпарадчык, і гэта ваша справа—рабіце ў лесе што хочаце. Мяне ж цікавіць іншае. А іменна: вы маглі б, напрыклад, папрасіць ляснічага, каб ён выпісаў вам дроў ці якога матэрыялу?—Я пацісну плячамі. — Не адказваеце... Гэта ваша законнае права, але тады пакажыце пашпарт... Няма з сабою?.. Што ж, я паверу і так—прадыктуйце свой адрас. — Не зважаючы на маё недаўменне, ён запісаў неабходныя яму звесткі і, вяртаючы запісную кніжку ў партфель, надаў голасу яшчэ большай, але ўсё той жа крохкай, ломкай строгасці.—А цяпер слухайце мяне ўважліва. Каб ні дроў, ні жэрдак, ні слупоў—каб ніякага матэрыялу ў гэты двор не везлі—вы мяне зразумелі?.. Скора я буду браць вашага рэзідэнта, пачакаю толькі, пакуль управіцца—з бульбаю, з садам, а таму не ўздумайце мне перашкодзіць—вы ў мяне пад каўпаком.—Ужо выходзячы, спыніўся ля дзвярэй і кінуў цераз плячо:—Я вас папярэдзіў!..»

4

Цяпер я ўжо зусім быў збіты з панталыку. Калі ўсё-такі гэта не сон, а ява, дык чыё тут было трызненне—ягонае, маё?.. З жахам падумаў: зараз увойдзе Максімаўна, а я не ведаю, што са мною. Ды старая ціхенька ўвайшла ўжо. Напэўна, у мяне быў выгляд чалавека, які толькі што апрытомнеў і, баючыся, ці не зрабіў у непрытомнасці чаго благога, пазірае з трывогаю, без віны вінаваты. Але мне здалося, што і Максімаўна таксама збянтэжаная, таксама як вінаватая. Яна моўчкі апусцілася на крэсла, што заставалася высунутым з-пад стала: значыць, нехта на ім толькі што сядзеў, значыць, пабываў тут не прывід?..

Максімаўна, пэўна, прачытала ў маіх вачах нямое пытанне.

«Цяпер, Мікалай, ты і сам бачыш — гэта ж такі ў мяне родны сын. У раёне жыве. Ён там, а я тут, от між намі і вайна. Ой, вайна, Мікалай!..— Яна з сумнай усмешкай пахітала галавой.—А якая вайна, паслухай старую бабу—можа, ты нас і рассудзіш. Каб рассудзіў, дык я табе і дзякуй сказала б...»

«Паспрабую, можа, і рассуджу»,—няпэўна падумаў я, бо яшчэ не мінуў мой шок; праўда, штосьці да мяне ўжо дайшло: гэта, аказваецца, быў яе сын, але ж усё роўна заставалася загадка: чаму і пад якім я ў яго «каўпаком»?..

«Дзве дачкі ў мяне, — так старая пачала свой расказ,—у Мінску жывуць. Памагаю ім, дык у іх і кватэры дабрачыя, у большай, праўда, дзяржаўная, а ў меншай за свае грошы, капераціў, а пасля ж, як і на машыны ўзбіліся, дык я ім і кабанчыка, я ім і бульбы, і ўнукаў на ўсё лета вязуць, а бабе і радасць... Дык ён жа не рад, сын мой!.. Не, не буду бога гнявіць, няп'юшчы, і вунь які начальнік—на машыне возяць. І з жонкай ладзіць. А яна ж і культурная, настаўніца, дык і са мной прыветная, і ўсё было б добра, ды не даў бог ім дзетак—можа, таму і ў нас і вайна. Бо ты ж сам падумай: абое капейку неблагую маюць, а раён жа адно званне што горад—у цешчы і соткі ёсць, і бульбіна, і памідорына, дык маё ўжо, бач, ім і лішняе. А дочкам жа яно не лішняе! Яны ж вунь у вялікім горадзе, а ў іх жа яшчэ і дзеці!.. Дык гадоў пяць назад прыехалі дочкі з зя-

(Працяг на стар. 10).

Пісаць, адчуваючы жыццё

Заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР лаўрэату Дзяржаўнай прэміі рэспублікі Дзмітрыю СМОЛЬСКАМУ спаўняецца 50 гадоў

Сёлетні канцэртны сезон, зрэшты, як і папярэдні, выдаўся для кампазітара багатым на прэм'еры, аўтарскія вечары, творчыя сустрэчы са слухачамі. На «Мінскай вясне» 1987 года ўпершыню прагучала яго Чацвёртая сімфонія, годам раней адбылася прэм'ера Трэцяй. Другая сімфонія дастойна прадстаўляла сучасную музыку нашай рэспублікі на Днях Беларусі ў Славеніі. У праграму нядаўна прайшоўшага аўтарскага канцэрта ў Ерэване былі ўключаны Чацвёртая сімфонія і «Песня апошняга трубадура» для голасу і сімфанічнага аркестра на вершы іспанскага паэта XIII стагоддзя Г. Рык'ера — новы, яшчэ не вядомы мінчанам твор.

Мы сустрэліся з Д. Смольскім неўзабаве пасля яго вяртання з Ялты, дзе ў канцэртах Сімфанічнага аркестра Крымскай абласной філармоніі выконвалася яго Другая сімфонія.

Няцяжка пераканацца, што апошнім часам у фокусе творчых інтарэсаў кампазітара — сімфанічная і вакальна-інструментальная музыка.

— Дзмітрый Браніслававіч, чым вас прываблiваюць гэтыя жанры?

— На сённяшнім творчым этапе гэтыя жанры найбольш адпавядаюць маім музычным задумам, даюць магчымасць выявіць адчуванне цэласнага драматургічнага развіцця. Сімфанічная і вакальная музыка заўсёды была і застаецца звязанай, з увасабленнем значных філасофскіх, эстэтычных, сацыяльных тэм і ідэй.

— А што зараз падаецца вам найбольш цікавым і важным у грамадскім і ў мастацкім жыцці?

— Відавочна, менавіта ў час рэвалюцыйных сацыяльных зрухаў у людзей узнікае вострая патрэба ў кантактах. Усе мы сталі сведкамі той надзвычайнай увагі, якая надаецца сёння шматлікім дыскусіям, сустрэчам, тэлемастам, публікацыям друку. У нас у рэспубліцы тон у гэтых адносінах задаюць глыбокія, прынцыповыя, скіраваныя на сур'ёзныя праблемы выступленні дзеячаў літаратуры. І мы, музыканты, не можам заставацца ўбаку. Нам трэба больш актыўна ўмешвацца ў жыццё, адчуваць яго болевыя кропкі. Тым больш, што музыка цяпер успрымаецца як фактар грамадскі, робячыся прадметам вострай палемікі. Ды галоўнае, канечне, творчасць, дастойная часу, у які мы жывём. На жаль, сур'ёзная музыка сёння працягвае страчваць слухацкую аўдыторыю. Таму трэба паклапаціцца пра выхаванне слухачоў, асабліва маладых, пра далучэнне іх да музычнага мастацтва. Сімфоніі, кантаты, араторыі, оперы і балеты беларускіх кампазітараў павінны знаходзіць свайго слухача.

— Ці не значыць гэта, што вы намерваецеся абмежаваць сябе буйнымі жанрамі?

— Зразумела, не. Мне цікава працаваць над самымі рознымі творамі, за выключэннем, бадай, толькі песень. У 60-ыя гады я спалучаў песенную творчасць з работай у іншых жанрах. Пісаў песні з задавальненнем, вельмі лёгка. А потым перастаў адчуваць у гэтым патрэбу. На першы план выйшлі іншыя музычныя ідэі, вобразы.

— Няцяжка заўважыць досыць акрэсленую перыядызацыю ў вашай творчасці: 60-ыя гады — эксперыменты ў галіне найноўшых кампазітарскіх тэхнік. Вынік іх — стварэнне «Гульні свету», Варыяцый на basso ostinato для флейты і фартэпіяна, камерная араторыя «Песні Хірасімы», «Актафонія», якія літаральна ашаламілі наша музычнае асяроддзе сваёй нязвыкласцю. 70-ыя гады — зварот да нацыянальных вытокаў, да жанраў, звязаных са словам; сцвярджэнне грамадзянскай і лірыка-драматычнай тэматыкі. Тады былі створаны адметныя вакальныя цыклы на вершы Г. Лоркі, Ф. Цютчава, Я. Палонскага, А. Ахматавай, М. Цвятаевай, А. Вазнясенскага, опера «Сівая легенда» паводле У. Караткевіча (а пазней і опера «Францыск Скарына»), араторыі «Мая Радзіма» (вершы беларускіх паэтаў) і «Паэт» (прысвечана Я. Купалу). І, нарэшце, 80-ыя гады — нейкім чынам перыяд сінтэзу, пазначаны найбольшымі дасягненнямі ў галіне лірыка-псіхалагічнага, канцэпцыйнага сімфанізму. Як жа цяпер, пасля двух дзесяцігоддзяў, вы ацэньваеце пошукі ў свае маладыя гады?

— У 60-ыя я быў захоплены сучаснай музычнай мовай, сучаснай тэхналогіяй. Вывучаў літаратуру, шмат пісаў. І гэта зусім не было фармальным эксперыментатарствам. Тады я менавіта гэтак адчуваў, гэткімі вобразамі мыслію. І тэксты падбіраў адпаведныя — як, скажам, вершы сучасных японскіх паэтаў для «Песень Хірасімы».

Кожнаму ўзросту ўласцівы свае непаўторныя рысы. Нельга патрабаваць ад маладых мудрасці і глыбіні, затое ў маладосці куды вастрэй адчуваецца і лягчэй спасцігаецца навізна мовы і формы. (Для маладых, часам, не столькі важна «што» сказаць, колькі — «як» сказаць: паназірайце хоць бы за іх манерай гаварыць, апранацца). З гадамі я ўсё больш пераконваўся ў думцы, што самае каштоўнае ў мастацтве — прастата. Не прымітыў, вядома, а мудрая прастата. І я адчуў патрэбу гаварыць іншаю мовай — яснай, зразумелай, выразнай. Гэта зусім не значыць, што набытае ў 60-ыя гады было адкінута, забыта. Наадварот. Многія прынцыпы майго сённяшняга кампазітарскага мыслення (менавіта прынцыпы мыслення, а не тэхналогія толькі; самая сутнасць, а не вонкавая форма) пазычаны з арсеналу 60-ых. Напрыклад, з серыйнай тэхнікай звязаны прыёмы работы з тэматычным зернем, якія даюць магчымасць стварыць буйны монатэматычны опус. Такія прынцыпы ў аснове Другой, Трэцяй, Чацвёртай сімфоній.

— Слухачоў, чытачоў, ды і крытыкаў заўсёды прываблівае магчымасць зазірнуць у творчую лабараторыю мастака...

— Найбольш прадуктыўна працую ў дамах творчасці — менавіта там удаецца цалкам засяродзіцца на стварэнні музыкі. Аднак кампазітарскай справе супрацьпаказаны вялікія перапынкі. Таму, каб падтрымліваць належную прафесійную форму, працаваць трэба пастаянна.

Як пішу? Гаварыць пра гэта няпроста: творчы працэс невытлумачальны. Але ж паспрабую...

Спачатку ўзнікае нейкі інтуітыўны пасыл, імпульс, затым ён канкрэтызуецца, афармляецца розумам. Далейшую працу шмат у чым вызначае жанр твора. Калі музыка з тэкстам — імкнуся ўзмацніць эмацыянальнае гучанне слова, знайсці адэкватную яму музычную мову. У інструментальным творы спачатку нараджаецца пэўная канструкцыйная ідэя. Ніколі не пішу «па кавалках», а заўжды — ад пачатку да канца. Бо для мяне надзвычай важная музычная драматургія. Лічу за лепшае «будаваць» яе на мінімуме матэрыялу: гэта дае магчымасць заглыбіцца ў яго, паказаць ва ўсіх іпастасях, зрабіць твор маналітным. Такі тып пісьма часта называюць мінімалізмам. Ён дазваляе ў сціслых часавых рамках сказаць вельмі многае, калі, вядома, думка сканцэнтравана дакладна, трапна; дазваляе выказаць мноства градацый чалавечых пачуццяў...

— Ад кампазітараў-выкладчыкаў нярэдка даводзілася чуць, што педагогіка займае ў іхняй дзейнасці падпарадкаванае месца. Галоўнае, маўляў, кампазіцыя і ўсё, што ёй спадарожнічае: рэпетыцыі і канцэрты, творчыя сустрэчы і вандроўкі, запіс на радыё і тэлебачанні. Ці падзяляеце такі пункт гледжання вы?

— Сапраўды, педагагічная дзейнасць адбірае шмат сіл і энергіі. Навучыць, скіраваць, падказаць, папраўіць... Усё гэта напружаная ў інтэлектуальным і эмацыянальным сэнсе праца, якая робіцца шмат у чым за кошт кампазітарскай

творчасці. І ўсё ж весці клас кампазіцыі ў кансерваторыі не толькі цяжка, а і вельмі цікава. Працэс гэты строга індывідуальны, тут няма і не можа быць ніякіх догмаў, трафарэтаў, хаця, безумоўна, з часам кожны педагог выпрацоўвае ўласныя прыёмы навучання. І працэс гэты сугуба творчы, што і прыносіць мне вялікае задавальненне. І я шчаслівы, што займаюся тым, што магу рабіць, што люблю,— і кампазіцыяй, і педагогікай.

— Пытанне да вас як да выкладчыка кансерваторыі. Многія з вучняў вашага класа ўжо дасягнулі пэўных поспехаў і прызнання. У вас ёсць магчымасць параўнаць выпускнікоў розных гадоў. Што можаце сказаць пра цяперашняе пакаленне кампазітарскай моладзі?

— Праблем у моладзі заўжды многа. Адна з іх — недастатковы ўзровень музычнай культуры, эрудыцыі. Пакідае жадаць лепшага і прафесійная падрыхтоўка людзей, якія выходзяць на сцяжыну творчасці. З гэтымі праблемамі мы, педа-

ЧАГА

(Працяг. Пачатак на стар. 8—9).

цямі, па дзяцей сваіх, акурат во такой парою, каб у школу забраць, ну а ведама ж, калі ты цешча, дык наканавана табе перад зяцямі запабягаць, часта ваць іх, от яны ўжо і хітаюцца за сталом, бо ўжо вясёленькія. А тут і ён, сын мой,—яго ж возяць, дык не ўгадаеш, калі і падскоча. Яшчэ на парозе завадзіў нядобра галавою, бы цуглі закусіўшы, сеў, моўчкі перакуліў чарку, а тады і кажа: вы дакуль будзеце старую маці абіраць, дакуль вы будзеце яе сплаціраваць, гэта ў яго слова такое. Я, кажа, не дазволю, каб мая маці дзеля вас жыллё сваё напінала.

Ды пасварыўся адно і паехаў. Тады зяці і кажуць: мы не крыўдуем, гэта яму хмель у галаву ўдарыў, а так ён добры. А калі толькі хмель, дык яны яго і не баяцца, прыязджаюць налета зноў. Прыязджаюць, а тут вунь які хмель: як уляцеў ён у хату цвярозы, ды як схапіўся загрудкі—з адным, з другім, каб болей, кажа, і духу тут вашага не было! А дочкі яму: гэта і наша матка, не толькі твая! А ён ім ні слова ні паўслова, толькі з хаты каўзель, і ўжо машына ля двара загурчала—думаем, паехаў. Ды нешта чуе маё сэрца, зірнула я ў двор, а ён, сын мой, нібыта швайкаю доўгай як стаў пароць іхнія колы, а я не ведаю, крычаць мне ці маўчаць, абазвалася, а ён ужо колы тыя ўсе чыста папароў—як стаялі машыны, так і прысялі. Як усхапіўся старшы зяць, за сякеру ды за ім, а ў яго ж ото «козлік» напагатове гурчаў, дык зяць толькі наўздагон сякераю і шпурнуў—дзякуй богу, не папаў. Во як было, Мікалай!..»

Я слухаў Максімаўну, а сам прыкідваў: дыверсія, якую правёў яе сын, няйнакш, была загадзя ім спланавана, бо каб папраколваць шыны, трэба было падрыхтаваць «швайку» — можа, вастрэй затачыць доўгую адвёртку, трэба было, каб напагатове гурчаў «газік»,—словам, дзейнічаў ён у сваім дэтэктыўна-прыгодніцкім стылі, які мне быў ужо знаёмы па яго размове са мною. Але ж, думаў я, калі пра яго т а к о г а расказвае Максімаўна, дык, значыць, нічога мне не прымроілася, такі ён на самай справе? А тады што ж ён за чалавек? Ды і ўвогуле — што гэта за гісторыя?..

«...Ну, тады зяці і ўсхадзіліся: усё, матка, крыж на тваім дворышчы ставім; калі ў цябе такі дурны сын, дык крыўдуй не крыўдуй, а больш да цябе мы не прыедзем і дзяцей сваіх не прывязём, бо ад ненармальнага ўсяго чакаць можна... Заракліся ехаць, бо дужа ж доўга колы тыя знімалі ды клеілі. Таму яны і не едуць. Другое лета ўжо. Ото ў машыны дзяцей патопчуць дый вязуць іх на тое дурное мора, а там жывуць голыя, як дзікуны, а па малако за тры вярсты ходзяць.

Сын жа спачатку не мог нацешыцца: разагнаў тваіх дармаедаў, дык і табе няма чаго тут рабіць, збірайся, кажа, да мяне ў раён, не сягоння—заўтра прыеду і назаўсёды цябе адсюль забяру... От тады, Мікалай, і пачалася між намі вайна: ён ідзе ў наступ, а я, старая, адбіваюся...»

5

Максімаўна схамянулася:

«Ой, Мікалай, гэта ж мой гадаванец гвалт падымае. Пабягу замяшаю, а тады ўжо і мы вячэраць сядзем...»

Калі вандруеш з рукзаком па зёсках, часта выпадае жыць на кватэры ў старых. Некаторыя скардзяцца, што дзеці адцураліся іх, не бяруць у горад, але часцей яны і самі не хочуць туды ехаць. А хто перабраўся, вяртаецца назад. Адзін стары так нудзіўся ў гарадской кватэры, што сын з нявесткаю, ідучы на работу, зачынялі яго на ключ — каб не збег. Але ён звязаў тры прасціны, спусціўся з другога паверха і ўцёк да вясковай дачкі. Дык не дзіва, што і Максімаўна не хацела перабірацца да сына. Знаёмая гісторыя. Але ў ёй вельмі актыўна пачынаў дзейнічаць сын, і таму гісторыя ў нечым здалася мне і новай, яна мяне проста ўжо заінтрыгавала. Максімаўна ж за гаспадарчым клопатам ніяк не магла выбраць хвіліны, каб давесці свой расказ да канца. Мінуў дзень, другі, мы з Мялешкам апісвалі ўдоўж і ўпоперак яго лес, а я ўсё думаў пра Максімаўну і пра яе сына. І вось нарэшце я не стрываў і спытаў Мялешку, а ці не мог бы ён праясніць мне гэту гісторыю: жыве ж недалёка, дык і ўсё, напэўна, ведае...

«Што я магу сказаць, — задумаўся на хвіліну Мялешка, — на тое ж ён і родны сын, што хоча забраць матку. Даўно хацеў, а тут яшчэ баба Раманіха падагнала. Свойскай кашы ёй захацелася. Пасеяла проса, а прыйшла пара — зжала, пранікам абабіла дый ссыпала ў дзежку. А дзежка яшчэ ад цара, глыбокая, ці высокая, як тут сказаць, дык баба, проса чэрпаючы, няўдала неяк нагнулася, нібыта нырнула ў дзежку — старчма ўніз галавою, а перавярнуцца не можа, адно падрыкала нагамі дый перастала. Максімаўна, канечне, дужэйшая, але ж, як гэта бяда здарылася, сын ёй і кажа: баба Раманіха была такая ж харобрая, як ты, а, бач, якога коніка выкінула. Таму, кажа, прыеду, дваццаць чатыры гадзіны на зборы, і каб ніякіх размоў. А Максімаўна ні ў якую!.. Вось таму ў іх і вайна. А калі вы хочаце болей ведаць пра старую, дык я вам так скажу —чага!..»

Я зірнуў на Мялешку недаўменна.

«Чага, — паўтарыў ён. — Знаеце, бывае такая бярэзіна, стукнеш па ёй кляймом, а яна спрахла, нават на дровы не годная. Ды глянеш угору, а на ёй — чага!.. Згніло дрэва, але не хоча паміраць бескарысна, бо гэта ж не абы-што, а чага, людзі за ёй вунь як ганяюцца, яна ж, кажуць, ад самога раку памагае... Дык і ваша Максімаўна... Ад яе ўжо зямлёй пахне, а яна канавы паабкошвае, карове ношкамі нацягае, а тады яшчэ і малако здае калгасу. А як вы ў яе жывяцё, дык яна вас і накорміць, і напоіць, а ні рубля ж не возьме, толькі скажа — на здароўе... Чага!..»

Напэўна, Мялешка быў паэтам, а можа, і філосафам, але ж у дадзеным выпадку нічога новага мне ён не адкрыў: такіх, як Максімаўна, старых людзей я ведаў намнога лепей за яго, бо шмат разоў на сабе зведаў іх дабрату і сардэчнасць. Праўда, бывала і так. Жыву ў адных старых, а самае ж лета — кубелец іхні, мабыць, апусцеў, і вось раніцай чую праз сон, як у сенцах добрая старая агітуе старога ахвяраваць дзеля кватаранца курыцаю. Стары ж упарціцца, бо я чую, старая прытупнула нагой: не саромся перад чалавекам, адсячы палавенькай галаву, усё роўна ў бур'янах нясецца! І палавенькая трапіла-такі ў суп. Але ж як адыграўся стары! Схіляюся ў хаце над сталом, абводжу тушшу свой лесавы абрыс і раптам чую, як мой гаспадар турнуў з агарода курэй: «Акыш, каб вас таксатар паеў!..»

Але, канечне ж, такі стары — прыкрае выключэнне з правіла, якое Мялешка надзвычай ёмка і вобразна па-

гогі, сутыкаемся ўжо на прыёмных экзаменах у кансерваторыю. Але дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што некаторыя нашы выхаванцы за гады вучобы прыкметна развіваюцца, робяцца яркімі асобамі са сваёй уласнай творчай пазіцыяй—ім ёсць што сказаць слухачам.

Але, вядома, трэба нам усё ж больш слухаць, зацікаўлена і зычліва абмяркоўваць творы маладых. І паміж імі павінна быць здаровая канкурэнцыя, якая падтрымлівае жаданне эксперыментаваць, шукаць. Ды, на жаль, атмасфера ў нашым Саюзе кампазітараў разіццю такіх тэндэнцый пакуль не спрыяе.

— Вакол нас — літаральна паводка рок-музыкі. У канцэртных залах, па радыё і тэлебачанні, з бытавых магнітафонаў і прайгравальнікаў гучыць яна. Ужо знаходзяцца і «тэарэтыкі», якія гатовы абвясціць яе ледзьве не вянцом усяго гістарычнага развіцця музычнага мастацтва...

— Я прымаю розную музыку, у тым ліку і галенавіты рок. Забараняць, змагацца з гэтым — бязглуздзіца. Відаць, рок узнік заканамерна, і на пэўным этапе жыцця моладзі ён адпавядае яе запатрабаванням. Праблема ў іншым. Чалавек высокай духоўнай культуры, эстэтычна чулы, спагадліва ўспрымае жыццё і мастацтва ва ўсёй шматстайнасці. У душы такога чалавека знойдуць водгук Бетховен і Брамс, джаз, рок, народная песня. Іншая справа — чалавек духоўна неразвіты, бедны. Для яго і сапраўды ўвесь свет музыкі — «з аўчынку», ды і тое — не самыя лепшыя ўзоры масавай культуры. Таму галоўная задача, на маю думку, у тым, каб, пачынаючы са школьных гадоў, абудзіць у маладых патрэбу ў духоўнасці, харастве, у сапраўдным высокім мастацтве. Тады і рок зойме адпаведнае яго сутнасці месца. І захапленне ім не будзе пераходзіць у гіпертрафіраваныя формы.

— Дзмітрый Браніслававіч, на заканчэнне — традыцыйнае пытанне: вашы бліжэйшыя творчыя планы?

— Працую над сімфоніяй для камернага аркестра.

— Дзякую за гутарку.

Інтэрв'ю вяла
Вольга САВІЦКАЯ.
Фота А. КАЛЯДЫ.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

«Кніга на службе міру і прагрэсу»

ПАД ТАКІМ дэвізам вось ужо шосты раз адкрыецца ў верасні гэтага года Маскоўская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Разам з кнігавыдаўцамі краіны рыхтуюцца да яе і выдавецтвы Беларусі.

Кнігавыдавецкая справа ў рэспубліцы адлюстроўвае той росквіт, які перажывае наша беларуская нацыянальная культура, і з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнай скарбніцы ўсіх савецкіх людзей. Гэта мы бачым і адчуваем, прымаючы ўдзел у маскоўскіх кніжных кірмашах, міжнародных выстаўках, а таксама ва ўзрастаючым экспарце кніг з Беларусі ў замежныя краіны. Трэба адзначыць, што беларуская кніга здабыла высокі міжнародны аўтарытэт. Толькі ў 1986 годзе беларускія выдавецтвы адправілі ў замежныя краіны звыш 600 назваў кніг на суму каля 3,5 мільёна рублёў. Гэта творы класікаў беларускай літаратуры, лепшыя кнігі прозы і паэзіі сучасных пісьменнікаў Беларусі, шматлікія работы па навукова-тэхнічнаму прагрэсу, выданні грамадска-палітычнай тэматыкі, вучэбная і даведачная літаратура, слоўнікі. Экспартуем мы і гатовыя тыражы кніг, выдадзеныя на беларускай мове. Так, у 1986 годзе былі адпраўлены ў ФРГ, Канаду і Францыю зборы твораў З. Бядулі і М. Гарэцкага; кнігагандлёвыя фірмы з ЗША, Англіі, ФРГ, Галандыі, Францыі купілі энцыклапедычны слоўнік «Янка Купала», зборнік «Беларуская байка», кнігу С. Палуяна «Пісьмы для будучыні», зборнік «Дзень паэзіі-86», слоўнікі і даведачную літаратуру на беларускай мове.

Беларуская кніга сёння экспартуецца ў 109 краін свету, сярод іх, акрамя вышэй адзначаных, Індыя, Іспанія, Егіпет, Японія, Мексіка, Венесуэла, Аўстралія, ПНР, ЧССР, Балгарыя, Югаславія, Венгрыя, ГДР, В'етнам. З кожным маскоўскім кірмашом нязменна ўзрастае продаж замежным выдавецка-гандлёвым фірмам беларускіх выданняў. Калі на першым кірмашы ў 1977 годзе мы іх прадалі ўсяго на 320 тысяч рублёў, то летась — амаль на паўтара мільёна рублёў. Беларуская кніга ідзе на ўсе кантыненты. І мы прымаем неабходныя захады да таго, каб нашы сувязі з замежнымі партнёрамі з году ў год пашыраліся, а кнігаабмен адпаведна павялічваўся.

Маскоўскі кірмаш якраз і з'яўляецца адной з форм пашырэння такіх кантактаў. Сёлетні кірмаш збярэ больш за 3 тысячы замежных кнігагандлёвых і кнігавыдавецкіх фірм. З боку нашай краіны ў выстаўцы-кірмашы прымуць удзел усе цэнтральныя выдавецтвы, выдавецтвы саюзных рэспублік і некаторыя грамадскія арганізацыі. Кожная саюзная рэспубліка мае сваю асабістую экспазіцыю.

На кірмашы, што мае адбыцца, нашу беларускую экспазіцыю складзе літаратура рознабаковага тэматычнага і мэтавага дыяпазону. Важнае месца, як звычайна, аддаецца кнігам грамадска-палітычнай тэматыкі, у тым ліку выданням аб жыцці, рэвалюцыйнай і дзяржаўнай дзейнасці У. І. Леніна, аб Камуністычнай партыі — яе гісторыі, кіруючай ролі ў нашым грамадстве, а таксама літаратуры, выдадзенай да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Будуць шырока прадстаўлены выданні, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны, а таксама літаратура, якая шырока адлюстроўвае актуальныя народнагаспадарчыя праблемы, дасягненні навукі і культуры, тэхнікі і вытворчага вопыту.

Самымі вялікімі, як заўсёды, будуць стэнды мастацкай і дзіцячай літаратуры. Сярод прадстаўленых кніг — раман Васіля Быкава «Кар'ер», апавяданні Янкі Брыля «Ад сяўбы да жніва», «Лірыка» Максіма Танка, вершы і паэмы «Далучанасць» Пімена Панчанкі, раманы Івана Шамякіна «Атланты і карыятыды» і «Зеніт», зборнік крытычных і публіцыстычных работ «Выберы — жыццё» і аповесці «Карнікі» і «Хатынская аповесць» Алеся Адамовіча, п'есы Алеся Дударава, творы І. Пташнікава, Р. Барадуліна, Б. Сачанкі, А. Вярцінскага, А. Грачанікава, А. Жука, П. Місько, С. Алексіевіч і іншых беларускіх пісьменнікаў.

Асобна будуць экспанавацца кнігі І. Мележа, В. Быкава, І. Шамякіна, М. Танка, А. Адамовіча, Я. Брыля, І. Чыгрынава і многіх іншых, што былі перакладзены на замежныя мовы і выдадзены ў розных краінах свету.

Вялікае месца ў экспазіцыі займуць выданні на замежных мовах па заказах замежных фірм — гэта лепшыя творы нацыянальнай класікі, кнігі сучасных беларускіх пісьменнікаў, беларускія народныя казкі і фальклор у перакладзе на англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую, галандскую, арабскую, польскую, чэшскую, славацкую, сербскахарвацкую і іншыя мовы.

Галоўным экспарцёрам кніг на замежных мовах з'яўляецца ў рэспубліцы выдавецтва «Юнацтва», якое за гады 11 пяцігодкі выпусціла па заказах замежных фірм 82 назвы кніг агульным тыражом амаль 4 мільёны экземпляраў. Асноўныя імпарцёры беларускай літаратуры — сацыялістычныя краіны. Але, дзякуючы намаганням выдавецтва, у апошнія гады атрыманы і выкананы заказы фірм з Аўстрыі, ФРГ, Бельгіі, Нідэрландаў, Мексікі, Індыі, Нікарагуа, ЗША, Аўстраліі, Фінляндыі, Егіпта, Бангладэш. Частка тыражоў рэалізоўвалася ў Афганістане, Нарвегіі, Іране, Сінгапуры, Непале, Сірыі, Іарданіі, Малайзіі і іншых краінах, што, вядома, спрыяе больш шырокай папулярызацыі беларускай кнігі. Сярод новых заказчыкаў на сённяшні дзень — фірмы з Марока, Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Паўднёвы Йемен, Гвінеі і іншых.

На апошнім кірмашы, што адбыўся ў Маскве ў 1985 годзе, з замежнымі фірмамі было заключана больш за 350 здзелак. Падпісана 124 кантракты, з якіх 80 на ўступку правоў замежным фірмам на перавыданне твораў беларускіх аўтараў у перакладзе на замежныя мовы, а пасля кірмашу было падпісана яшчэ 56 кантрактаў. Такім чынам, за два гады больш за 100 лепшых кніг беларускіх пісьменнікаў убачылі свет у краінах сацыялізму, а таксама ў ЗША, ФРГ, Японіі, Фінляндыі, Алжыры і іншых. З 44 кантрактаў, на якія ў замежных фірм мы набылі права на выданне, 43 ужо рэалізаваны. Сярод твораў, што выйшлі па кантрактах у рэспубліканскіх выдавецтвах, — проза і паэзія, навуковыя работы, вучэбная і даведачная літаратура аўтараў з СФРЮ, Кубы, ГДР, ПНР, ЧССР, ВНР, а таксама з ФРГ, Аўстрыі.

Па папярэдніх падліках вынікі на Маскоўскай міжнароднай выстаўцы-кірмашы чакаюцца больш значныя — як у плане продажу гатовых тыражоў, так і ўступкі правоў на перавыданне беларускіх твораў за мяжой.

Беларускія кнігавыдаўцы заклапочаны зараз тым, каб яшчэ раз перагледзець падрыхтаваныя для экспазіцыі кнігі, забяспечыць своечасовы выхад рэкламных матэрыялаў, узгадніць час наведвання камерцыйнага цэнтра і замежных экспазіцый, узважыць свае магчымасці.

Зразумець адзін аднаго, аб'яднацца для высакароднай справы — захавання міру ва ўсім свеце, — такую мэту ставіць перад сабой міжнародны кніжны форум у Маскве, дэвіз якога «Кніга на службе міру і прагрэсу» падзяляюць многія выдаўцы планеты. Гэтай мэце служаць і беларускія кнігавыдаўцы, пашыраючы кнігаабмен, а тым самым і міжнароднае супрацоўніцтва.

В. ВАЛЫНСКІ,
вядучы рэдактар
Дзяржкамвыда БССР,
кіраўнік рабочай групы
знешнеэканамічных і
культурных сувязей
з замежнымі краінамі.

З ГЛЫБІНІ СТАГОДДЗЯЎ

Памяць пакаленняў непадуладна часу. Скрозь гады і падзеі яна ўваскрашае выдатныя старонкі нашай гісторыі. Гэта цікавая фотакніга так і называецца —«Часу непадуладна». Прысвечана яна юбілею унікальнага помніка сусветнай пісьменнасці — «Слова пра паход Ігаравы». З глыбіні васьмі стагоддзяў звернуты да чытача хвалюючыя радкі паэмы на сучаснай рускай, украінскай і беларускай мовах, пераўвасобленай выдатнымі майстрамі мастацкага перакладу Мікалаем Рыленкавым, Максімам Рыльскім і Янкам Купалам.

Невядомы аўтар эпасу, буйнейшы паэт і мысліцель, палымяны патрыёт сваёй радзімы вяртае нас на старажытную чарнігава-северскую зямлю, адкуль пачаў свой паход на полаўцаў князь Ігар Святаславіч. Яго хвалюючы расказ дапаўняюць шэдэўры айчыннага дойлідства — равеснікі «Слова...» Сёння больш за трыццаць выдатных помнікаў даўніны аб'яднаны ўрадавай пастановай у Чарнігаўскі архітэктурна-гістарычны запаведнік.

Каляровыя фотаілюстрацыі складальніка кнігі В. Школьнага шырока знаёмяць чытача з велічным Спаскім саборам — адзіным захаваным на левабярэжжы Украіны помнікам манументальнага каменнага дойлідства росквіту Кіеўскай Русі.

Фотакніга пазнаёміць дасціпнага чытача з радзімай галоўнага героя «Слова...» жамчужынай «старажытнарускіх караляў» тысячагадовым Ноўгарадам-Северскім, яго велічным ансамблем Спаса-Прэабражэнскага манастыра, знакамітымі гандлёвымі радамі, трыумфальнай аркай, унікальным помнікам народнай драўлянай архітэктуры паўночнага левабярэжжа Украіны — Нікольскай царквой...

Захапляючы фотарасказ суправаджаецца ўступным артыкулам і навуковымі каментарыямі, напісанымі на мовах трох братніх народаў, калыскай якіх была Кіеўская Русь.

Фотаальбом убачыў свет ва ўкраінскім рэспубліканскім выдавецтве «Мистецтво». Гэта добрае запрашэнне да падарожжа ў дзіўны свет цудоўнага не толькі для турыстаў, а і ўсіх чытачоў, якія захапляюцца гісторыяй роднай краіны.

І. КУЖЭЛЬНЫ.

г. Чарнігаў.

даў мне ў адным слове — чага!.. Дзіва што чага... Але ж, думаў я, калі чага, дык чаму абавязкова старое дрэва? А чаму не сярэдняга веку, чаму не маладое?.. Так я пытаў сябе, і, мабыць, таму, што мае думкі займала ўжо не столькі Максімаўна, колькі яе сын, чалавек яшчэ, канечне ж, не стары, было яму гадоў сорак пяць, не болей...

6

Вечарам Максімаўна падсела нарэшце да майго стала.

«Гэта ж я пазаўчора не даказала табе. Пра сына. Затуркалася, не адно дык другое. Паслухай жа далей. Прыязджае мой сын дый кажа: адпрэчыў я тваіх зяцёў, дык хто ж табе цяпер дроў прывязе ды напілуе? Ага! Не будзе чаго ў печ укінуць, дык перастанеш упарціцца, сама сядзеш і паедзеш да мяне ў раён... А я толькі галавой ківаю: не ведаеш ты маіх зяцёў. Яны ж, бывала, усё пад машынай, адны ногі тырчаць, ці галавою ў маторы, а каб дроў насячы ці шула цешчы падперці, дык ім і клопат малы. А я іх і не прыганяю. Прывядзе брыгадзір на кватэру хлопцаў, тых, што лектрыку мяняюць, дык я да свету падхаплюся — і снеданне згатую, і полудзень кожнаму ў кашэль пакладу, не дзіва, што і яны мне аддзячаць. Як слабейшы слуп паваляць, дык і валакуць трактарам, а ля двара цілою, тою, што тарахціць дужа, парэжуць, а пасля пасякуць ды яшчэ і складуць за хатаю. А тады бачу, а яны і кароткі ўжо слуп, ды зусім новы, ля шула ўкапалі, тоўстым дротам усё разам абкруцілі, дык цяпер у мяне і хлеў не горшы, чым у людзей, а то ж, было, вароты ўжо ні адчыніць, ні зачыніць. Ды нехта ж увёў сыну ў вушы пра лектрыкаў — ох і злосны ж прыляцеў: пачакай жа, кажа, адпрэчыў адных, пужну і другіх, а то не разабраць, чыя ты матка — мая ці ўсяго свету. Кладу, кажа, гэтаму канец — каб ніякі прыблуда нічога табе ў двары не рабіў і дроў каб не вёз і не сек, а каторы не паслухаецца майго загаду, той перада мной адкажа. Цяпер ты, Мікалай, можа, і сам кеміш, чаму ён быў з табой такі суровы. Ён жа думае, як ты па лесе ходзіш, дык ці дроў расстараешся, ці якую жэрдку на плот прыцягнеш, — ото ж ён цябе і пужнуў, я ж чула, як ён табе гразіўся, ажно адрас твой запісаў...

От так, Мікалай, ён выкурвае мяне адсюль, але ж хай бы толькі выкурваў, а то ж яшчэ і страшыць: я, кажа, рыхтую аперацыю і скора буду цябе браць. А якую ён рыхтуе мне аперацыю, я і розуму не дабяру, ён жа не доктар, а начальнік над зямлёй, нездарма ж яго і на машыне па ўсім раёне возяць».

Я не ведаў, каму спачуваць —Максімаўне ці яе сыну: чалавек да таго ўжо начытаўся дэтэктываў, што збіраўся «браць» родную матку. Жудкавата ўспомнілася, што і я ў яго «пад каўпаком». І, напэўна, я толькі пашкадаваў бы яго, калі б раптам не адчуў, што мала яго пашкадаваць, у ім трэба яшчэ нешта як след зразумець. Мне выразна згадаўся твар «начальніка над зямлёй», твар, на якім увачавідкі змешвалася напускная знешняя ўпэўненасць і прыкры ўнутраны неспакой, і я пачынаў ужо здагадвацца, што менавіта растрывожаны дух начальніка шукае выйсця ў яго дэтэктыўным дзівацтве. Безаглядная хватка, якую заўважаў я ў паводзінах многіх начальнікаў, тут пераходзіла ў яўны фарс і тым самым нібыта адмаўляла сама сябе — я пачынаў гэта разумець і яшчэ ўважлівей слухаў далей Максімаўну.

«А як пахавалі Раманіху, сын і кажа: усё, рыхтуйся да аперацыі, буду цябе браць, бо на мяне ўжо напісалі нанімку: сам раскашуецца ў раёне, а старой маці чужыя людзі дровы сякуць. Дочкі твае, кажа, толькі цябе ў свае модныя кохты, як маладую, адзяюць, а ў горадзе ты ім не трэба, ім лепей, каб ты дзеля іх тут сябе ўсю паклала, а я, кажа, люблю цябе і шкадую, таму і павінна ты жыць у мяне, у свайго сына...

Чуеш, Мікалай?.. Так ён пачаў гэтую гаворку пра сваё шкадаванне ды пра любоў. А як пачаў, дык я яму і кажу: такая ж твая любоў да роднай маткі, такое ж тваё шкадаванне! Зірні, кажу, на мяне: калі я люблю і сясцёр тваіх, і цябе, дык на тое ж я і кабанчыка гадую: прыедуць сёстры твае пад Новы год, употай ад цябе, каб зноў колы не папсаваў, дык я адной сцягенца, другой лапатку дый табе ж, бывае, у партхвёль сала брус увапхну — бачыш, якая мая любоў! А твая любоў толькі на словах, ты толькі па радзіву прыгожа гаворыш...

Сказала так, дык ён ажно збялеў. А як, Мікалай, было з тым радзівам. Неяк суседка мая гукае цераз плот: бяжы, старая, у хату, па радзіву твой сын гаворыць. Я ў святліцу, а тут і праўда ж талерка мая чорная брынчыць і голас як чужы, ды дзе ж маці не пазнае свайго сына — ён!.. Чую, а сын пра нейкае зелле кажа, я нават яго не выгавару, век яго ў нас не сеялі, а то, кажа, пасеем на тархвянні, дык і малако пацурчыць, і пчолы ношкамі цягаць мёд будуць. А я слухаю ды сама сабе думаю: хай бы яно так і было, тады і мне вальней будзе ўкасіць сваёй карове за гародам, бо калі ў калгасе травы досыць, дык і брыгадзір добры — абкошвай, старая, канавы... Ды не так выйшла, як мой сын казаў. Ой, не так!.. Як навалілася суш, як усчаўся вецер, дык тое зелле разам з торхам падхапіла і панесла, можа, за свет. А за гародам у мяне і тая трава, што сама расце, парудзела ўся чыста, бо, ведама ж, канавы, а па канавах вада збегла, і зямля сухенькая абапал — во як!.. Дык цяпер я сыну і кажу: цягнеш мяне ў раён, ды, можа, таму і цягнеш, што сам бачыш: мне ўжо за гародам карове сваёй не тое што ўкасіць, а і ўжаць якога чубка сярпом няма дзе. От такая, кажу, твая любоў, такое тваё шкадаванне...

Дык ён пык-мык дый прыкусіў язык. Бо яму і казаць няма чаго. Толькі дужа пахмурны стаў, падхапіўся — і з хаты».

7

Гэтым ранкам і я быў «пахмурны» — развітваўся з Максімаўнай. Ускінуў на плечы рукзак, выйшаў з двара і сярэдзінай вуліцы, па вузкім, з рыхлаватымі краямі асфальце, падаўся на аўтобусны прыпынак. Насустрач мне ішлі два хлопцы, іх паблажлівяныя позіркі слізгалі высока над зямлёй — паверсе дрэў і хат. Але адзін з іх заўважыў тое, што на роўным асфальце з асабліва маляўнічай нагляднасцю пакідаюць пасля сябе каровы; пачулася, ён спытаў: «Як ты мяркуеш, стары, можна ўявіць сабе такое дзе-небудзь на Брадвеі?», на што другі адказаў перакананa: «Твая праўда, стары, на Брадвеі такое ўявіць немагчыма...»

«Блажен, кто вовремя созрел», — падумаў я, шкадуючы гэтых невясковых, мабыць, чыстаплюяў. А можа, я пашкадаваў не толькі іх?.. Гэтым брадвейным хлопцам я мог бы прывесці ў прыклад сябе: выспеў некалі нават раней часу, а цяпер, калі я да таго ж і пажыў на свеце, я, канечне ж, быў шмат мудрэйшы за іх; але ж усё роўна... вярнуўся ў думках да Максімаўны, азірнуўся назад — і яе нахілены ўдоўж, у правы бок, рэдкі штакетнік зноў нагадаў мне даўні, у касую лінейку, сшытак. Я міжволі па-

(Заканчэнне на стар. 12).

НАШЫ ГОСЦІ

«МЫ НАРАДЗІЛІСЯ Ў СОРАК ПЕРШЫМ»

На спектаклі Омскага акадэмічнага тэатра драмы «У вайны не жаночы твар...»

У ВАЙНЫ было рознае аблічча. Для кожнага, хто перажыў яе,—рознае. Але заўсёды — жахлівае. І — не жаночае. Тое, што забівае, што пазбаўляе надзеі, нявечыць, руйнуе,— не можа мець аблічча жанчыны, чыё прызначэнне — даваць жыццё, кахаць, дарыць прыгажосць... Але ж быў ён, быў час, калі жанчыны—сталыя і маладыя, і зусім юныя — кінуліся ратаваць Радзіму. Бо ратаваць — гэта ж таксама прызначэнне жанчыны.

Доўгія чатыры гады яны рабілі гэтую страшэнную, небяспечную крывавую работу — у агні, які паліў маладосць, хараство і само жыццё. Не чакаючы падзякі і — больш таго! — часта і не дачакаўшыся... Так многа сказаўшы пра вайну, наша мастацтва неяк сарамліва адварочвалася ад гэтай занадта «далікатнай» і занадта складанай тэмы. Не было прынята гаварыць — быццам і не было гэтага...

...Аднойчы маладая журналістка Святлана Алексіевіч пайшла да былой франтавічкі — пагаварыць аб вайне. Пайшла, не ведаючы, што з гэтага выйдзе. А выйшла кніга. Кніга, назва якой стала афарыстычнай. Кніга, якая спарадзіла радыёперадачы, фільмы, спектаклі. Самыя розныя спектаклі ў самых розных тэатрах...

«У вайны не жаночы твар...» Гэтым спектаклем адкрыў свае гастролі ў Мінску Омскі акадэмічны тэатр драмы.

Пазначыўшы жанр — «драматычная хроніка», нагадаўшы тут толькі сапраўдныя дакументы, сведчанні, успаміны,— тэатр, зразумела, рызыкаваў. Ды і мы непакоіліся: а што калі выйдуць на сцэну артысткі і пачнуць добра пастаўленымі галасамі, хай нават і па законах рэалізму, разыгрываць, «прадстаўляць» жыццё знаёмых нам жанчын, якіх мы толькі што бачылі ў зале, — прыбраных, з узрушанымі тварамі і трывожнымі вачамі?

І раптам з першага рада падняліся адна за адной артысткі, без грыму, сціпла апранутыя, і, назваўшы сябе, пачалі апавядаць пра тое, дзе і як кожную з іх напаткала вайна... Жахлівыя падрабязнасці — будзённа: агульная бяда, агульныя пакуты. Толькі пасля знаёмства кожная паведаміла, чыю ролю яна будзе выконваць,— а мы ўжо паверылі ім...

У спектаклі панавала праўда. Яна была ў самой кампазіцыі: няма сюжэта, бо сюжэт — вайна. І галоўныя героі раіні ў неабходны для спектакля момант, спыніўшы расказ ад першай асобы, расказваюць нам пра лёс іншых дзяўчат, як пра свой. Мера ўмоўнасці можа быць большай ці меншай, але нідзе не падрываецца наш давер. Можна гаварыць проста ў залу — дзяліцца ўспамінамі, а можна адной яскравай дэталлю адзначыць вялізную панараму: выйдзе артыстка і высыпле з чыгунка бульбу: пасля бою забітыя хлопцы ляжалі на полі так густа, так нерухома — як бульба!.. То нас уразіць плаціка плаката балючым успамінам аб нядаўнім нашым поўным даверы да плакатнай формулы; то рване сэрца. Пераапранаючы дзяўчынку ў салдацкае, гучна, адкрытымі галасамі пяюць жанчыны старую рэкруцкую песню: «Не ходил бы ты, Ванёк, во солдаты...» І пытанне ваенкома: «А што, калі вернешся знявечанай?..» Спектакль пайшоў далей, а перад вачамі, засланіўшы сцэну,— карціна Генадзя Даброва «Жанчына са спаленым тварам», толькі што рэпрадуцыраваная «Огоньком». Можа, самая страшэнная рана вайны...

Не было аднолькавых ран — кожнага вайна нявечыла пасвойму. Не было аднолькавых баёў — пра гэта ўспомнілася, калі на сцэне апынуліся прачкі палявога пральнага атрада... Знямоглыя ад непасільнай працы, з падарваным здароўем і загубленай магчымасцю калі-небудзь стаць маці... Ні табе павагі, ні ордэна — начоўкі, вар, цяжкія катлы, мыла даюць мала, «адмывайце слязьмі». Бруд, пот, кроў... Бялізна, парваная на шматкі разам з чалавекам...

...Лідзію Паўлаўну Лукашэвіч вайна памілавала: добраахвотніца з Халмагораў даехала са сваім лазне-пральным поездам «Падарунак кемскіх рабочых — фронту» да Познані нават без драпіны, ды яшчэ і сустрэла на вайне свайго Леаніда, там і ажаніліся... Лёс аказаўся да яе літасцівы: каханая жонка, шчаслівая маці і бабуля, яна і сёння складненькая, са свежым тварам і моцнымі маленькімі рукамі.

Але больш чым за дваццаць гадоў работы побач з ёю рэдка-рэдка чула, каб яна ўспамінала вайну: вочы наліваюцца слязьмі, губы дрыжаць... І калі мы кожны год сярод іншых удзельнікаў вайны віншавалі яе са святам Перамогі, яна ціха ўдакладняла: «Я ж была вольнанаёмная», быццам баялася, каб ёй не перадалі больш чым можна ўвагі. Паўнапраўным удзельнікам вайны яе палічылі пазней на два гады за мужа... А вайна ж не пыталася, хто ты — вольнанаёмны ці мабілізаваны.

«Калі б мы ні нарадзіліся — мы нарадзіліся ў сорак першым. Усё, што ведаем, — вайна, усё, што ўмеем, — вайна...» Гэты спектакль неяк няёмка аналізаваць звычайным чынам. Не толькі таму, што якасць яго ўжо засведчана высокай узнагародай — Дзяржаўнай прэміяй РСФСР. Створаны па законах мастацтва, з высокім прафесіяналізмам, густам і тактам, ён успрымаецца кавалкам жывога жыцця, дзе балючае і смешнае, крывавае і пяшчотнае, высокае і нізкае — усё побач.

Няёмка называць выканаўцамі Алену Псарову, Надзею Надзеждзіну, Капіталіну Баркоўскую, Елізавету Раманенка ці Наталлю Васіліядзі, якая з нейкай асаблівай мераю праўды расказала аб лёсе Соф'і Верашчак, падпольшчыцы, вязня гестапа, аб яе пакутах і намаганнях... (Мне толькі здаецца крыху штучным уключаны ў спектакль эпізод з п'есы П. Вайса «Дазнанне» — кантраст паміж зганьбаваннем асобы і маральнай стойкасцю чамусьці падаецца прасталінейна).

Цяжка назваць выкананнем тое, як жывуць у спектаклі Генадзя Трасцянецкага Псарова, Баркоўская, Надзеждзіна, Васіліядзі; ды і кожны з іншых артыстаў працуе вельмі дакладна, утвараючы разам атмасферу аднадумства, свабоды ў прапанаваным малюнку спектакля. Дзіўна, але ў гэтым спектаклі побач з трагедыяй натуральна жыве гумар... Жыццё — непераадольнае...

...Вось што яшчэ выйшла з той даўняй сустрэчы маладой журналісткі («зусім дзяўчынкі»,— успамінаюць гераіні кнігі) з былой франтавічкай. Нарадзілася «Свята са слязьмі на вачах», сведкамі і ўдзельнікамі якога мы сталі.

Відаць, у гэты вечар асабліва шчасліва ўсё сышлося: пачатак гастроляў, узрушанасць, у зале — нямала жанчын з ваеннымі ўзнагародамі на сукенках і з кветкамі ў руках. Яны ціха сядзелі праз увесь спектакль, але калі гераіня на сцэне расказвала, як выцягвала параненых, як бралася за пояс, а зброю яго — на плячо,— я пачула: ззаду хтосьці прашаптаў: «Ды не, не так...»

Я адважылася азірнуцца толькі ў антракце: жанчына ў вішнёвым, на грудзях зіхацяць медалі — відаць, пасля вайны ўжо атрымала, а вочы — заплаканыя.

...Толькі што гераіні спектакля кідаліся затрымаць заслону, каб выкрычаць сваю пакуту, кожная крычала сваё, быццам пасля доўгіх год маўчання, мы не ўсё нават і разбіралі, але адно чулася выразна: «Толькі б не было вайны! Толькі б не было...».

І вось ужо канец спектакля. Грымяць апладысменты, і ўсё нясуць і нясуць кветкі. І стаяць яны, абняўшыся, як сёстры,— артысткі і салдаты Вялікай Айчыннай, якія так нечакана і так пранізліва «ўпісаліся» ў пластыку спектакля.

І хоць было зразумела: многіх запрасілі на спектакль, гераінь — асабіста, і, вядома, яны і павінны былі ўзняцца на сцэну,—тыя, чые імёны пазначаны ў праграмцы: Валянціна Чудаева — сяржант Вялікай Айчыннай, Марыя Марозава — яфрэйтар, Валянціна Братчыкава-Баршчэўская — лейтэнант... І кветкі падарыць артысткам, і павіншаваць... Усё гэта можна было прадбачыць... Але выбух жывога пачуцця, жывое ўзрушэнне, але гулкае біццё нашых сэрцаў, але слёзы на дзявочых тварыках, але паднятыя ўверх у воплеску юнацкія далоні — гэта нельга «зрэжысіраваць»! Мы не маглі пакінуць залу, не маглі разысціся — нас на і ты час з'ядналі агульны боль і агульная любоў.

А зараз хочацца запытацца: як жа гэта атрымліваецца ў «гэтых маладых» (якімі мы часта бываем задаволены, што некаторыя з іх, вайны не зведаўшы, нарадзіўшыся пасля, здолелі прыняць у сэрца і подзвіг, і пакуты бацькоў і дзядоў, перахварэць імі, перапакутаваць — і пераўтварыць у маральную каштоўнасць, надаць ім мастацкую годнасць? Як ім удалося адчуць неабходнасць гэтага і сваю адказнасць? «Генетычная» памяць?!

Пытанне досыць рытарычнае.

У якой жа «геннай» памяці захавалася адчуванне не толькі трагедыі вайны, але яе рэалій, побыту? «Всё, что было не со мной, помню...»?..

Відаць, перш за ўсё патрэбна асаблівае мастакоўскае — і грамадзянскае — адчуванне праўды. Патрэбен талент. І абавязкова, як першакрыніца,— сумленне...

Лілія БРАНДАБОЎСКАЯ.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

ЧАГА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8—11).

думаў: жывеш — быццам кожны дзень нанава вучышся пісаць палачкі, і ў той жа момант з-за павароту вуліцы выскачыў знаёмы «газік» — я ледзь паспеў уступіць яму вузкі асфальт.

Параўняўшыся са мной, «газік» рэзка затармазіў, і было ў гэтым нешта роспачнае, што прымусіла спыніцца і мяне. Адчыніліся дзверцы, і, канечне ж, побач з шафёрам я ўбачыў «начальніка над зямлёй»; твар яго быў засяроджана-сур'ёзны, і сама паніклая пастава сведчыла аб яго нібыта ўсяленскай нейкай заклапочанасці. У ім амаль не засталося ўжо напускной суровасці, якую помніў я з таго дня, як агаломшыў ён мяне сваім дэтэктыўным візітам. Я нават адчуў у ім штосьці мне блізкае, як быццам паўтаралася гісторыя з вядомага апавядання О' Генры: то мы не на жарт процістаялі адзін аднаму, цяпер жа мне здалося, што мы з ім акурат роднасныя душы, абодва ж — службоўцы-вандроўнікі, з той неістотнай розніцай, што ён ездзіў на «газіку», а я насіў на сабе рукзак. Напэўна, і ён адчуў нешта падобнае, бо, ступіўшы на дол, загаварыў па-таварыску прыязна:

«Салют праектанту. — Ён паздароўкаўся са мной за руку. — Здзіўлены, чаму так называю? А хто ж ты? Лясны праектант — на такіх, як ты, у мяне, браце, дасье. Кажаш, напужаў я цябе? Там, у старой? Выбачай, так трэба было. Вы мне зрываеце акцыю, думаў, гэтай восенню ўжо забяру, а ёй зноў нехта дроў насек. Глядзіце, хлопцы, здарыцца што з маці, усіх пазнаходжу. Ну ды ладна, ты на аўтобус?.. Давай прысядзем, во лавачка, а прыпынак вунь на павароце, аўтобус не прапусцім...»

Мы селі на лавачку, і ён спытаў:

«Ну, а ўсё-такі, як там пажывае наш рэзідэнт? Увогуле, што ты думаеш пра гэтую гісторыю? Я ж ведаю, яна ўсё табе расказала — і пра сябе, і пра мяне. Скардзілася, так?..»

Мне няцяжка было яму адказаць. Я ўспомніў Мялешку і паўтарыў прыкладна тое, што сказаў ён мне ў лесе пра Максімаўну, —чага...

«Што ж, усё правільна — чага. — «Начальнік над зямлёй» згодна паківаў галавой. — Я таксама пра гэта думаю. Толькі не знаю, глыбей думаю ці шырэй — і пра сваю старую, і пра сябе. А можа, і пра цябе... Віна гэта наша ці бяда, а дбаем мы пра некага, як мая маці кажа, «па радзіву». Ну, дапусцім не па радыё, але ўсё роўна — маштабна дбаем, не пра аднаго, а адразу пра многіх, на адлегласці. Таму, калі ты сказаў «А», дык кажы і «Б». Пра сябе кажы. Цябе гэта дзівіць? А што ж тут дзіўнага? Ты ж таксама нешта парадкуеш у лесе, а для каго парадкуеш? Для ўсіх. У тым ліку і для мяне. Дык вось і скажы, а ці ўпэўнены ты, што робіш для мяне і ўсіх іншых толькі дабро?..

Хаця што ж я цябе пытаю: ты начальнік над лесам, а ў ім да пары да часу ўсё шыта-крыта, і з табой калі што і праясніцца, дык гадоў праз сто. А я начальнік над зямлёй: зіма — лета, і ўвесь я ўжо як на далоні. І вось прыязджаю да старой, а яна і кажа: што ж ты, сынок, ваду з Чортавай прорвы спусціў, мне ўжо і ўкасіць карове няма дзе, так усё перасохла. А я ёй нібыта жартам: не можа ўсё заставацца так, як шмат гадоў назад, гэта ж, кажу, дыялектыка: усё цячэ, усё мяняецца, дык і ў цябе за гародам таксама. Вось тут яна мяне і падлавіла. Якая ж гэта, кажа, дзялектыка? Цякла Паплаўка, рэчачка, дык я з тою касою, што бацька твой перад смерцю накляпаў, пайду ды паўз бераг і ўкашу карове. А як у спёку ўпрэеш, дык і твар спаласнеш, бо ўсё ж лета вада бегла — з Чортавай прорвы, з-пад самай зямлі. А цяпер яна па канаве, як на пажар, збяжыць вясною напрамкі, а летам адзін сівы пясок на дне. Дык што ж ты, сынок мой, кажаш — цячэ?.. Цякло, ды перастала!.. Вось так яна адчытвае, а ты слухаеш, і прыкра на душы, бо ты ж разумееш: тое добрае, што ўвабраў ты некалі з малаком маці, павінна мець, ужо на тваім гэтым вітку, нейкі людскі працяг, а дзе ж ён у цябе?.. Якім уяўляў сябе героем: а як жа, я ж з самымі лепшымі намерамі начальствую над зямлёй — з аднаго месца ваду спускаю, другое заліваю, гэта крою, тое перакройваю, і людзі, канечне ж, павінны дзякаваць мне, павінны падаць перада мною ніц. Агледзеўся, а яны не падаюць, не дзякуюць!.. Ды што там людзі — родная маці не дзякуе!.. Дык вось еду я зараз да яе і думаю: ну, дапусцім, маці я забраў, як яна кажа, «у раён», але ж усе тыя людзі, дзеля якіх я толькі і начальствую, застануцца тут!..

Вось такія, браце, нашы справы... Канечне, я мог бы сябе суцешыць: што ні рабіў — рабіў з любоўю да людзей, і калі ў мяне штосьці не выйшла, дык не зламыснік жа я, не злачынца — павінны ж людзі гэта разумець. Але ж, па-першае, ад гэтага іх разумення лягчэй ім не стане, а па-другое... Хачу я цябе спытаць, ці чытаеш ты дэтэктывы?.. Пусты занятак?.. Дарма ты так... Дапусцім, пра забойствы я таксама не люблю, а пра разведчыкаў, пра шпіёнаў... Ды лепш бы я іх не чытаў... Усю дарогу цяпер не выходзіць з галавы: нікім ты на гэтай зямлі не завярбованы, ніхто чужы не засылаў цябе сюды, каб ты некаму шкодзіў, ты ж свой, тутэйшы, некалі ў піянерах кляўся любіць родную зямлю, ды, напэўна ж, і цяпер ты яе любіш, але чаму ж ад тваёй любві ёй сёння баліць?..»

●

Мы разам зірнулі ўдоўж вуліцы.

«Аўтобус... Твой аўтобус... — Ён прытрымаў мяне за рукзак, які я ўзяў ужо на адно плячо, але тут жа адпусціў і сказаў быццам з нейкай надзеяй: — Ладна, можа, яшчэ сустрэнемся...»

КОНКУРС ДАЎ ПЛЁН

АБУДЗІЦЬ духоўны пачатак у чалавеку, яго любоў да роднай песні, да народнага танца, актывізаваць лепшыя творчыя сілы народа, ажывіць, абнавіць, узбагаціць усе формы народнай творчасці і культурна-асветнай работы — на гэта скіраваны II Усесаюзны фестываль народнай творчасці, прысвечаны 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. На гэта быў скіраваны і Рэспубліканскі конкурс на стварэнне твораў для калектываў мастацкай самадзейнасці, які праходзіў у рамках фестывалю са снежня леташняга па май гэтага года. Пяць месяцаў напружанай працы творцаў — пісьменнікаў, кампазітараў, журналістаў, вучоных, практыкаў культасветработы і два гады творчай дзейнасці харэографаў рэспублікі (на конкурс прымаліся харэаграфічныя творы 1985—1987 гадоў) далі адчувальны вынік. На конкурс паступіла 339 твораў аднаактовай і клубнай драматургіі, сцэнарыяў масавых свят, абрадаў, рытуалаў і музыкі да іх, вакальна-харавой і інструментальнай музыкі і музыкі да харэаграфічных кампазіцый і танцаў; у тым ліку 131 харэаграфічная пастаноўка.

Прызнацца, першыя месяцы не пакідала трывога, што на конкурс не адгукнуцца. Хоць, здавалася, зрабілі для прапаганды мэты і ўмоў яго ўсё: правялі сумеснае пасяджэнне рэпертуарнай камісіі Рэспубліканскага аргкамітэта II Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці і грамадскага мастацкага савета Міністэрства культуры Беларусі па фарміраванні рэпертуару калектываў мастацкай самадзейнасці з запрашэннем прадстаўнікоў жанравых творчых секцый аргкамітэта, вывесілі аб'явы і выступілі перад членамі творчых саюзаў, пастанову і палажэнне аб конкурсе даслалі абласным органам культуры і метадычным службам, інфармавалі пра конкурс праз БЕЛТА і штотыднёвік «Літаратура і мастацтва», запрашалі да ўдзелу ў конкурсе персанальна. Але рэдкія конкурсныя птахі жывілі трывогу: не праваліўся б. Сумненні развеяў сакавік: конкурсны лівень стаў адчувальным. А ў красавіку ён яшчэ пашчыльнеў. Тэрмінова давялося фарміраваць рабочыя жанравыя журы (папярэдне планавалі абысціся сіламі жанравых секцый аргкамітэта). Журы ўзначалілі вядомыя дзеячы культуры Анатоль Сабалеўскі (аднаактовая драматургія), Марыя Карпенка (клубная драматургія), Анатоль Фядосік (масавыя святы, абрады, рытуалы), Юрый Семяняка (вакальна-харавая музыка), Міхась Казінец (інструментальная музыка), Юлія Чурко (харэаграфія).

У ацэнцы конкурсных твораў бралі ўдзел старшыня грамадскага мастацкага савета Міністэрства культуры БССР Алесь Петрашкевіч, старшыня секцыі аднаактовай і клубнай драматургіі мастацкага савета Іван Пташнікаў, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларусь» Любоў Цяцерына і загадчык рэдакцыі музычнай літаратуры гэтага выдавецтва Анатоль Астахаў, вучоныя-фальклярысты Арсень Ліс, Васіль Бандарчык, Іван Цішчанка, пісьменнікі Сцяпан Лаўшук, Уладзімір Гніламёдаў, Вольга Іпатава, Валянціна Коўтун, кампазітары Леанід Захлеўны, Алег Чыркун, Віктар Войцік, вядомыя харавікі-дырыжоры Міхась Дрынеўскі, Іна Вінаградава, Стэла Таразевіч, Станіслаў Дробыш, журналісты Ніна Жалязоўская, Людміла Бацюшкова, харэографы Валянціна Гаявая, Эмілія Шумілава... Словам, судзіў, ацэньваў высокі і справядлівы суд.

Рашэнні жанравых журы зацверджаны на сумесным пасяджэнні рэпертуарнай камісіі Рэспубліканскага аргкамітэта II Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці і мастацкага савета Міністэрства культуры рэспублікі па фарміраванні рэпертуару калектываў мастацкай самадзейнасці, а таксама сумеснай пастановай арганізатараў конкурсу — калегіі Міністэрства культуры БССР, сакратарыята Белсаўпрофа, сакратарыятаў праўленняў Саюза пісьменнікаў БССР, Саюза кампазітараў БССР, Саюза журналістаў БССР.

Трыццаць два конкурсныя творы адзначаны прэміямі конкурсу і семнаццаць рэкамендаваны да набыцця. Такім чынам, 49 твораў, адрасаваных клубнай аўдыторыі, патрабавальнымі журы рэкамендаваны да ўвядзення ў культасветную практыку. Гэта, аднак, не азначае таго, што ўсе астатнія дзвесце дзевяноста твораў, якім не пашчасціла стаць лаўрэатамі і дыпламантамі конкурсу, не варты ўвагі клубнага работніка. Сярод іх нямала такіх, якія пры адпаведнай дапрацоўцы здольны ажывіць, абнавіць, зрабіць больш цікавымі клубныя і школьныя ранішнікі і вечары, масавыя святы і рытуалы. Але гэта — справы будзённыя рэпертуарнай калегіі ўпраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры і яго грамадскага мастацкага савета па фарміраванні рэпертуару калектываў мастацкай самадзейнасці, органаў і ўстаноў культуры рэспублікі, метадычных службаў рэспубліканскага, абласных і раённых звенняў. А конкурс — гэта своеасаблівае свята. Тым больш, што ў такім выглядзе ён праводзіўся ўпершыню. І не па нейкім адным жанры, а па ўсіх асноўных жанравых відах народнай творчасці.

Дзевяць твораў сталі лаўрэатамі конкурсу, сорак — дыпламантамі.

Хто ж стаў шчаслівым уладальнікам лаўрэацкіх званняў і першых прэмій? Аўтарамі твораў-лаўрэатаў аказаліся: Васіль Ткачоў (аднаактовая п'еса «Стары і дарога»), Васіль Шырко (інсцэніроўка «Віленскія камунары» паводле аднайменнага рамана-хронікі Максіма Гарэцкага), Іна Пыж, Антаніна Емяльянава і Таццяна Філіпава (сцэнарый свята народнай творчасці «Жывіца» — сёлета ў Заслаўі часткова гэты сцэнарый быў ажыццёўлены), Аляксандр Рашчынскі (канцэртная п'еса для беларускіх народных інструментаў «З рога ўсяго многа»), Валерый Іваноў (канцэртная п'еса «Танец» для сімфанічнага аркестра), Георгій Чорны (харэаграфічныя творы «Кабылка», «Церніца», «Пава», пастаўленыя ў ансамблі «Крупіца» Крупіцкага ЦДК Мінскага раёна), Мікалай Котаў («Полька ў два бакі» —з кампазіцыі «Тураўскія вячоркі» — і «Кука» — абодва творы пастаўлены ў ансамблі танца «Прыпяць»), Наталля Буйко (харэаграфічныя творы «Жаваронкі», «Сплюшка» створаны з вучнямі сярэдняй школы № 2 горада Барысава), Мікалай Падаляк — аўтар-пастаноўшчык харэаграфічных твораў «Ойра» і «Тапатуха», створаныя ім з ансамблем танца «Дзвінскія зоры» Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Наваполацкнафтааргсінтэз».

Званне «Дыпламант Рэспубліканскага конкурсу на стварэнне твораў для калектываў мастацкай самадзейнасці, прысвечаных 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» з уручэннем дыпломаў і другіх прэмій заваявалі: Леў Караічаў (аднаактовая п'еса «Апанаванасць» — падзеі 1919 года), Маргарыта Яфімава (сцэнарый тэатралізаванага клубнага прадстаўлення «Рэвалюцыя — з нараджэння ўсім роўнае сонцу імя»), Ларыса Рыжкова, Антаніна Емяльянава (сцэнарый масавага свята «Беларускія зажынкі»), Мар'ян Наско (аўтар музыкі харавых твораў «Радзіма Кастрычніка» і «Беларусь-Вяснянка»), Іосіф Скурко (аўтар слоў песні «Радзіма Кастрычніка»), Артур Вольскі (аўтар слоў песні «Беларусь-Вяснянка»), харэографы Пётр Свярдлоў («Полька на табурэтках» у ансамблі танца Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Гомельбуд»), Святлана Новік і Наталля Русакевіч (студэнткі Мінскага інстытута культуры — за харэаграфічныя творы «Ткацтва» і «Малаточкі», створаныя на фальклорна-этнаграфічнай аснове), Таццяна Папова (танец-гульня «Куранятьі» ў дзіцячым танцавальным калектыве Палаца культуры тэкстыльшчыкаў Магілёўскага вытворчага аб'яднання шаўковых тканін).

Няпроста было журы вылучыць лепшых. Менавіта гэта адзначалі большасць жанравых журы. Бліскучых, на ўзроўні адкрыццяў, твораў амаль не аказалася. Аднак, прафесійных, тэматычна адпавядаючых конкурсу на лепшы твор, прысвечаны 70-годдзю Вялікага Кастрычніка,—нямала. І прэтэндэнтаў на прэміі было значна больш, чым саміх прэмій. Асабліва няпроста было вызначыць пераможцаў сярод твораў аднаактовай драматургіі, жанру літаратуры даволі занядбанага. А гэта ж незаменны актуальны пракатны матэрыял агіттэатраў.

Але працягнем знаёмства. Дыпламантамі конкурсу на стварэнне твораў для калектываў мастацкай самадзейнасці з уручэннем ім трэціх прэмій сталі: аўтары аднаактовых п'ес Георгій Марчук («Паводка») і Мікола Капыловіч («Чужы сваяк»), аўтар сцэнарыя тэатралізаванага клубнага прадстаўлення «Дулі на вярбе» (паводле гумарыстычных твораў Ніла Гілевіча) Васіль Шырко, аўтар сцэнарыя «Провады ва Узброеныя сілы СССР» Любоў Ракава, аўтар п'есы «На кірмашы» для аркестра народных інструментаў Алена Кулакоўская, аўтар сюіты «Жаночыя песні» для голасу і народнага аркестра Вячаслаў Кузняцоў, Юрый Семяняка і Уладзімір Карызна — аўтары хору для змешанага саставу «Мы — савецкая Айчына», аўтары хору для змешанага саставу «Вяснянка Беларусь» Яўген Петрашэвіч і Іван Насута (Гродна). Як заўсёды — шырокая геаграфія твораў-лаўрэатаў харэаграфічнага жанру. Мікалай Дубінін удастоены прэміі за твор «Крыніца» (ансамбль харэаграфічных мініяцюр Столінскага раённага Дома культуры). Вячаслаў Пагодзін свой захапляючы танец «Падушачка», што прыемна ўразіў членаў журы, стварыў з ансамблем песні і танца «Брастаўчанка» клуба Брэсцкага электрамеханічнага завода. Ніна Залеўская плённа і інтэлектуальна, вельмі творча працуе з ансамблем танца Палаца культуры «Юнацтва» вытворчага прадзільна-нітачнага аб'яднання імя XXV з'езда КПСС, дзе яна паставіла і танец-дыпламант «Пчолка». Наталля Палякова ўдастоена звання дыпламанта Рэспубліканскага конкурсу і трэцяй прэміі за «Вярхоўеўскую кадрылю», пастаноўку якой ажыццявіла ў танцавальным калектыве Палаца культуры Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна.

Заахвочвальнымі дыпломамі ўзнагароджаны: Валянцін Мыслівец (аднаактовая п'еса «Конскія размовы» і верш, што стаў песняй,— «Айчына»), Юрый Сохар (аднаактовая п'еса «Поле памяці»), Міхась Скрыпка (п'еса для тэатра лялек «Прыгоды Таптыжкі»), Мікола Маляўка (сцэнарый клубнага прадстаўлення ў абарону прыроды «Лес мой, брат мой...»), Сяргей Ціванаў (сцэнарый тэматычнага вечара «Нашы слаўныя землякі»), Ганна Курыловіч (сцэнарый «Безалкагольнае вясельнае застолле»), Марыя Жабінская (сцэнарый тэматычнага вечара «Віншаванне цялятніцы, даяркі, загадчыка фермы»), Алег Чыркун (песня «Айчына»), Уладзімір Перацяцька (фантазія на тэмы рэвалюцыйных песень савецкіх кампазітараў для аркестра народных інструментаў), Васіль Глыбачэнка (канцэртная п'еса для трыо баянаў «Паверце, дзеванькі» — на тэмы аднайменнай песні Э. Зарыцкага), Валерый Копыл (вясельная замалёўка «У двары гармонік грае» — для жаночага ансамбля ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля, г. Гомель), Міхаіл Ларчанка (папуры на тэмы песень савецкіх кампазітараў — для духавога аркестра).

Дыпломамі за ўдзел у конкурсе ўзнагароджаны таксама харэографы. Сярод іх — Любоў Вятчыніна («Янтарыкі» — ва ўзорным ансамблі танца «Вясёлка» Бешанковіцкага раённага Дома культуры); Ірына Дарохіна («Вясна» ва ўзорным ансамблі танца «Весялушка» школы мастацтва Маскоўскага раёна горада Мінска), Людміла Матусевіч («Макі» ў танцавальным калектыве Мар'інагорскага саўгаса-тэхнікума Пухавіцкага раёна), Чэслаў Клячко, Мікалай Падаляк («Ляхавіцкая праходка» — ва ўзорным ансамблі танца «Камарыкі» Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Наваполацкнафтааргсінтэз»).

Вынікі конкурсу падведзены. Яны, апрача ўсяго іншага, сведчаць пра тое, што такая форма сацыяльнага заказу можа прыносіць неблагі плён. Упэўнена — конкурсы неабходна праводзіць рэгулярна. Але — з большай жанравай дыферэнцыяй. Надзённая задача па прапагандзе набыткаў гэтага конкурсу — аператыўна тыражыраваць іх праз сродкі масавай інфармацыі і рэпертуарныя выданні Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Міністэрства культуры БССР. Скажу адразу, што сёлета плануем выдаць зборнік аднаактовых п'ес, адзначаных прэміямі конкурсу, і некалькі сцэнарыяў і інсцэніровак у «Сцэнарна-метадычных рэкамендацыях па правядзенні клубных мерапрыемстваў». Наш добры і патрабавальны дарадца старшыня секцыі аднаактовай і клубнай драматургіі Іван Мікалаевіч Пташнікаў плануе некалькі лепшых твораў аднаактовай драматургіі прапанаваць чытачам часопіса «Полымя», дзе ён, як вядома, загадвае аддзелам прозы. Плануецца таксама выданне лепшых сцэнарыяў клубнай драматургіі ў выдавецтве «Беларусь».

Прымаюцца захады да выдання і тыражыравання твораў вакальна-харавой і інструментальнай музыкі. Але мы тут зноў сутыкаемся з праблемай праблем — запісам і выданнем харэаграфічных твораў. Нагадаю расцягнутую на гады сумную «эпапею» з выданнем кнігі «Беларускія народныя танцы» (пастаўлены і запісаны харэографам Янкам Хворастам, цяпер ужо нябожчыкам), «эпапею», якая доўжыцца з 1982 года (выданне павінна было ажыццявіцца ў выдавецтве «Беларусь»). Пераканана: вастрыня гэтай праблемы не здымецца да той пары, пакуль у сістэме Дзяржкамвыда рэспублікі не будзе створана паўнакроўная рэдакцыя па выданні харэаграфічнай рэпертуарнай літаратуры, укамплектаваная вопытнымі, высокай кваліфікацыі спецыялістамі.

Другі шлях — шырока практыкаваць запрашэнне аўтараў харэаграфічных пастановак для ажыццяўлення іх пастановак у танцавальных калектывах рэспублікі, развучваць новыя творы па тэлебачанні, ствараць вучэбныя кінастужкі.

Пастанова калегіі Міністэрства культуры БССР, сакратарыята Белсаўпрофа, сакратарыятаў праўленняў Саюза пісьменнікаў БССР, Саюза кампазітараў БССР, Саюза журналістаў БССР аб падвядзенні вынікаў конкурсу на стварэнне твораў для калектываў мастацкай самадзейнасці, прысвечаных 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, абавязвае метадычныя службы рэспублікі ўключыць лепшыя конкурсныя творы ў дзеючы рэпертуар, увесці як мага хутчэй у практыку культурна-асветнай работы. Зрэшты — гэта справа гонару кожнага, хто звязаў свой лёс з няпростай, турботнай, адказнай, але творчай работай у імя выхавання Чалавека.

Ніна ЗАГОРСКАЯ,
галоўны рэдактар рэпертуарнай калегіі ўпраўлення культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры БССР, член рэпертуарнай камісіі Беларускага рэспубліканскага аргкамітэта II Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці.

Янка СІПАКОЎ

СЯРГЕЙ СЦЯПАНАВІЧ

А ў мяне ў хаце амаль усё падоранае. Канапку, лічы, дзядзька з цёткаю падарылі. Вунь той круглы стол брат Лёшка мне купіў. Настольная лямпа — вось гэтая арыгінальная, як ваза, — таксама падораная. А многія, не ведаючы гэтага, раяць змяніць абстаноўку ў хаце, абнавіць яе, павыкідаць усё ламачча. А я ж не магу ніводнай рэчы выкінуць; бо за кожнаю ў мяне — гара ўспамінаў. Разумееш, мой бацька і гэты дзядзька ўжо былі прадстаўнікамі нейкай новай буржуазіі, якая зараджалася. Буржуазіі з беднякоў.

Вось і Чыкун, адзін мой знаёмы, з такіх жа быў. Селянін з вёскі. На выгляд такі ўжо дрымучы, такі цюхцяй, а хітры-хітры. Неяк убіўся ён да прадаўцоў сала. Там патомныя гандляры салам — і бацька, і дзед, і прадзед з пакалення ў пакаленне перадавалі вопыт. А ён адразу, на голым месцы пачаў — адкрыў свой гандаль і працвітаў.

Мы з ім у рулетку хадзілі гуляць. Механічны іпадром. Фішак спачатку было горы, а потым усё спусцілі. І нават сваё прайгралі. Некалькі разоў схадзілі, а тады Чыкун і кажа: «Не, гэта нешта не тое, тут усё спусціш, што маеш». І больш не прыйшоў. І потым звычайным чалавекам стаў. Пасля гэтай ужо вайны ехаў сваім канём у Мінск і на міну наехаў. Ехаў усёй сям'ёю — жонка, дачка Ніна, ёй гадоў васемнаццаць было, сын меншы — гадоў шаснаццаць. З Барысава ехаў. Усе чатырох і загінулі.

А мой бацька вельмі хацеў разбагацець. Любым спосабам, але каб стаць багатым. Нават нейкаму прайдзісвету паверыў. Той яму сказаў, што трэба тры тысячы рублёў, за іх дадуць 30 тысяч фальшывых залатых манет. Але яны дужа хораша ідуць. Нават далі паспрабаваць. І сапраўды хораша ішлі дзесяткі залатыя. Нават пробу вытрымлівалі. І бацька рашыўся. Паехаў у Рыгу. Паказалі яму чамадан. Адно золата — аж блішчыць. А тады падмянілі чамадан — прывёз дадому пуд медзякоў. А ў першым чамадане сапраўднае золата было, яго, сапраўднае, і на спробу давалі. Таму і ішло яно нармальна. Аказваецца, і таго, што махляваў, таксама абдурылі, а потым сказалі: знайдзі і ты дурня. Вось ён і знайшоў майго бацьку. Бацька да яго: «Дык што ж ты?» — «А ты таксама знайдзі сабе дурня». — «Не, будзь здароў». І гэта ўсё ў гасцініцы. А гэта ж падсуднае дзела, бацька дрыжыць — катаргай пахне. Хвалюецца. Фальшывыя манеты. Махінацыі. Куды заявіш? Каму паскардзішся?

Адразу бедняком бацька мой стаў. Пасаг нейкі ў маці быў — пусцілі. Сам бацька грошы к жаніцьбе збіраў — а гэта было як яны з маці толькі-толькі пажаніліся, — таксама пусцілі. Потым ужо, калі ў Мінску кватэрку здымалі, заходзіць аднойчы спраўнік, што плату праверяў. Маці збялела і гаварыць нічога не можа. Толькі калі ён пайшоў, прамовіла: «Дык гэта ж той, што бацьку золата прадаваў...»

15 ліпеня 1975 г.

— Усё ў мяне неяк на выпадковасцях трымаецца. Вось напішы пра гэта ў кнізе — непраўдападобна, скажуць, так не бывае. А ў жыцці — нармальна.

Да прыкладу, у самым пачатку вайны я ледзь не загінуў. Схаваліся мы ў зручную такую пячору ў крутым беразе Сожа. Сядзім, а немцы страляюць. З гармат. Сяджу я, а мяне нешта шчакочыць і ўсё. І пячора добрая, і сядзець ў ёй зручна, а я не магу і ўсё. Выскачыў і ў другую пабег. Клікаў усіх памяняць схованку, не пайшлі за мною — навошта, і тут жа вельмі надзейна. Некалькі чалавек, праўда, за мною ў іншую пячору, горшую і менш зручную, перабеглі. І толькі мы ўселіся, як у нашу ранейшую схованку снарад трапіў. Нікога пасля выбуху не засталося. А там жа дзяцей колькі было...

Ці, скажам, прыехаў я з Дубровы ў Гомель. Сямён знайшоў мне там кватэру і пісьмо прыслаў. Але пісьмо запазнілася. Я прыехаў у Гомель, а Сямён ужо з групаю сваёю пайшоў далей — ён працаваў на рамонце чыгункі, у іх свой вагончык быў. Яго няма, з кватэру, чакалі-чакалі, ды здалі іншым. І што мне рабіць? А ногі баляць — не магу ісці. Дайшоў да нейкага сквера і сеў. І адчуваю, што падняцца ўжо не змагу. Але ж я гаварыў табе, што ў мяне ўсё на выпадковасцях. «Сяргей, а ты што тут робіш?»—чую я раптам каля сябе. Азіраюся—аж гэта трэба: знаёмы з Дубровы. І як ён мяне пазнаў? Вядзе да сябе ў інтэрнат. А я ледзь іду. Там трэба было па лесвіцы падымацца, дык я не змог—ён нёс мяне на сабе. Больш за тыдзень я ў яго пакоі праляжаў. Добра, што ў мяне грошы былі, мы каменданту ставілі, дык ён і не выганяў мяне, пакуль паправіўся. Той хлопец з Дубровы сказаў, што гэта яго брат.

Нагараваўся я, браце ты мой, за сваё жыццё. І са сваімі хваробамі, і так.

Уяўляеш, бацька памёр. Маці хворая — спазмы. А я ляжу паралізаваны. Есці няма чаго. Сястра Лідзія Сцяпанаўна, ты ж яе знаеш, бачыў у мяне, яна прыязджае да мяне, хлеб нам з Масквы прысылала. Па чатыры буханкі ў пасылцы.

А затым у Казахстане... Я ж табе, здаецца, ужо расказваў крыху. Прашуся, каб мяне куды-небудзь накіравалі, дзе хадзіць меней трэба. А мяне на цагельню. А там тачка, ды па дошках трэба... І гэта з маімі хворымі нагамі. Запратэставаў. Тады мяне рыць яму. А там ужо як пасадзяць з самай раніцы, дык да вечара так і сядзець будзеш: сам не вылезеш. Кідай лапатаю зямлю наверх, ды і ўсё. Праседзеў і там. А затым на гатар. Дошкі рэзалі — шнуроўку. Трэба дошкі прыбіраць. Прыбіраў я прыбіраў тыя дошкі, а вопыту ж няма—штабель і абваліўся. І на мяне, і на мае ногі. Болю не чую, а ўстаць не магу. Крычаў-крычаў — не чуюць. Тады майстар выйшаў, бачыць, дошкі не прыбіраюцца. Мяне заўважыў, разабралі дошкі. А я ўстаць не магу. А на нагах,— хоць бы драпінка. Дактары не вераць: «Нічога ў вас не знаходзім». Глядзяць як на сімулянта. А ў мяне баліць.

Потым пад Карагандою авечкагадоўляй займаўся. Далінка, можа, чуў такую? Стэп навокал. Шырокі-шырокі. І палыном пахне. Можа, адтуль я пах палыну палюбіў. Вось ты ж бачыў, што, я нават на працу палын часам прыносіў. Дзівак, недзе думаў пра мяне. А я, дзе ўбачу палын, не магу ўтрымацца, каб не сарваць. Рукі натру і дыхаю палыном. А яшчэ ён мне апетыт ствараў. Панюхаю — і адразу есці захочацца. Бо ўладаў часцей за ўсё. Есці не было чаго. Дык мы авечак раздойвалі і авечае малако пілі. Хоць гурт мы пасвілі і вялікі, але зарэзаць ніводнай нельга было. Толькі ўжо калі воўк якую з'есць, тады ўжо воўчае аб'еддзе — наша. Тады ўжо і мы жывём, мы з мясам.

Ведаеш, у мяне і праўда павінна была атрымацца нейкая празаічная рэч. Можа, нават раман. І загаловак ёсць. «Дванаццаць апосталаў». Дванаццаць чалавек, дванаццаць характараў, дванаццаць лёсаў. Сутыкненне, перапляценне. Гэта было нешта ў духу Дастаеўскага. Ты ж ведаеш, што я вельмі люблю гэтага пісьменніка. Я яго перачытваў можа разоў з дзесяць. Амаль усяго на памяць ведаю, а ўсё роўна цягне перачытаць... Чуеш, «Дванаццаць апосталаў» было б...

— Чаму «было б»? Сяргей Сцяпанавіч, вы ж па старонках, хоць па абзацу ў дзень пісалі б і зараз. Год прайшоў, уяўляеце, колькі б было гэтых абзацаў. А два гады? А тры... Вось вам і раман.

— Смяешся ты ці што? Ты ж не ўяўляеш, якія я пакуты цярплю. Гэта ж калі мне лепш, і то — як зубны боль. А ты сам, скажы, з пастаянным зубным болем змог бы пісаць?..

— Тады, можа, давайце магнітафон купім. І, калі вам стане крыху лягчэй, вы будзеце нагаворваць на яго свой раман.

— Не, не. Нічога з гэтага не атрымаецца. Я ўжо ведаю, што гэты мой раман так і застанецца ненапісаным. Пойдзе разам са мною ў зямлю. Хоць ён ужо і абдуманы ўвесь. Я нават цэлыя кавалкі бачу, нібыта яны ўжо і напісаныя...

17 верасня 1975 г.

— Неяк людзі да мяне ўвесь час гарнуліся. І што дзіўна — нават немцы ў вайну. Немец Карл быў такі ў Гомелі. Нам есці і самім няма чаго, а ён прыходзіў да нас бульбу есці. Паранены. Пасля шпіталя. Хоць ён і захопнік, але звычайны чалавек быў. Сам са Штутгарта. «А як гэта перакласці назву вашага горада?» — пытаюся, бывала, я ў яго. Ён і задумаецца: «Гэта... гэта... Ну, як у вас называецца жанчына-конь?» А я ўжо, разумееш, думаў чорт ведае што за назва, уяўляў, што гэта штосьці міфалагічнае нават. «Можа, кабыла?» — пытаюся. «Во-во, кабыла!»—радуецца немец. Аказваецца, Штутгарт — гэта кабылін сад! Немец угаворваў мяне напісаць для нейкай газеты іхняй заметку. Ён бы яе са сваімі каментарыямі там змясціў. «У Штутгарце?» — «Не, у Берліне». Ён быў там нейкі карэспандэнт. Пісаў у газету франтавыя заметкі. Я адмовіўся ад яго прапановы. Ён нават раззлаваўся на мяне за гэта. А я ж у падполлі, мне гэтая злосць, сам разумееш, магла нашкодзіць.

О, як асцерагацца ўсяго трэба было! Слухай, прыходзіць неяк да мяне дадому чалавек—амаль што незнаёмы, ну мы з ім разы са два недзе сустракаліся—і гаворыць: «Давай створым падпольную групу». Ну, я паглядзеў на яго, паглядзеў, а ён п'яны. Разумееш, тут жа жыццём рызыкуеш, хіба п'яны пра такое пойдзе гаварыць? Бачу я—нешта не тое. Правакацыя. Выгнаў «падпольшчыка». І ведаеш, не памыліўся,— потым я яго ў паліцэйскай форме бачыў.

А як з дзецьмі я дружыў. Мяне дзеці любілі, заўсёды да мяне ліплі. Дзе я, там і іх абавязкова пяць-шэсць круціцца. Бо я з імі, як з дарослымі, як з роўнымі гаварыў. Хачу напісаць для іх і пра іх кнігу. Я ж ведаю, што яны ў Гомелі ў гэтую вайну вытваралі. Як яны нам у падполлі дапамагалі! Я перад імі вінаваты. Вось і нядаўна пазваніў мне нечакана былы хлапчук-падпольшчык. Спытаўся, як жыву, як здароўе, і, ці паверыш, мне так жа хораша, так прыемна стала. Помніць, бачыш. А ён сам тэлефон мой недзе даведаўся і пазваніў.

Старэю я ўжо, відаць. Бо ўвагі хочацца. Часам нават і крыўдна стане, што некаторыя хлопцы не так часта заходзяць да мяне, як бы мне хацелася, а потым падумаю-падумаю, ды і супакоюся: у іх жа свае сем'і, дзеці, праца, свае клопаты. Хапае і ім мітусні, навошта на іх крыўдаваць...

2 ліпеня 1976 г.

— У мяне гэтыя пакуты, мусіць, спадчынныя. Мая маці, я табе ўжо расказваў, таксама ўсё жыццё пакутавала. Спазмы. Кардзіяспазмы. Нічога есці не магла. Як схопяць, дык яна сядзіць і толькі слёзы па бабіне з вачэй сыплюцца. А то ўжо зусім была памірала. Нічога ў рот не брала з тыдзень. Думалі, памрэ. А тады я даў неяк ёй лыжачку малака цёплень-кага — пайшло. Я тады яшчэ. А пасля яечка разбаўтаў. Пакрысе, пакрысе і стала есці. Праўда, толькі жыдзенькае. І ўсё жыццё так пакутавала... Ну вось я табе зноў пра хваробы. А што там у вас новага?

— Ды вось новы Саюз пісьменнікаў пабудавалі. Працуе ўжо. Ці глядзелі вы хоць яго?

— А навошта? Мне ўжо не хадзіць па ім. Мне старога шкода. Там жа ўсё маё пісьменніцкае жыццё прайшло. З ім у мяне самыя светлыя ўспаміны звязаны. Ды і так жа гэта памяшканне ўжо як нейкі помнік было. Навошта вы яго ўзарвалі?

— Зараз жа ўсё ўзрываецца. Узарвём, а потым шкадуем: ай-яй-яй, навошта ж мы такі помнік дванаццатага стагоддзя разбурылі?

— А гэта ўсё таму, што ў нас няма старой, патомнай інтэлігенцыі. Таму і руйнуем усё. Старая інтэлігенцыя не дала б. Абараніла б. У Маскве ж не разбураюць. У Прыбалтыцы трасуцца над кожным каменем. А ў нас... І ўсё таму, што няма ў нас сапраўднай інтэлігенцыі...

Ты даруй мне, але сёння мне нешта дужа блага. Прыходзь неяк другім разам. Пазвані толькі папярэдне. І калі мне будзе лепей крыху, я рады буду цябе бачыць. А зараз прабач. Будзь здароў!

8 верасня 1977 г.

— Чуеш, мой бацька прайшоў праз усе стадыі і ўздыму, і спаду—бядняк, маленькі буржуйчык, савецкі служачы, нэпман і вартаўніком на будаўніцтве стадыёна «Дынама» памёр у 1932 годзе. Пра нашу сталоўку на Архіерэйскай вуліцы, цяпер гэта Чырвонаармейская, я табе ўжо расказваў. Як акцёры, пісьменнікі хадзілі да нас. Як Дудар мне падмігваў. Янку Купалу ўсе любілі, у рот яму глядзелі—так слухалі, што гаварыў. Купала, бывала, абдыме мяне за плечы. Нешта спытае ці сам скажа што смешнае. Колас—той больш маўчаў. І таму я здзівіўся, калі ён на сваім банкеце з нагоды сямідзесяцігоддзя, які зрабіў у Каралішчавічах, абняў мяне і кажа: «Дай, Сяргейка, я цябе пацалую». Я здзівіўся—аказваецца, і Якуб Колас мяне яшчэ па бацькавай сталоўцы помніў.

Вось там, у сталоўцы, я і прыкіпеў да ўсяго беларускага. Нават бацька мой пачаў пабеларуску гаварыць, а да гэтага ж не гаварыў зусім, часам толькі якое слова прарывалася выпадкова. Маці не гаварыла таксама па-беларуску. Але што дзіўна. Яна доўгі час жыла ў Маскве, у сястры, і ў яе мове ўжо нават маскоўскі акцэнт з'явіўся. І раптам — інсульт. І што ты думаеш — нейкія рычажкі там пераскочылі, змясціліся, і яна раптам загаварыла на чысцейшай беларускай мове. Як у дзяцінстве гаварыла, як у маладосці. І так па-беларуску ўжо і гаварыла да самай смерці.

Адкуль я, пытаеш, беларускай мове навучыўся? Ну, папершае, у мяне ж бабка была, дзядзькі мае ў Падгаі, гэта на Міншчыне, жылі. Яны прыязджалі часта да нас, я ля іх вучыўся мове. Затым асабліва многа мне бацькава сталоўка дала. І яшчэ я вельмі любіў на рынку бываць. Цэлымі днямі там сноўдаўся. А тады ж яшчэ горад па-беларуску гаварыў. Ай якая мова была! Сядзіць, бывала, такая прыгожая, высакародная бабулька з Татарскіх агародаў на базары і прадае памідоры. Падыходзіць пакупніца, цануецца: «Колькі просіце?» — «Столькі-та і столькі-та». «Ого, дорага».— «А колькі б ваша імасць дала?» Тая, калі не разумее мовы, не ведае, што яе так хораша назвалі, адыходзячыся, злуецца: «Вашай імасцю толькі свіней называць». Яна нават і не здагадваецца, што «ваша імасць»— гэта тое ж, што і «госпожа», што гучыць гэта з вуснаў бабкі вельмі натуральна, а бабка не разумее, за што тая пакрыўдзілася — у іх жа ў сям'і, у іх хаце ўсе так гавораць.

А цяпер дзе ты пачуеш «ваша імасць»? Ні чарта вы не зрабілі і не зробіце. Няма ў нас сапраўднай інтэлігенцыі. Вось паслухай, што пішуць... Падай мне вось гэты том. Ага, ага, гэты. Адгарні 258 старонку. Слухай: «Улетку 1936 года былі ўзарваны і звезены два нуклюдныя помнікі эпохі царызму: праваслаўны сабор на Пляцы Волі, царква каля Заходняга чыгуначнага моста, на тым месцы цэнтральнай магістралі Мінска, аднуль пачынаецца Савецкая вуліца. Стылёвыя асаблівасці гэтых будынкаў рэзалі вока нават тады, калі Мінск не меў яшчэ такіх, як цяпер, сталічных рыс. Ад знішчэння гэтых дзвюх былых цвярдынь імперскага праваслаўя пачалося ажыццяўленне вялікага плана перабудовы горада». Чуеш? Радавацца, што ўзарвалі помнікі культуры? Жах! Хіба можна так пісаць?!

— Яму, відаць, хтосьці ўпісаў гэта.

— Як гэта ўпісаў?! Хіба можна дазволіць упісваць такое? Калі я вярнуўся ў Мінск, яшчэ можна было сёе-тое выратаваць. Можна было аднавіць ратушу, катэдру на Пляцы Волі, касцёл на Залатой Горцы. Ён быў вельмі прыгожы, як лялька, яго пабудаваў нейкі італьянскі майстар. Кажуць, што яго аднаўляць будуць. Я і сам недзе чытаў пра гэта. Вельмі правільна было б, каб аднавілі. Бо многае ўжо, калі і захацеў бы, не адновіш. Вунь архіерэйскі палац, сабор убудавалі ў Дом афіцэраў, а катэдру — у спартыўны будынак на Пляцы Волі.

Гэта бяда нашага горада. Заўсёды яму неяк не шанцавала. Багацейшыя ішлі ў шляхту — яны ўжо, бачыш, палякі, а ўсё духавенства, адукаваныя людзі — рускімі пісаліся. І толькі сялянства аставалася нейкім астраўком, які бярог усё, што называецца беларускае. Сялянства знікае. Хто ж далей будзе ягу неацэнную справу рабіць? Хутка ж у вас зусім нікога не застанецца, хто чытаць вашы творы ў арыгінале зможа. Хто яго ведае, можа, вы якраз і ёсць апошнія магікане.

А сярод нас чамусьці многа фанабэрыстых, важных людзей з'явілася. А чаго фанабэрыцца? Рабі сваю справу шчыра, ды і ўсё. Фанабэрыстыя людзі—гэта дурныя людзі. Яны не ўмеюць суразмерыць тое, што могуць і тое, што хочуць.

— А вот і вы б занялі, да прыкладу, нейкую адказную пасаду, скажам, рэдактара, і таксама б важным зрабіліся.

— Смяешся ты ці што? Ты ж бачыў мяне сакратаром, загадчыкам аддзела. Ці быў я важны?

— Не.

— Думаю, што і рэдактарам я такім бы самым быў.

А што вы, фанабэрыстыя, напішаце? Якую праўду? Скажам, пра раскулачванне хто праўду напіша? Пра голад пасля раскулачвання? «Страна Муравия», кажаш? Кінь ты! Яна ж толькі зверху ў гэту тэму заходзіць. Я пра боль кажу. А я ж сам такое бачыў. Галодныя беспрытульнікі хлеб вырывалі ў прахожых і нікуды не ўцякалі, а тут жа валіліся на зямлю і тут жа прагна пачыналі есці, спяшаючыся, каб больш з'есці. Іх б'юць па галаве, па твары нагамі, таўкуць з усіх бакоў, а яны спяшаюцца есці, у рот паболей напіхаць. Што з'ясі—тое тваё. Дык яны што з'ядуць, а што так выкачаюць у пылу, што ўжо астатак хлеба ў іх і не забіраюць—даядайце. Бачыш, якія галодныя — нават не чуюць, што іх па галаве б'юць нагамі, а ты кажаш «Муравія»! Дзе гэта ў літаратуры ёсць? Няма. І, відаць, не будзе. Гэта толькі ў памяці можа застацца. Як дзяцей кулацкіх — галодных і халодных — высялялі. А куды? А навошта? Тыя равуць, а іх з хаты выганяюць. А выццё звярынае Саўкавай жонкі і яе дзяцей у мяне і сёння ўвушшу стаіць. Вось я чуў, бачыў, расказаў табе, а ты запомні. Запомні і іншым перадай.

Даруй, мне зноў дужа блага стала. Пайду, лягу. Некаторыя дурні злуюцца, калі я так гавару, кажуць, што я выганяю. Ты ж мяне ведаеш, і хваробу маю ведаеш, а таму, спадзяюся, злавацца не будзеш. Заходзь у любы час. Толькі пазвані папярэдне.

17 верасня 1977 г.

У гэты дзень мы заўсёды штогод збіраліся да Сяргея Сцяпанавіча. Прыйшлі і сёлета, каб пабыць разам з ім у дзень яго сямідзесяцігоддзя.

У кватэры мноства кветак, цесна ад сяброў і радні. Брат Лёшка, Аляксей Сцяпанавіч, сястра Лідзія Сцяпанаўна. І сам Сяргей Сцяпанавіч нейкі ўвесь іранічна-ўзрушаны.

Перад гэтым у Саюзе пісьменнікаў БССР адбыўся цёплы літаратурны вечар, на якім шчыра гучала Дзергаёва паэзія — шкада, што на гэтым вечара-

---

Заканчэнне. Пачатак у № 29.

ры ён не змог папрысутнічаць, сам; беларускае тэлебачанне зрабіла харошую перадачу пра яго; Сяргея Сцяпанавіча ўзнагародзілі самаю высокаю ўзнагародаю, якую мае Беларусь,— Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Павіншаваць Сяргея Сцяпанавіча прыйшлі дадому сакратары Саюза пісьменнікаў — Анатоль Вярцінскі, Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў — дарэчы, таксама ўсе яго вучні і выхаванцы. Чытаюць тэлеграмы з Украіны, Узбекістана, Казахстана, Туркменіі і з іншых рэспублік. Паказваюць буклеты:

— А вось мы вам якую візітную картачку зрабілі, рэкламку з партрэтам, з біяграфіяй...

Сяргей Сцяпанавіч усё гэткі ж іранічна-ўзбуджаны. Усміхаецца адною толькі губою.

— А я ведаю, нашто вы яе рабілі. Вы зрабілі сваю рэкламку, каб тэлеграмы вось гэтыя атрымаць.

Потым неяк весела зірнуў на аднаго з сакратароў:

— Слухай, а калі ты, хлопец, мае штаны аддасі?

— Якія штаны? — разгубіўся той.

— Тыя, што ты студэнтам пазычаў у мяне, каб на бульбу з'ездзіць.

Мы засмяяліся. Рагатаў і сам сакратар. Усё гэтак жа, недзь улоўна, адною губою, усміхаўся Сяргей Сцяпанавіч.

— Усе вы да мяне туліліся. У іншых былі жонкі, маглі насварыцца, выгнаць, а ў мяне не было. Таму вы ўсе да мяне ішлі. Суседкі ў агульных кватэрах злаваліся за гэта на мяне, нават лаяліся — натопчуць, маўляў, наслядзяць, насмецяць. А я ўсіх вас прымаў. Што было — дзяліўся. Галодных з хаты не выпускаў. А помніце, чэрці, як мы з вамі яечню на прасе смажылі. Хто ж гэта тады быў? Здаецца, Барыс, Грышка і Янка? Але ж вы і навыдумлялі пасля. У мяне нядаўна адзін на поўным сур'ёзе пытаўся: «Дык, а што вы, сапраўды, яйкі на гарачы прас узбівалі?» А мы ж, памятаеце, перакулілі прас, разагрэлі яго, а зверху патэльню паставілі. І на ёй яечню смажылі. Бачыце, а тут ужо цэлая легенда атрымалася.

Я калі і ў «Полымі» быў, стараўся хлопцаў надрукаваць. На мяне за гэта ўжо і сварыліся: «Слабыя вершы друкуе». Мяне за гэта адтуль і папрасілі, у «Вожык» перакінулі. Кажуць, на Эдуарда Валасевіча памянялі. А цяпер Максім Танк неяк казаў мне: «Бачыш, ты ж, Сяргей, навырост глядзеў. Верыў у гэтых хлопцаў, таму і слабыя іхнія вершы даваў». А я тады надрукаваў Гілевіча, Чыгрынава, Нядзведскага. Аднаго хлопца ўсё хацеў і ніяк не мог надрукаваць — бачыў, што чалавек гэты таленавіты, але ў яго ўсё неяк дыбаром стаяла. А вось некаторых і не хацеў друкаваць, і не мог. Бачыў, што яны бесталанныя людзі. І як час паказаў,— не памыліўся: яны і зараз на тым жа ўзроўні асталіся...

Сяргей Сцяпанавіч выпіў нават з намі крыху шампанскага. Разгаварыўся. Гаварылі доўга. Пераскоквалі з тэмы на тэму:

— Як гэта мала — у нас на дзесяць мільёнаў толькі два тэатры,— засмучаўся Сяргей Сцяпанавіч.

— Як гэта два — у нас жа больш,— усумніўся нехта.

— Я кажу пра беларускія тэатры,— стаяў на сваім Сяргей Сцяпанавіч.

Потым раптам загаварыў пра Пушкіна.

— О, гэта майстар. Вы толькі паслухайце: «Тиха украинская ночь». І «горит восток зарёю новой». Здаецца, што гэта напісана рознымі памерамі. Аж гэта адзін і той жа. Вось майстэрства — у адным памеры быць розным, непадобным, — звярнуўся ён раптам да мяне.— А ты не заўважыў, якім памерам мая «Хірасіма» напісана? Гэта ж малітва, памер «Отча наш».

Загаварылі пра гады.

— Ну, нічога, да васьмідзесяці вы дажывяце. І мы на ваша васьмідзесяцігоддзе збяромся во так во ля вас...

— Смеяцеся вы, ці што? Не дай ты бог—такія пакуты.

Многае запомнілася з той урачыстай юбілейнай сустрэчы. Але найбольш — іранічна-ўзбуджаная, толькі адною губою, усмешка...

19 жніўня 1978 г.

— Слухаў я, што ты гаварыў пра мяне па тэлевізары. Што ж ты выдумляеш? Мы ж не «Скупога рыцара» ставіць хацелі, а «Барыса Гадунова». Нават сцэну зрабілі ў двары, дэкарацыі. Усур'ёз збіраліся ставіць. А так усё правільна. І пра тое, як я адну рэпліку ў «Бежыным лузе» казаў: «А не сварились ли картошки?» А чаму пра маю другую ролю не ўспомніў? Памятаеш, я табе казаў, што кітайчыка іграў? Касічкі мне прыляпілі, апранулі нязвычна... Відаць, забыўся. І пра тое, што я б акцёрам стаў, таксама правільна. Я б і праўда быў у тэатры, каб мяне ногі не падвялі.

А яшчэ ведаеш, кім бы мне хацелася папрацаваць, калі б я здаровы быў? Папом, свяшчэннікам. Што, пра гэта па тэлевізары не скажаш? Дарэчы, ты ж во не знаеш беларускіх святых? Канечне, не знаеш, адкуль табе знаць...

Ведаеш, я царкву любіў. Не, канечне ж, не як аплот рэлігіі. Я царкву, зноў жа, любіў, як тэатр, — за маляўнічасць. Каб ты ведаў, як хвалююча гучыць у царкве чалавечы голас: «блаженной матери нашей Ефросиньи Полоцкай», «Святаго мученика младенца Гавриила»...

Гэта ж во зараз, чэрці, усё пазруйнавалі. А які прыгожы наш горад раней быў, якое аблічча цудоўнае меў! Глядзі, гэта ж толькі вунь ля заходняга моста тры царквы было. Старая, драўляная, мяне ў ёй хрысцілі, ды і ты казаў, што як быў студэнтам, дык туды на ўсяночную хадзіў. Затым — сабор. І яшчэ царква для сляпых, прыгожая, прыгожая, быццам лялька — як усярэдзіне, так і звонку. Потым яе разабралі, з яе бёрнаў пабудавалі двухпавярховы дом на Ізвознай, гэта ў раёне цяперашняй вуліцы Розы Люксембург. Фрэскі былі, усё прапала. І сабор новы, там, вядома, не было фрэсак старых, але таксама прыгожы. Чыгуначнікі для сябе яго будавалі, таму і пастараліся.

Далей, глядзі, мітрапалічны двор, цэлы ансамбль. Тут жа сад. Потым Залатая Горка. Потым вось тут, на Пляцы Волі, такі ансамбль зноў жа быў. Гарадская ратуша, і тут сабор — прыгожы, чатырохалтарны. Маё дзяцінства ў гэтым саборы прайшло. Там я прыслужнікам быў. Нас тады часта са школы пасылалі ў царкву. Нам гадоў па адзінаццаць-дванаццаць было. Што прыслужнікі рабілі, пытаеш? Кадзіла раздзьмухвалі і падавалі, арляцы пад ногі епіскапам клалі. Арляцы — што гэта такое? А гэта дываток такі з вытканым на ім горадам, над якім распасцёр крылы арол. Посах падавалі.

Аднаго разу мы, падшыванцы, віно для прычасця выпілі. Свяшчэннік — як зараз помню прозвішча — Хіраска, яго дачка і зараз у оперным тэатры выкладае нешта — заспеў, як мы пілі. Проста пажурыў нас, сказаў, што так рабіць непрыгожа, але крычаць асабліва не стаў, харошы быў чалавек.

17 верасня 1979 г.

— Кажаш, я на свае семдзесят два гады не выглядаю? Думаеш, пастарыў сябе? Не. Толькі на два месяцы пастарыў. Я нарадзіўся недзе ў лістападзе. А гэта, відаць, наш род такі. Мой і бацька ў пяцьдзесят два гады паміраў, а быў як хлопец усё роўна. Ён побач з маёй маці як сын яе выглядаў. Некаторыя так і лічылі: сын. Адзін ужо нават прыйшоў і пытаецца ў маёй мамы: «А дзе гэта ваш сын?» — «Во ён»,—і маці паказвае на мяне. «Не, я пра старэйшага пытаюся». А гэта ён пра бацьку пытаўся. І маці, і яму стала няёмка... Ты кажаш, як жа я мог пастарыцца, калі я помню, як у трынаццатым годзе цар Мікалай II па Мінску ехаў. Як перад гэтым гірлянды плялі і ў іх сцяжкі ўпляталі. Помню, што спачатку не ведалі, як сцягі шыць, якія палосы зверху, а якія знізу павінны быць — чырвоныя, белыя, сінія ці наадварот. Таксама не адна машына ехала. Я з балкона глядзеў. Да таго ж я нават у царскай гімназіі тры гады вучыўся — чатырнаццаты, пятнаццаты і шаснаццаты гады. У гімназіі Фалькоўскага і Зубатава. На пражках так і было ў нас напісана — «ГФЗ». Як цяпер помню. Фалькоўскі гарнуўся душою да беларускага. А нядаўна я ў «Звяздзе» пра яго прачытаў. Гляджу, Фалькоўскі К. В. Канстанцін Восіпавіч? Канечне, ён! Аказваецца, ён цікавіўся беларускім фальклорам, збіраў яго. А выкладаў ён рускую літаратуру. Потым, як пачалася вайна, яго і самога выселілі ў нейкі драўляны дом, і гімназію выселілі. А там госпіталь для параненых зраблі. А гімназія была на цяперашнім скрыжаванні вуліц— Чырвонаармейскай і Кірава.

Ну, будзь здароў. Прывітанні там хлопцам перадавай. Каму перадаваць — сам выбірай. Ты ж мае сімпатыі ведаеш, і калі чалавек не сапсаваўся, застаўся чалавекам,— перадавай усім. Словам, усім харошым людзям.

Лістапад, 1980 г.

ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА

— Дык што гэта цябе доўга не відно было? Адпачываў, кажаш? У Крым ездзіў? Нават у Ялце быў? Ого! Я так і падумаў, што цябе ў Мінску няма, калі ты да мяне на дзень майго нараджэння нават не прыйшоў. Заўсёды ж прыходзіў, а то пуста, няма. Ну, добра, заходзь зараз, пагамонім. Як гэта не адзін? З якімі яшчэ дзяўчатамі? Я хворы ляжу, а ён да мяне, ці чулі вы, з дзяўчатамі збіраецца прыходзіць. Не выдумляй! З якога тэлебачання? Які фільм? Пра мяне? Смяешся ты, ці што? Што, яны, кажаш, папрасілі цябе ўгаварыць Дзяргая, каб згадзіўся здымацца? Мала што папрасілі. Нават і не думай мяне ўгаворваць. Нічога не атрымаецца. Па-першае, я, ты ж ведаеш, не ўмею выступаць, не ўмею гаварыць і баюся твайго тэлебачання, як чорт ладана. А, па-другое, наогул навошта ўсё гэта? Рашылі, што Дзяргай стары і хворы, хутка памрэ і нічога пасля яго не астанецца? Ну, дык і бог з ім. Ты ж ведаеш, што я хадзіць зусім не магу, куды я на ваша тэлебачанне паваланюся? Дадому, кажаш, прыйдуць? Не, і гэта таксама не трэба. Як гэта ты без дазволу да мяне прыйдзеш з імі? Я ж зачынюся ў хаце і не пушчу нікога — ні цябе, ні твайго тэлебачання. Званіць будзеце, грукаць? Ну і званіце, ну і грукайце. Колькі ўлезе. А я не адчыню ды і ўсё. Яшчэ раз табе кажу, нічога гэтага не трэба рабіць, нічога з гэтага не атрымаецца. І не трэба мяне ўгаворваць. Чуеш? І калі ты не перастанеш тлуміць мне галаву са сваім тэлебачаннем, я пакладу трубку. Што — «паслухайце»? І слухаць нічога не хачу. Я табе яшчэ раз кажу, я хворы і ні для якіх фільмаў здымацца не збіраюся...

І ў трубцы пачуліся кароткія, і мне нават здалося — раздражнёныя гудкі.

Снежань, 1980 г.

І вось могілкі за Навінкамі. Бясснежная зіма — зямля рэдка пакрыта белымі крупамі. Толькі што выкапаная магіла. Жоўты пясок б'е ў вочы. І ля ямы — Сяргей Сцяпанавіч у труне. Ляжыць нерухома, павярнуўшыся тварам да неба.

Доўга стаім ля труны. Далакопы недзе забавіліся — ці не яны гэта хаваюць вунь там нейкага іншага чалавека? Спачатку злуемся — бач, і тут парадку няма, і тут трэба чакаць... А потым з'яўляецца іншая думка: дык гэта ж добра, што недзе затрымаліся далакопы, што Сяргей Сцяпанавіч яшчэ нейкую гадзіну пабудзе з намі: відаць, гэта само жыццё не хоча адпускаць яго. Дзень апагодзіўся. На блакітным-блакітным небе з'явілася яркае, хоць і халоднае сонца. І яшчэ доўга, пакуль не прыйшлі далакопы, Сяргей Сцяпанавіч, здавалася, не адрываючыся, прагна глядзеў праз закрытыя павекі сваімі блакітнымі вачыма ў блакіт неба, нібы стараючыся навечна наглядзецца гэтага дзіва.

І неяк міжволі думалася, што блакіт ягоных добрых вачэй вось зараз назаўсёды паядноўваецца з бязмежным блакітам неба.

МОЙ РОДНЫ КУТ



ГОМЕЛЬСКІ ВЯТРАК

Добра помню, як я пазнаёміўся з ім упершыню. Які ўжо дзень даймала шэрае, нуднае надвор'е. Было і холадна, і голадна. Хлеба ў доме ні грама. Сядзелі мы — маці, сястра і я — на адной бульбе. І раптам бачым, у канцы вуліцы, на ўзгорку, ветраныя крылы закруціліся. Усе мы ўзрадаваліся. Мама загадала мне аднесці крыху зерня змалоць. Я адразу ж узяўся за справу.

Ужо вечарэла, калі я прыйшоў туды. Было халаднавата. І я ў чаканні чаргі, назіраў за работай рукатворнага цуду нашых продкаў. За млынавай сцяной шалёна хлопалі палотнішчы па рашоткавых пласнасцях чатырох млынавых крылаў прамавугольнай формы. Робячы абароты, адно з іх ледзь не дакраналася да зямлі, у той час як супрацьлеглае ўзлятала высока над макаўкай ветрака і ў імклівым парыве ляцела па крузе ўніз, саступаючы месца суседняму крылу. Рыпелі снасці і ўмацаванні над каменным колам. Стукала ўмяшчальная дашчаная скрыня, конусападобная ў ніжняй яе частцы, з латка якой струменьчыкам, шырынёй у даланю, сыпалася зерне праз адтуліну ў жоране; з-пад яго латка сыпалася ў мяшок мука, якая пахла жытнім полем. А прыродная стыхія ўсё ганяла і ганяла каменнае кола па гадзіннікавай стрэлцы, наносячы адчувальныя ўдары па латку з зернем рабрыстай часткай тоўстага стрыжня з моцнага дрэва, адзін канец якога быў наглуха замацаваны да жорана, а другі ўздымаўся пад самы купал і там таксама мацаваўся да механізма, дзякуючы чаму стрыжань круціўся вакол сваёй восі.

Цяпер я ведаю, што такіх арыгінальных ветракоў было не так многа на Беларусі. Архітэктурная канструкцыя іх была выканана на высокім мастацкім узроўні. Даводзіцца толькі шкадаваць, што нам не ўдалося захаваць гэтыя цудоўныя ўзоры матэрыяльнай культуры, выдатныя помнікі даўніны.

Часам паказваюць па тэлебачанні запаведныя куткі, дзе сабраны прадметы народнага побыту, у тым ліку і ветракі. Але ніводнага я не бачыў сярод іх такой канструкцыі, як тыя нашы, гомельскія, якія былі разбураны на нашых вачах. Большасць драўляных ветракоў, якія я бачыў на тэлеэкране, на старонках газет і часопісаў, а таксама ў іншых абласцях Беларусі адразу пасля вайны — тады яны яшчэ вельмі патрэбныя былі, як правіла, нагадвалі шпакоўні вялізных памераў, пастаўленыя проста на зямлі. Прычым, калі вецер змяняў напрамак, млынар павінен быў паварочваць усё збудаванне, каб паставіць лопасці супраць ветру. У эстэтычных адносінах такія ветракі саступалі тым, пра якія я расказваю.

Вось ён. Шматгранны высокі цоколь з чэсаных паленаў, шчыльна прыгнаных і пасаджаных на мох ці пакулле, ляжаў на мураваным падмурку. На цокалі ўзвышалася цэнтральная частка ветрака, абшытая цёсам. Выклікаў захапленне прыгожай строгасцю сваіх ліній дзесяціметровы канічны цыліндр з дрэва, увенчаны прыгожым багатым шлемам, верх якога складаўся з плоскіх трохкутнікаў. Іх вяршыні пад невялікім вуглом сыходзілся і складалі пік. Галава млына мацавалася на двух тоўстых бярвеннях у гарызантальным становішчы, на нейкай адлегласці адно ад другога, старчакі якіх выходзілі вонні. Да іх намёртва мацаваліся доўгія лясіны, па пары з кожнага боку. Унізе, ля самай зямлі, яны злучаліся, нагадваючы разведзеныя нажніцы. Там, дзе яны разам мацаваліся тоўстым дубовым цвіком, манціравалася лябёдка. Яна складалася з драўлянага цыліндра і штыра, трывала замацаванага на стыку чатырох лясін. Вакол цоколя былі ўкапаны дубовыя слупкі метровай вышыні на строга размеранай адлегласці ад яго з двухметровым інтэрвалам паміж імі. На лябёдцы знаходзіўся металічны трос, звычайна кавалак ланцуга ці пяньковы асаблівага плясцення канат, адзін канец якога замацоўваўся на ёй, а другі, з пятлёй, накідваўся на бліжэйшы слупок. Наматваючы рычагом трос на цыліндр і пры неабходнасці перакідваючы пятлю на чарговы слупок, млынар прыводзіў вятрак у рабочы стан: купал ветрака паварочваўся па гадзіннікавай стрэлцы, а разам з ім і крылы ветрака, насаджаныя на вал. Крацістыя лопасці з разгорнутымі палотнішчамі, гранічна туга нацягнутымі з падветранага боку, на ўсю даўжыню рашотак, і прывязаныя трывалымі вяроўкамі за вуглы крылаў, ставіліся супраць ветру, а цокаль і корпус заставаліся на месцы. Лопасці ветрака пачыналі круціцца, прыводзячы ў рух вакол сваёй восі вертыкальны вал, на ніжні канец якога быў насаджаны асаблівай апрацоўкі плоскі да трыццаці сантыметраў таўшчыні круглы камень метры паўтара ў дыяметры з насечкамі ў ніжняй частцы. У цокальным паверсе знаходзіліся два такія камяні. Пры моцным ветры працавалі абодва. Паміж імі шырокая з тоўстых дошак лесвіца дазваляла праводзіць неабходныя аперацыі па размолу зерня, а таксама давала доступ да агрэгатаў ветрака.

Зерне, ператворанае ў муку, не губляла прыроднага водару, таму што не гарэла пад каменем. На адлегласці можна было вызначыць, які злак у жорнах. Размеранае варочанне каменнага кола як бы ашчаджала прыродныя ўласцівасці зерня.

Днём такое збудаванне было падобнае на вялізны падасінавік ці падбярозавік на высокай ножцы, да капялюшыка якога былі прымацаваны чатыры крылы. А ў шарую гадзіну ці ў месяцавую ноч наш вятрак, быццам былінны волат, стаяў на варце вясковага спакою і дабрабыту.

Да таго ж у любы час года ён быў надзейным арыенцірам падарожніку ў часіны непагадзі і бездаражы. Такі быў наш арыгінальны гомельскі вятрак.

І. ПЛАДУНОЎ.
Мал. аўтара.

в. Асмолавічы,
Рагачоўскі р-н.

АБМЯНЯЛІСЯ ТВОРАМІ

Цесная дружба ўстанавілася паміж членамі літаратурнага аб'яднання «Натхненне» пры рэдакцыі Бялыніцкай раённай газеты «Зара камунізму» і членамі літаратурнага кабінета пры рэдакцыі газеты «Росіца» горада Сеўліева Габраўскай акругі Народнай Рэспублікі Балгарыі. Пачаткоўцы знаёмяць адзін аднаго са сваёй творчасцю, абменьваюцца навінкамі.

У канцы мінулага года на старонках «Росіцы» былі прадстаўлены творы членаў літаб'яднання «Натхненне», а нядаўна бялыніцкая раённа адвяла старонку творам балгарскіх сяброў. Змешчана апавяданне кіраўніка літаратурнага кабінета, адказнага сакратара «Росіцы» С. Савава, вершы настаўніц Х. Барысавай і Т. Спахіевай, культработніка Р. Велевай, фрэзероўшчыка - інструментальшчыка Д. Генчава, малюнак мастака Я. Басецкага.

Пераклалі творы з балгарскай паэт В. Хаўратовіч, журналісты М. Радоўскі, С. Сямёнаў, М. Карпечанка, В. Дзеравяшка, бібліятэкар А. Войлахава.

С. ІВАЛГІН.

Калектыў Аб'яднанай дырэкцыі дзяржаўных літаратурных музеяў г. Мінска выказвае глыбокае спачуванне старшаму навуковаму супрацоўніку Дунаеўскай Аксане Барысаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

ВЫСТАЎКІ

Мы з Беларусі.

Творчую справаздачу ў Палацы мастацтва трымае Сямён Герус. Значную частку экспазіцыі займаюць партрэты вядомых дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва, выкананыя аўтарам у розныя гады — паэтаў Петруся Броўкі, Максіма Танка, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Грахоўскага, празаіка Аляксея Кулакоўскага, кампазітараў Юрыя Семянякі і Генрыха Вагнера, скульптара Заіра Азгура і іншых. Тэма людзей мастацтва пастаянна цікавіць С. Геруса, аб чым, у прыватнасці, сведчаць і такія работы, як «Максім Багдановіч у Ялце», «Адам Міцкевіч на Замкавай гары» і інш.

Працуе С. Герус у галіне станковай графікі, у тэхніцы лінагравюры, афорта, літаграфіі. Паспяхова распрацоўвае мастак і тэмы, у якіх раскрываецца дзейнасць Уладзіміра Ільіча Леніна — «Мы з Беларусі», «Ленін у Разліве», «Ленін ля акна» і іншыя.

На выстаўцы прадстаўлены шэраг замалёвак з аўтарскіх альбомаў, а таксама тыя работы, што з'явіліся пасля паездак С. Геруса за мяжу.

Адам Міцкевіч на Замкавай гары.

Выстаўка твораў маладых мастакоў Таджыкістана — адна з экспазіцый, якія працуюць у гэтыя дні ў Палацы мастацтваў.

Увагу наведвальнікаў прыцягваюць такія творы, як «Танец» Р. Сафарава, «На ўзлётнай паласе» В. Вайса, «Цёплы вечар» М. Холава, «Мелодыя» А. Сайфутдзінава, «Партрэт брыгадзіра бульбаводаў, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Таджыкістана Б. Худайдодава», выкананы Р. Тураевым, і іншыя. У гэтых работах адлюстраваны сённяшні дзень братняй рэспублікі, звычаі яе народа, апяваецца прыгажосць горнага краю.

Здаўна славяцца вырабы халмагорскіх і чукоцкіх майстроў, якія з пакалення ў пакаленне перадаюць сакрэты апрацоўкі косткі. Здавалася б, ніхто не можа паспаборнічаць з імі. Аказваецца, могуць табольцы. У гэтым змаглі пераканацца тыя, хто пабываў у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. «Сібірскія дываны і разная костка» — так называецца экспазіцыя, якую са сваіх фондаў прапанавала Цюменская карцінная галерэя.

Асноўнае месца ў экспазіцыі займаюць вырабы з косткі. Цэнтр жа апрацоўкі мамантавай і маржовай косткі здаўна знаходзіцца ў Табольску. Паколькі экспазіцыя мае рэтраспектыўны характар, можна прасачыць, як гэты від народнага ўмельства развіваўся з XVII стагоддзя па сённяшні дзень. Аўтарамі унікальных вырабаў з'яўляюцца ненцы, мансійцы, ханты. Прадстаўлены і прыкладныя рэчы, аднак найбольш уражваюць скульптурныя вырабы, асабліва фігуры казачных персанажаў, герояў вядомых твораў.

У Бабруйскай выставачнай зале адначасова працуюць дзве экспазіцыі. У першай з калекцыі Таруньскага акруговага музея — «Польскі жывапіс XX стагоддзя» прадстаўлена 80 твораў — партрэт, тэматычная кампазіцыя, пейзаж, нацюрморт.

Вылучаюцца палотны «Мірная маніфестацыя» П. Фірлея, трыпціх «Свабода. Вайна. Няволя» Я. Мальчэўскага, «Касмічная прэлюдыя» У. Шпрынгера, «Партрэт пані Я. С.» Л. Слядзіньскага і іншыя.

У другой экспазіцыі — 80 графічных аркушаў, выкананых студэнтамі мастацкага факультэта Таруньскага універсітэта ў русле абстракцыянізму.

Знаёмства з выстаўкамі дапамагае прасачыць эвалюцыю польскага жывапісу ад пачатку XX стагоддзя да нашых дзён, даведацца пра творчыя пошукі маладога пакалення мастакоў. Сімвалічна, што выстаўкі працуюць у дні, калі польскі народ адзначае сваю 43-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

В. ЗЯМСКОЎ.

Экслібрыс Уладзіміра Караткевіча.

Знаёмячыся з творамі Анатоля Тычыны ў Палацы мастацтваў, быццам перагортваеш асобныя старонкі гісторыі беларускага савецкага мастацтва. Доўгім быў жыццёвы і творчы шлях майстра, толькі некалькі месяцаў не дажыў ён да свайго 90-годдзя, якому і прысвечана экспазіцыя, шмат паспеў зрабіць ён.

Удзельнік рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выставак з 1920 года, А. Тычына адзін з тых, хто стаяў ля вытокаў беларускай кніжнай графікі. Паасобныя з гэтых работ, пазначаныя дваццатымі і трыццатымі гадамі, па-свойму даносяць подых свайго часу — велічнага і неспакойнага, калі закладваліся асновы нацыянальнага мастацтва. Ілюстрацыі да твораў Янкі Купалы, Змітрака Бядулі, Кандрата Крапівы і іншых пісьменнікаў — гэта не толькі прачытанне творчасці аўтараў, якіх любіў А. Тычына, але і першыя спробы выказаць сваё мастакоўскае «я», выявіць творчую індывідуальнасць. І адначасова відавочна, што ўжо на пачатку творчай дзейнасці яму было цесна ў рамках нейкага аднаго жанру, пэўнай тэхнікі выканання.

А. Тычына пачынае спрабаваць свае сілы ў галіне станковай графікі, займаецца экслібрысам. Далей творчыя мажлівасці яго пашыраюцца. Пасля вайны А. Тычына ўсё больш працуе ў тэхніцы каляровай лінагравюры. Усе гэтыя бакі яго творчасці і адлюстраваны на выстаўцы.



Зноў у рэйс.



Праспект Машэрава будуецца.

Уражваюць таксама і графічныя лісты, якія паказваюць розныя куткі Мінска, найперш старога, гістарычнага, у якім захаваліся многія помнікі даўніны.

НАШ КАР.

НА ДАЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

З 27 ліпеня па 2 жніўня

27 ліпеня, 20.15

II УСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ, ПРЫСВЕЧАНЫ 70-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА.

Вы ўбачыце выступленне народнага ансамбля танца «Крыніцы» Віцебскага вытворчага аб'яднання «Даламіт».

28 ліпеня, 18.15

ПАЭТЫЧНЫ СПЕЎ НАДДЗВІННЯ. ПАЭТЫ — ПРА ПОЛАЦК.

Перадача знаёміць з членамі навапалацкага літаб'яднання «Крыніца». Вядучы — Яўген Лецка.

28 ліпеня, 19.50

РОДНАЕ СЛОВА.

Сюжэты тэлечасопіса раскажуць пра значэнне «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага ў развіцці грамадскай думкі на Беларусі; пазнаёмяць з сучасніцай Я. Купалы Вандай Шумскай з вёскі Мар'яліва Мінскага раёна — дасціпнай апавядальніцай.

28 ліпеня, 20.20

МУЗЫКА МАЕЙ РЭСПУБЛІКІ.

Д. Смольскі. Сімфонія № 4.

Выканаўцы: лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя Паганіні скрыпач Аляксандр Крамароў і сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё.

28 ліпеня, 22.45.

ПРАБЛЕМЫ, ПОШУК, ЭКСПЕРЫМЕНТ. НАРОДНЫЯ ТЭАТРЫ: ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ, СТАНАЎЛЕННЯ.

У гутарцы прымаюць удзел кандыдат мастацтвазнаўства крытык Арсен Лабовіч, галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Упраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР паэтэса Ніна Загорская, мастацкі кіраўнік Слонімскага народнага тэатра М. Варвашэвіч, мастацкі кіраўнік тэатра-студыі моладзі пры Палацы культуры чыгуначнікаў г. Мінска В. Грыгалюнас, старшы метадыст Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра Т. Гаманюк.

30 ліпеня, 18.30

ЗАПРАШАЕ ЧАСОПІС «ПОЛЫМЯ».

Перадача пазнаёміць з ліпеньскім нумарам часопіса.

31 ліпеня. 19.50

«РАДЗІМІЧЫ». ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС.

У гэтым выпуску часопіса: свае вершы і пераклады чытае інжынер Антон Гук; расказ пра народнага ўмельца Уладзіміра Дзянісавіча Кавалёва з Рэчыцкага раёна.

1 жніўня, 12.40

СЛОВА — ПАЭЗІІ. ВЕРШЫ АБ КАХАННІ.

Прагучаць вершы аб каханні П. Броўкі, А. Вярцінскага, А. Пысіна.

1 жніўня, 18.40

НАШЫ ГОСЦІ. ЯКУЦКІ РУСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР.

Адбудзецца сустрэча з калектывам тэатра, які гастраліруе ў Беларусі.

1 жніўня. 19.55

ТЭЛЕВІЗІЙНЫ ВЕРНІСАЖ.

Іграе цымбалістка Ангеліна Ткачова.

Прагучаць творы старадаўняй, класічнай музыкі і беларускіх кампазітараў — Я. Глебава, В. Войціка, В. Капыцько, У. Кур'яна.

1 жніўня. 22.50

СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ.

Чарговая перадача праграмы — «Прыкметы сезона». «Лета» — падрыхтавана сумесна з Беларускім агенцтвам па гандлёвай рэкламе. У ёй прымаюць удзел ансамблі «Пламя», «Верасы», салісты С. Герасімаў, У. Кудрын.

2 жніўня, 11.55

П. І. ЧАЙКОЎСКІ. КАНЦЭРТ № 2 ДЛЯ ФАРТЭПІЯНА З АРКЕСТРАМ.

Выканаўцы: Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр БССР. Дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі Ю. Яфімаў. Саліст — лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, лаўрэат міжнародных конкурсаў заслужаны артыст РСФСР М. Плятнёў. Вядучая — музыказнаўца Л. Барадзіна.

2 жніўня. 19.50

У НЯДЗЕЛЮ ВЕЧАРАМ. «ВЯНОК ДРУЖБЫ».

Музычная праграма з удзелам папулярных артыстаў украінскай эстрады.

2 жніўня. 21.40

І. КАЛЬМАН. «ГАЛАНДАЧКА». СПЕКТАКЛЬ НОВАСІБІРСКАГА ТЭАТРА МУЗЫЧНАЙ КАМЕДЫІ.

Тэатр гастраліруе ў Мінску, і беларускія гледачы могуць упершыню пазнаёміцца з гэтай не вельмі вядомай аперэтай І. Кальмана. Спектакль паставіла галоўны рэжысёр тэатра Э. Ціткова. Музычны кіраўнік пастаноўкі Я. Алексанян.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 02241 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела культуры і выяўленчага мастацтва — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела пісьмаў — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы (праз два інтэрвалы). Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Рычард СМОЛЬСКІ, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.